БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ

ЖУРНАЛ
БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА

# ИСТОРИЯ

ЧАСОПІС
БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

# ГІСТОРЫЯ

JOURNAL
OF THE BELARUSIAN STATE UNIVERSITY

# HISTORY

Издается с января 1969 г.
(до 2017 г. – под названием «Веснік БДУ.
Серыя 3, Гісторыя. Эканоміка. Права»)

Выходит один раз в квартал

**2** **2020**

МИНСК
БГУ

## РЕДАКЦИОННАЯ КОЛЛЕГИЯ

**Главный редактор** **КОХАНОВСКИЙ А. Г.** – доктор исторических наук, профессор; декан исторического факультета Белорусского государственного университета, Минск, Беларусь.
E-mail: kohanovsky@bsu.by

**Заместитель главного редактора** **МЕНЬКОВСКИЙ В. И.** – доктор исторических наук, профессор; профессор кафедры истории России исторического факультета Белорусского государственного университета, Минск, Беларусь.
E-mail: menkovski@bsu.by

**Ответственный секретарь** **МАЛЮГИН О. И.** – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры истории древнего мира и средних веков исторического факультета Белорусского государственного университета, Минск, Беларусь.
E-mail: maliugin@bsu.by

***Белецкий С. В.*** Институт истории материальной культуры Российской академии наук, Санкт-Петербург, Россия.
***Бон Т.*** Гисенский университет им. Юстуса Либиха, Гисен, Германия.
***Бородкин Л. И.*** Московский государственный университет им. М. В. Ломоносова, Москва, Россия.
***Волански Ф.*** Институт истории Вроцлавского университета, Вроцлав, Польша.
***Жеребцов И. Л.*** Институт языка, литературы и истории Коми научного центра Уральского отделения Российской академии наук, Сыктывкар, Республика Коми.
***Линднер Р.*** Констанцкий университет, Констанц, Германия.
***Упадуэй А.*** Центр российских и центральноазиатских исследований Университета им. Джавахарлала Неру, Дели, Индия.
***Фишер Д.*** Техасский университет в Браунсвилле, США.
***Фэн Ш.*** Институт международных отношений и регионального развития, Центр изучения России Восточно-Китайского педагогического университета, Шанхай, Китай.
***Шмигель М.*** Университет Матея Бела, Банска-Бистрица, Словакия.
***Яновский О. А.*** Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь.

## МЕЖДУНАРОДНЫЙ РЕДАКЦИОННЫЙ СОВЕТ

***Бригадин П. И.*** Институт бизнеса Белорусского государственного университета, Минск, Беларусь.
***Вабищевич А. Н.*** Брестский государственный университет им. А. С. Пушкина, Брест, Беларусь.
***Виддер Э.*** Институт средневековой истории Тюбингенского университета им. Эберхарда Карла, Тюбинген, Германия.
***Дук Д. В.*** Могилёвский государственный университет им. А. А. Кулешова, Могилёв, Беларусь.
***Карпов С. П.*** Московский государственный университет им. М. В. Ломоносова, Москва, Россия.
***Карпюк С. Г.*** Институт всеобщей истории Российской академии наук, Москва, Россия.
***Коваленя А. А.*** Национальная академия наук Беларуси, Минск, Беларусь.
***Колесник В. Ф.*** Киевский национальный университет им. Тараса Шевченко, Киев, Украина.
***Космач В. А.*** Витебский государственный университет им. П. М. Машерова, Витебск, Беларусь.
***Кошелев В. С.*** Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь.
***Лавринович Д. С.*** Могилёвский государственный университет им. А. А. Кулешова, Могилёв, Беларусь.
***Ларин М. В.*** Историко-архивный институт Российского государственного гуманитарного университета, Москва, Россия.
***Локотко А. И.*** Национальная академия наук Беларуси, Минск, Беларусь.
***Марзалюк И. А.*** Палата представителей Национального собрания Республики Беларусь, Минск, Беларусь.
***Мезга Н. Н.*** Гомельский государственный университет им. Франциска Скорины, Гомель, Беларусь.
***Микнис Р.*** Институт истории Литвы, Вильнюс, Литва.
***Нечухрин А. Н.*** Гродненский государственный университет им. Янки Купалы, Гродно, Беларусь.
***Пилипенко М. Ф.*** Институт искусствоведения, этнографии и фольклора им. Кондрата Крапивы Центра исследований белорусской культуры, языка и литературы Национальной академии наук Беларуси, Минск, Беларусь.
***Туманс Х.*** Латвийский университет, Рига, Латвия.
***Ходин С. Н.*** Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь.
***Федосик В. А.*** Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь.
***Шадурский В. Г.*** Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь.

# РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

**Галоўны рэдактар** — **КАХАНОЎСКІ А. Г.** – доктар гістарычных навук, прафесар; дэкан гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Мінск, Беларусь.
E-mail: kohanovsky@bsu.by

**Намеснік галоўнага рэдактара** — **МЕНЬКОЎСКІ В. І.** – доктар гістарычных навук, прафесар; прафесар кафедры гісторыі Расіі гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Мінск, Беларусь.
E-mail: menkovski@bsu.by

**Адказны сакратар** — **МАЛЮГІН А. І.** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; дацэнт кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Мінск, Беларусь.
E-mail: maliugin@bsu.by

***Бародкін Л. І.*** Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М. В. Ламаносава, Масква, Расія.
***Бон Т.*** Гісенскі ўніверсітэт імя Юстуса Лібіха, Гісен, Германія.
***Бялецкі С. В.*** Інстытут гісторыі матэрыяльнай культуры Расійскай акадэміі навук, Санкт-Пецярбург, Расія.
***Валанскі Ф.*** Інстытут гісторыі Вроцлаўскага ўніверсітэта, Вроцлаў, Польшча.
***Жарабцоў І. Л.*** Інстытут мовы, літаратуры і гісторыі Комі навуковага цэнтра Уральскага аддзялення Расійскай акадэміі навук, Сыктыўкар, Рэспубліка Комі.
***Ліндмер Р.*** Канстанцкі ўніверсітэт, Канстанц, Германія.
***Упадуэй А.*** Цэнтр расійскіх і цэнтральнаазіяцкіх даследаванняў Універсітэта імя Джавахарлала Неру, Дэлі, Індыя.
***Фішэр Д.*** Тэхаскі ўніверсітэт у Браўнсвіле, ЗША.
***Фэн Ш.*** Інстытут міжнародных адносін і рэгіянальнага развіцця, Цэнтр вывучэння Расіі Усходне-Кітайскага педагагічнага ўніверсітэта, Шанхай, Кітай.
***Шмігель М.*** Універсітэт Мацея Бела, Банска-Бістрыца, Славакія.
***Яноўскі А. А.*** Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь.

# МІЖНАРОДНЫ РЭДАКЦЫЙНЫ САВЕТ

***Брыгадзін П. І.*** Інстытут бізнесу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Мінск, Беларусь.
***Вабішчэвіч А. М.*** Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна, Брэст, Беларусь.
***Відэр Э.*** Інстытут сярэднявечнай гісторыі Цюбінгенскага ўніверсітэта імя Эберхарда Карла, Цюбінген, Германія.
***Дук Д. У.*** Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова, Магілёў, Беларусь.
***Каваленя А. А.*** Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Мінск, Беларусь.
***Калеснік В. Ф.*** Кіеўскі нацыянальны ўніверсітэт імя Тараса Шаўчэнкі, Кіеў, Украіна.
***Карпаў С. П.*** Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М. В. Ламаносава, Масква, Расія.
***Карпюк С. Г.*** Інстытут усеагульнай гісторыі Расійскай акадэміі навук, Масква, Расія.
***Космач В. А.*** Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава, Віцебск, Беларусь.
***Кошалеў У. С.*** Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь.
***Лакотка А. І.*** Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Мінск, Беларусь.
***Ларын М. В.*** Гісторыка-архіўны інстытут Расійскага дзяржаўнага гуманітарнага ўніверсітэта, Масква, Расія.
***Лаўрыновіч Д. С.*** Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова, Магілёў, Беларусь.
***Марзалюк І. А.*** Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Мінск, Беларусь.
***Мікніс Р.*** Інстытут гісторыі Літвы, Вільнюс, Літва.
***Мязга М. М.*** Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны, Гомель, Беларусь.
***Нячухрын А. М.*** Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Гродна, Беларусь.
***Піліпенка М. Ф.*** Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь.
***Туманс Х.*** Латвійскі ўніверсітэт, Рыга, Латвія.
***Ходзін С. М.*** Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь.
***Фядосік В. А.*** Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь.
***Шадурскі В. Г.*** Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь.

## EDITORIAL BOARD

| | |
|---|---|
| **Editor-in-chief** | **KAKHANOUSKI A. G.**, doctor of science (history), full professor; dean of the faculty of history, Belarusian State University, Minsk, Belarus.<br>E-mail: kohanovsky@bsu.by |
| **Deputy editor-in-chief** | **MENKOUSKI V. I.**, doctor of science (history), full professor; professor at the department of Russian history, faculty of history, Belarusian State University, Minsk, Belarus.<br>E-mail: menkovski@bsu.by |
| **Executive secretary** | **MALIUGIN O. I.**, PhD (history), docent; associate professor at the department of ancient and medieval history, faculty of history, Belarusian State University, Minsk, Belarus.<br>E-mail: maliugin@bsu.by |

***Beletsky S. V.*** Institute of History of Material Culture of the Russian Academy of Sciences, Saint Petersburg, Russia.
***Bohn T.*** Justus Liebig University of Giessen, Giessen, Germany.
***Borodkin L. I.*** Lomonosov Moscow State University, Moscow, Russia.
***Feng Sh.*** School of Advanced International and Area Studies, Centre for Russian Studies of the East China Normal University, Shanghai, China.
***Fisher D. C.*** University of Texas Rio Grande Valley, Brownsville, USA.
***Lindner R.*** University of Konstanz, Konstanz, Germany.
***Šmigeľ M.*** Matej Bel University, Banská Bystrica, Slovakia.
***Upadhyay A.*** Centre for Russian and Central Asian Studies, Jawaharlal Nehru University, New Delhi, India.
***Wolański F.*** Institute of History, University of Wroclaw, Wroclaw, Poland.
***Yanouski A.*** Belarusian State University, Minsk, Belarus.
***Zherebtsov I. L.*** Institute of Language, Literature and History, Komi Science Centre, Ural Branch of the Russian Academy of Sciences, Syktyvkar, Komi Republic.

## INTERNATIONAL EDITORIAL COUNCIL

***Bryhadzin P. I.*** Institute of Business, Belarusian State University, Minsk, Belarus.
***Duk D. V.*** Mogilev State A. Kuleshov University, Mogilev, Belarus.
***Fedosik V. A.*** Belarusian State University, Minsk, Belarus.
***Karpov S. P.*** Lomonosov Moscow State University, Moscow, Russia.
***Karpyuk S. G.*** Institute of World History, Russian Academy of Sciences, Moscow, Russia.
***Khodzin S. N.*** Belarusian State University, Minsk, Belarus.
***Kolesnyk V. F.*** Taras Shevchenko National University of Kyiv, Kyiv, Ukraine.
***Koshelev V. S.*** Belarusian State University, Minsk, Belarus.
***Kosmach V. A.*** Vitebsk State University named after P. M. Masherov, Vitebsk, Belarus.
***Kovalenya A. A.*** National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus.
***Larin M. V.*** Institute for History and Archives, Russian State University for Humanities, Moscow, Russia.
***Lavrinovich D. S.*** Mogilev State A. Kuleshov University, Mogilev, Belarus.
***Lokotko A. I.*** National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus.
***Marzaluk I. A.*** House of Representatives of the National Assembly of the Republic of Belarus, Minsk, Belarus.
***Miazga M. M.*** Francisk Skorina Gomel State University, Gomel, Belarus.
***Miknys R.*** Institute of Lithuanian History, Vilnius, Lithuania.
***Nechukhrin A. N.*** Yanka Kupala State University of Grodno, Grodno, Belarus.
***Pilipenko M. F.*** Kandrat Krapiva Institute of Arts Studies, Ethnography and Folklore of the Center for the Belarusian Culture, Language and Literature Research of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus.
***Shadurski V. G.*** Belarusian State University, Minsk, Belarus.
***Tumans H.*** University of Latvia, Riga, Latvia.
***Vabishchevich A. N.*** Brest State University named after A. S. Pushkin, Brest, Belarus.
***Widder E.*** Medieval History Institute, Eberhard Karls University of Tübingen, Tübingen, Germany.

*УДК 94(47)034*

# К ВОПРОСУ О ЛИЧНОСТИ ЖИРОСЛАВА НАЖИРОВИЧА, ВОЗГЛАВЛЯВШЕГО ПОХОД КИЕВСКИХ ВОЙСК НА МЕНСК В 1159 г.

***В. Н. НАГИРНЫЙ***[1)]

[1)]*Институт истории Ягеллонского университета,*
*ул. Голембя, 13, 31-007, г. Краков, Польша*

Рассматривается биография киевского воеводы Жирослава Нажировича. Боярин упомянут в Киевской летописи всего один раз: в 1159 г. он возглавил отряд торков, посланный киевским князем Ростиславом Мстиславичем под Менск в помощь полоцкому князю Рогволоду Борисовичу. Автор допускает, что Жирослав родился в первой трети XII в. и мог быть сыном как Нажира из окружения Владимира Всеволодовича Мономаха, так и Нажира Переяславича, служившего киевскому князю Изяславу Давидовичу. На основании лаконичных сведений из летописей высказано предположение, что Жирослав обладал значительным опытом в военных делах, хотя и уступал в статусе другим киевским воеводам. Дальнейшая судьба Жирослава Нажировича после возвращения из менского похода 1159 г. в источниках не прослеживается. Его возможными потомками можно считать трепольского урядника Сдеслава Жирославича и киевского воеводу Даниила Жировича (Нажировича).

***Ключевые слова:*** просопография; Жирослав Нажирович; Киев; Менск; воевода; торки.

***Благодарность.*** За научные консультации при подготовке статьи благодарю кандидата исторических наук С. Н. Темушева (БГУ) и кандидата исторических наук А. В. Мартынюка (РИВШ, БГУ).

**Образец цитирования:**
Нагірны ВМ. Да пытання аб асобе Жыраслава Нажыравіча, які ўзначальваў паход кіеўскіх войскаў на Менск у 1159 г. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя*. 2020;2:5–10.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2020-2-5-10

**For citation:**
Nagirnyy VM. To the question of the personality of Zhiroslav Nazhirovich who led the Kyiv troops to Mensk in 1159. *Journal of the Belarusian State University. History.* 2020;2: 5–10. Belarusian.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2020-2-5-10

**Автор:**
***Виталий Николаевич Нагирный*** – кандидат исторических наук; доцент кафедры истории Восточной Европы.

**Author:**
***Vitaliy M. Nagirnyy***, PhD (history); associate professor at the department of Eastern European history.

CC BY NC

**Журнал Белорусского государственного университета. История. 2020;2:5–10**
**Journal of the Belarusian State University. History. 2020;2:5–10**

# ДА ПЫТАННЯ АБ АСОБЕ ЖЫРАСЛАВА НАЖЫРАВІЧА, ЯКІ ЎЗНАЧАЛЬВАЎ ПАХОД КІЕЎСКІХ ВОЙСКАЎ НА МЕНСК У 1159 г.

***В. М. НАГІРНЫ***[1*]

[1*]*Інстытут гісторыі Ягелонскага ўніверсітэта,*
*вул. Голембя, 13, 31-007, г. Кракаў, Польшча*

Разглядаецца біяграфія кіеўскага ваяводы Жыраслава Нажыравіча. Баярын згаданы ў Кіеўскім летапісе ўсяго адзін раз: у 1159 г. ён узначаліў атрад торкаў, пасланы кіеўскім князем Расціславам Мсціславічам пад Менск у дапамогу полацкаму князю Рагвалоду Барысавічу. Аўтар дапускае, што Жыраслаў нарадзіўся ў першай трэці XII ст. і мог быць сынам як Нажыра з акружэння Уладзіміра Усеваладавіча Манамаха, так і Нажыра Пераяславіча, які служыў кіеўскаму князю Ізяславу Давыдавічу. На падставе лаканічных звестак з летапісаў выказваецца здагадка, што Жыраслаў валодаў значным досведам у ваенных справах, хоць і саступаў у статусе іншым кіеўскім ваяводам. Далейшы лёс Жыраслава Нажыравіча пасля яго вяртання з менскага паходу 1159 г. у крыніцах не прасочваецца. Яго магчымымі нашчадкамі можна лічыць трыпольскага ўрадніка Здзеслава Жыраславіча і кіеўскага ваяводу Данііла Жыровіча (Нажыравіча).

***Ключавыя словы:*** прасапаграфія; Жыраслаў Нажыравіч; Кіеў; Менск; ваявода; торкі.

***Падзяка.*** За навуковыя кансультацыі пры падрыхтоўцы артыкула дзякую кандыдату гістарычных навук С. М. Цемушаву (БДУ) і кандыдату гістарычных навук А. В. Мартынюку (Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, БДУ).

# TO THE QUESTION OF THE PERSONALITY OF ZHIROSLAV NAZHIROVICH WHO LED THE KYIV TROOPS TO MENSK IN 1159

***V. M. NAGIRNYY***[a]

[a]*Institute of History, Jagiellonian University, 13 Gołębia Street, Krakow 31-007, Poland*

The article deals with the biography of the Kyiv voivode Zhiroslav Nazhirovich. The boyar is mentioned in the Kyiv Chronicle only once, in 1159, when he leaded the military unit of Torks that had been by the Kyiv prince Rostislav Mstislavich to Mensk to help the Polotsk prince Rogvolod Borisovich. The author admits that Zhiroslav was born in the first third of the 12$^{th}$ century and could be the son of both Nazhir from the entourage of Vladimir Vsevolodovich Monomakh and Nazhir Pereyaslavich who served the Prince of Kyiv Izyaslav Davidovich. Based on the laconic data of the chronicles one can assume that Zhiroslav, although he yielded in status to other Kyiv voivodes, he had the considerable experience in military affairs. The further fate of Nazhirovich, after his returning from the Mensk campaign in 1159, is not analyzed in the sources. His possible descendants can be the Trepolsky sergeant Sdeslav Zhiroslavich and the Kyiv voivode Daniil Zhirovich (Nazhirovich).

***Keywords:*** prosopography; Zhiroslav Nazhirovich; Kyiv; Mensk; voivode; sergeant.

***Acknowledgements.*** Gratitude for the scientific advice during the preparation of the article to PhD (history) S. N. Tsemushau (Belarusian State University) and PhD (history) A. V. Martyniouk (National Institute for Higher Education, Belarusian State University).

## Уводзіны

У 1158 г., пасля перамір’я, якое завяршыла міжусобную вайну на Русі 1148–1154 гг., канфлікт паміж Рурыкавічамі разгарэўся з новай сілай. Адным з яго эпізодаў стала барацьба паміж Рагвалодам Барысавічам і Расціславам Глебавічам за Полацк. У ходзе гэтай барацьбы Рагвалод у 1158 г. заняў полацкі прастол, а Расціслаў вымушаны быў вярнуцца ў свой менскі ўдзел. Новы полацкі князь вырашыў развіць поспех і ў 1159 г. распачаў паход на Менск. Дапамогу Рагвалоду аказаў Расціслаў Мсціславіч, які ўладарыў у Кіеве. Ён адправіў «помочь . Рогъволоду съ Жирославомъ . съ Нажировиче$^{\text{м}}$»[1]. У гэтым артыкуле я не буду аналізаваць прычыны, ход і наступствы мінскай кампаніі Рагвалода, якая ўжо мае сваю гістарыяграфію [1–4], а засяроджуся на асобе Жыраслава, які стаяў на чале кіеўскіх войскаў, што прыбылі пад Менск. Мэта дадзенага даследавання – сабраць і прааналізаваць звесткі пра асобу Жыраслава Нажыравіча, вызначыць магчымы час яго нараджэння і смерці, паходжанне, прасачыць развіццё кар’еры і мяркуемыя роднасныя сувязі.

[1]Полное собрание русских летописей, изданное по высочайшему повелению Императорскою археографическою комиссиею (далее – ПСРЛ). Т. 2. Ипатьевская летопись. 2-е изд. СПб. : Тип. М. А. Александрова, 1908. Стб. 505.

## Асноўная частка

Ваявода Расціслаў Мсціславіч згадваецца ў Кіеўскім летапісе як Жыраслаў Нажыравіч, гэта значыць з імем і імем па бацьку.

Атрыманае ім пры нараджэнні імя – Жыраслаў – з'яўляецца асабовым мужчынскім імем славянскага паходжання, якое складаецца са слова *жир* 'жыццё', 'ежа', 'дастатак' і кораня *слав-* 'слава' [5, s. 11, 31; 6, с. 188]. Імя гэта было вядомае на Русі ўжо ў 1030-я гг.[2], а да першай паловы XII ст. атрымала шырокае распаўсюджанне ў асяроддзі як рускай[3], так і польскай эліты [8, s. 95; 9, s. 79–80].

Рускі кніжнік назваў Жыраслава *Нажировичеⷨ*. Указанне імя па бацьку кіеўскага ваяводы адкрывае добрую перспектыву для пошуку яго бацькі. Імя Нажыр сустракаецца ў крыніцах усяго двойчы[4], і абодва разы ў помніках XII ст. – ва Уставе Уладзіміра Усеваладавіча Манамаха і ў Кіеўскім летапісе.

Ва Уставе Уладзіміра Усеваладавіча Манамаха, створаным каля 1113 г., Нажыр згадваецца сярод вышэйшых ураднікаў кіеўскага князя Уладзіміра Усеваладавіча, якія прымалі ўдзел у стварэнні гэтага заканадаўчага акта[5]. Згадка пра яго адразу ж пасля тысяцкага Рацібора, Пракопа і Станіслава дазваляе меркаваць, што ён таксама займаў высокую пасаду, магчыма, быў кіеўскім ваяводам. Без сумнення, Нажыр знаходзіўся ўжо ў сталым узросце. Калі выказаць здагадку, што менавіта гэты Нажыр – бацька Жыраслава, то апошні павінен быў нарадзіцца прыкладна ў першых двух дзесяцігоддзях XII ст., а магчыма і раней. У такім выпадку ў 1159 г. Жыраславу было б не менш за 40 гадоў – узрост цалкам прыдатны для выканання функцый ваяводы.

Другі раз Нажыр з'яўляецца на старонках Кіеўскага летапісу пад 6670 (1162) годам. У ліку знатных кіяўлян, схопленых торкамі пасля паражэння Ізяслава Давыдавіча, нанесенага войскамі Мсціслава Ізяславіча і Расціслава Мсціславіча, летапісец назваў і *Нажира Переꙗславича*[6]. У рэальнасці гэта падзея мела месца ў першыя дні сакавіка 1161 г. [10, с. 173]. Нажыра Пераяславіча ў навуковай літаратуры часам называюць звычайным ваяром [12, с. 265; 13, с. 316], але яго згадка нароўні з такімі вядомымі кіеўскімі ўраднікамі, як Шварн, Сцяпан і Якун Міляцічы, дазваляе лічыць, што Нажыр Пераяславіч таксама займаў высокае становішча сярод кіеўскай эліты. Магчыма, што ён знаходзіўся ўжо ў тым узросце, які дазваляў мець дарослага сына. Такім сынам якраз і мог быць Жыраслаў Нажыравіч. Калі гэта здагадка слушная, то род, з якога паходзіў Жыраслаў, можна выводзіць з Пераяслаўскай зямлі, на што выразна паказвае тапанімічны антрапонім, ужыты побач з імем Нажыра. Невядома дакладна, калі прадстаўнікі гэтага роду апынуліся на службе ў кіеўскіх князёў, але да часу вывучаемых падзей род Нажыра быў ужо цесна звязаны з Кіеўскай зямлёй.

На жаль, сведчанні крыніц, якія захаваліся, не дазваляюць дакладна вызначыць, хто з названых асоб з'яўляўся бацькам Жыраслава. Як першы, так і другі Нажыр па ўзроставых крытэрыях падыходзілі для гэтай ролі. Вядома, можна паспрабаваць атаясаміць Нажыра з акружэння Уладзіміра Манамаха з Нажырам Пераяславічам. Але такая інтэрпрэтацыя выглядае малаверагоднай з-за досыць вялікага храналагічнага разрыву (каля 48 гадоў) паміж звесткамі пра адпаведных асоб. У сувязі з гэтым пытанне аб бацькоўстве Жыраслава неабходна пакінуць адкрытым.

Завяршаючы разгляд пытання аб паходжанні Жыраслава Нажыравіча, варта падкрэсліць сувязь паміж імёнамі бацькі і сына: у абодвух выпадках у аснове імя ляжыць корань *жир-*. Магчыма, такі выбар імёнаў тлумачыцца пэўнай традыцыяй гэтага роду.

У распараджэнні даследчыкаў ёсць усяго адна пэўная згадка пра Жыраслава Нажыравіча. Гаворка ідзе пра паход на Менск 1159 г. Да гэтага часу лёс, як і пачатак кар'еры Жыраслава Нажыравіча, прасачыць няпроста. На працягу дзесяцігоддзя, якое папярэднічала менскаму паходу, у крыніцах можна знайсці тры згадкі пра баяр з такім імем (але без указання імя па бацьку), якіх можна было б атаясамліваць з Жыраславам Нажыравічам: у летапісных паведамленнях за 6655/56 (1147/48 або 1148/49), 6657 (1149/50) і 6663 (1155/56) гады.

Няма неабходнасці дэталёва разглядаць тут усе тры згадкі, паколькі іх аналіз праведзены ў іншай працы [7]. Уважлівае вывучэнне кантэксту паведамленняў за 6657 і 6663 гг. дазволіла зрабіць, як здаецца,

---

[2]Пад 1078 г. у Аповесці мінулых гадоў згаданы ваявода Усевалада Яраславіча Іван Жыраславіч (гл.: ПСРЛ. Т. 2. Ипатьевская летопись. СПб., 1908. Стб. 191 ; ПСРЛ. Т. 1. Лаврентьевская летопись. Вып. 1. Повесть временных лет. 2-е изд. Л., 1926. Стб. 200). Відавочна, што ён нарадзіўся не пазней, чым у пачатку 1050-х гг. Адпаведна, яго бацька Жыраслаў з'явіўся на свет не пазней за 1030-я гг. (гл. [7]).

[3]ПСРЛ. Т. 2. Ипатьевская летопись. СПб., 1908. Стб. 359, 389, 479, 505 ; ПСРЛ. Т. 1. Лаврентьевская летопись. Вып. 2. Суздальская летопись по Лаврентьевскому списку. 2-е изд. Л., 1927. Стб. 323, 345, 391 ; Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов. М. ; Л. : Изд-во Акад. наук СССР, 1950. С. 34–35, 222–224, 472.

[4]Яшчэ адна ўскосная згадка змешчана ў Галіцка-Валынскім летапісе (Хроніка Раманавічаў), дзе пад 6743 (1235) годам летапісец называе *Данила Жировича* (*Нажировича*), ваяводу кіеўскага князя Уладзіміра Рурыкавіча (ПСРЛ. Т. 2. Ипатьевская летопись. СПб., 1908. Стб. 775 ; Kronika halicko-wołyńska (Kronika Romanowiczów) / wyd.: D. Dąbrowski, A. Jusupović. Kraków ; Warszawa : Inst. Hist. PAN : Pol. Akad. Umiejętności, 2017. S. 688, uwaga 536).

[5]Памятники русского права. Вып. 1. Памятники права Киевского государства X–XIII вв. / сост. А. А. Зимин. М. : Гос. изд-во юрид. лит., 1952. С. 113 ; Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов. М. ; Л., 1950. С. 493.

[6]ПСРЛ. Т. 2. Ипатьевская летопись. СПб., 1908. Стб. 518. (П. П. Талочка лічыць, што Нажыр Пераяславіч у гэты час служыў князю Расціславу Мсціславічу [11, с. 129]. Ніякіх падстаў для такога вываду няма: летапіс выразна ўказвае, што ён знаходзіўся ў абозе Ізяслава Давыдавіча. Відавочна, што пасля страты Кіева Расціславам у лютым 1160 г. Нажыр не паследаваў за ім у Белгарад, а перайшоў на службу да Ізяслава. Лёс Нажыра пасля яго палону ў пачатку сакавіка 1160 г. прасачыць, на жаль, немагчыма.)

досыць абгрунтаваную выснову, што ў іх згадваецца былы тураўскі пасаднік Жыраслаў Іванкавіч. Больш складана высветліць, пра якога з Жыраславаў гаварылася ў першым летапісным паведамленні.

Пад 6655 г. у Кіеўскім летапісе апісваецца паход Глеба Юр’евіча, сына суздальскага князя Юрыя Даўгарукага, у Чарнігаўскую зямлю на дапамогу Вольгавічам, а затым да Пераяслаўля супраць Мсціслава Ізяславіча: «В томъ же лѣтѣ ѣха Гюргевичь Глѣбъ . и зая Городокъ ѡтень . оу Изѧслава и слышавъ Изѧславъ посла к немоу зова Киевоу . к собѣ ѡбѣщавъ же сѧ ити к немоу и не иде послоушавъ же Жирослава рекоуща емоу . поиди Переꙗславлю хотѧть тебе Переꙗславци . послоущавъ же его . иде в борзѣ»[7]. Аналагічнае паведамленне змешчана і ў Лаўрэнцьеўскім летапісе, але там яно датавана 6656 г.: «Приде Глѣбъ Гюргевичь . и-Суждалѧ Чернигову . в помочь Ѡлговичемъ . и пребывъ оу ниⷯ нѣколико . приде на Городокъ . и слышавъ Изѧславъ . посла и к нему зова к собѣ Кыєву . ѡн же ѡбѣщавъсѧ ити и не иде . и перестрѧпъ мало послушавъ Жирослава рекуща ює му . поиди Переꙗславлю хотѧть тебе людьє . ѡн же послушавъ ює го приде к Переꙗславлю вборзѣ свитающю дн҃и…»[8] Тэкст Лаўрэнцьеўскага летапісу амаль даслоўна пацвярджаецца Радзівілаўскім летапісам з той толькі розніцай, што замест «послушавъ Жирослава» ў ім напісана «послушавъ Рослава»[9].

У працытаваным летапісным фрагменце найбольшую цікавасць выклікае добрая дасведчанасць Жыраслава пра сітуацыю ў Пераяслаўлі. Улічваючы магчымае паходжанне яго роду з Пераяслаўскай зямлі, такая інфармаванасць выглядае цалкам вытлумачальнай. Зыходзячы з гэтага, можна выказаць асцярожную здагадку аб тым, што дарадцам Глеба Юр’евіча, які вёў таемныя перамовы з пераяслаўцамі, быў Жыраслаў Нажыравіч. Але з прычыны адсутнасці пераканаўчых аргументаў на карысць такой ідэнтыфікацыі гэта дапушчэнне застаецца толькі рабочай гіпотэзай.

У Кіеўскім летапісе ў запісе пад 6668 (1159/60) годам адзначалася: «Том же лѣⷮ ходи Рогъволодъ с Полтчаны . на Рославнаго Глѣбовича къ Мѣньску . послалъ же бѧше Ростиславъ . ис Киева . помочь . Рогъволоду съ Жирославомъ . съ Нажировичеⷨ Торкъ . х҃ . а ты померше голодомъ . и придоша пѣши . не дождавше мира . Рогъволодъ же стоꙗ ѡколо города . ѕ҃ неⷣль . и створи миръ с Ростиславомъ . по своеи воли . и въıстоꙗ Володшю ис поруба . а Брѧчислава . изъ железъ . и цѣловаста хрⷭ҇тъ к собѣ»[10]. У іншых ранніх летапісах цалкам адсутнічае інфармацыя і пра паход полацкага князя на Менск, і пра Жыраслава, які ўзначальваў кіеўскую дапамогу[11]. Звесткі з Кіеўскага летапісу з невялікімі зменамі і скарачэннямі былі паўтораны толькі ў больш познім Маскоўскім летапісным зводзе канца XV ст.: «Тогда же Рогволод с Полочаны ходи на Ростислава на Глѣбовича к Мѣньску бѣ же с ним Ростиславля помочь ис Кыева, посла бо к нему Ростиславъ Жирослава Нажировича, а с ним 600 Торков и стоя Рогволод около города 6 недѣль и створи миръ с Ростиславом по своеи воли, въıстоя Володшу ис поруба, а Брячислава из желѣзъ, и цѣловаста крестъ к собѣ»[12]. У сваю чаргу, пазнейшы Густынскі летапіс абмяжоўваецца згадкай пра паход войскаў Расціслава Мсціславіча на Менск, але паводле гэтай крыніцы на чале кіеўскіх атрадаў стаялі сыны князя, Раман і Рурык, і нічога не сказана пра ўдзел у гэтай ваеннай акцыі торкаў[13].

Інфармацыя пра ролю Жыраслава Нажыравіча ў падзеях 1159 г. вельмі лаканічная, але звяртаюць на сябе ўвагу некалькі важных момантаў. Кіеўскі князь адправіў пад Менск значныя сілы: 600 конных торкаў. Аднак гэта была не кіеўская дружына, а васальная памежная конніца. Такое рашэнне кіеўскага князя магло быць прадыктавана як неабходнасцю абароны Кіева з прычыны небяспекі нападу Ізяслава Давыдавіча, так і тым, што галоўныя сілы былі адпраўлены на лоддзях у нізоўі Дняпра да Алешша, якое незадоўга да гэтага падверглася нападу бярладнікаў. Алешша было не толькі рускім фарпостам у вусці Дняпра, але і служыла важным перавалачным пунктам руска-візантыйскага гандлю і забяспечвала Кіеў вялікімі партыямі рыбы [14, с. 60, 129]. Для кіеўскага князя, несумненна, вяртанне кантролю над Алешшам мела першараднае значэнне. Пра гэта сведчыць як хуткая рэакцыя Расціслава Мсціславіча, так і адпраўленне супраць бярладнікаў кіеўскай дружыны на чале з найбольш дасведчанымі ваяводамі Гюргем (Юрыем) Несцяровічам і Якунам: «Том же лѣⷮ посла Ростиславъ ис Киева . Гюргѧ Нестеровича . и Ꙗкуна . в насадехъ . на Берладники . ѡже бѧхуть Ѡлешье взѧли . и постигше ѣ оу Дцинѧ избиша ѣ . и полонъ взѧща»[14]. Цалкам верагодна, што менавіта адпраўкай на поўдзень асноўных сіл і адсутнасцю ў Кіеве галоўных ваяводаў было абумоўлена рашэнне пасляць пад Менск торкаў на чале з Жыраславам Нажыравічам. У сувязі з гэтым можна выказаць асцярожную здагадку аб тым, што Жыраслаў саступаў у статусе сваім больш знакамітым таварышам па зброі. З іншага боку, у распараджэнні Жыраслава знаходзіўся даво-

[7]ПСРЛ. Т. 2. Ипатьевская летопись. СПб., 1908. Стб. 359–360.
[8]ПСРЛ. Т. 1. Лаврентьевская летопись. Вып. 2. Суздальская летопись по Лаврентьевскому списку. Л., 1927. Стб. 391.
[9]ПСРЛ. Т. 38. Радзивиловская летопись. Л., 1989. С. 115, примеч. 3 к 6656 г. (У Акадэмічным спісе Радзівілаўскага летапісу ўказана Ярослава, пры гэтым літара *Я* прыпісана над радком іншымі чарніламі, што ўказвае на яе больш позняе з’яўленне.)
[10]ПСРЛ. Т. 2. Ипатьевская летопись. СПб., 1908. Стб. 505.
[11]ПСРЛ. Т. 1. Лаврентьевская летопись. Вып. 2. Суздальская летопись по Лаврентьевскому списку. Л., 1927. Стб. 351 ; ПСРЛ. Т. 38. Радзивиловская летопись. Л., 1989. С. 130 ; Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов. М. ; Л., 1950. С. 218.
[12]ПСРЛ. Т. 25. Московский летописный свод конца XV в. М. ; Л., 1949. С. 67.
[13]Latopis hustyński / oprac., przekł. i koment. H. Suszko. Wrocław : Wydaw. Uniw. Wrocł., 2003. S. 144.
[14]ПСРЛ. Т. 2. Ипатьевская летопись. СПб., 1908. Стб. 505.

лі вялікі атрад у 600 шабель – для XII ст. гэта былі немалыя сілы. Даручэнне Жыраславу Нажыравічу камандавання над імі сведчыць, як здаецца, пра яго значную дасведчанасць у ваенных справах.

Крыніцы не захавалі дэталей пра паход Жыраслава Нажыравіча з торкамі пад Менск. Кіеўскі летапіс інфармуе толькі, што войскі Расціслава Мсціславіча моцна пацярпелі ад голаду і, страціўшы сваіх коней, вярнуліся пешшу ў Кіеўскую зямлю яшчэ да завяршэння аблогі горада і заключэння мірнай дамовы[15]. Маскоўскі летапісны звод яшчэ больш лаканічны: з яго вядома толькі пра адпраўленне торкаў пад Менск, а звесткі пра голад сярод іх і страты коней адсутнічаюць. Не падае ніякіх дэталей і Густынскі летапіс[16]. Вызначыць ролю самога Жыраслава Нажыравіча ў гэтых падзеях на падставе толькі такіх лаканічных даных нельга.

Прасачыць лёс ваяводы пасля вяртання з менскага паходу 1159 г., на жаль, таксама немагчыма з прычыны поўнай адсутнасці інфармацыі пра яго. Уяўляецца, што Жыраслаў Нажыравіч перажыў аблогу і голад і вярнуўся разам з рэшткамі свайго атрада ў Кіеўскую зямлю. У адваротным выпадку летапісец згадаў бы пра яго смерць падчас апісанай ваеннай акцыі. Нічога невядома і пра зямельныя ўладанні баярына.

Крыніцы не захавалі прамых згадак і пра родныя сувязі Жыраслава Нажыравіча. Паспрабаваць узнавіць іх можна толькі на падставе ўскосных даных. На магчымых нашчадкаў ваяводы сярод кіеўскіх баяраў сярэдзіны і другой паловы XII ст. указвае імя па бацьку Жыраславіч. Згадак пра такіх асоб усяго тры.

Першая з іх знаходзіцца ў Кіеўскім летапісе і датуецца 6654 (1146/47) годам: пры аблозе Ноўгарада-Северскага ў ліку забітых дружыннікаў Мсціслава Ізяславіча аказаўся Дзмітрый Жыраславіч. Улічваючы, што Дзмітрый знаходзіўся на службе ў валынскіх Мсціславічаў, лагічна выказаць меркаванне, што ён быў сынам валынскага баярына Жыраслава Васільевіча, вядомага па пасольстве ў Кіеў у 1158 г.[17]

У летапісным паведамленні за 6679 (1171/72) год пры апісанні захопу Кіева войскамі Мсціслава Андрэевіча і ўцёкаў з горада Мсціслава Ізяславіча згадваецца Збыслаў Жыраславіч[18]. Але яшчэ ў XIX ст. С. М. Салаўёў адзначаў, што ён, хутчэй за ўсё, таксама быў нашчадкам згаданага вышэй Жыраслава Васільевіча [15, с. 526]. З меркаваннем расійскага гісторыка можна пагадзіцца, паколькі ў летапісе абодва адназначна звязваюцца з домам валынскіх князёў.

Інфармацыя пра яшчэ аднаго Жыраславіча знаходзіцца ў Кіеўскім летапісе ў артыкулах за 6688 (1180/81) і 6691 (1183/84) гады. У іх названы Здзеслаў Жыраславіч, які служыў у трыпольскага князя Мсціслава Уладзіміравіча[19]. Ён якраз мог быць сынам Жыраслава Нажыравіча, што справядліва заўважаў П. П. Талочка [11, с. 129]. Якім чынам і калі нашчадак Жыраслава аказаўся на службе ў трыпольскіх князёў – пытанні для асобнага даследавання.

Магчымым нашчадкам Жыраслава мог быць таксама Даніїл Жыровіч (Нажыравіч), згаданы ў летапісе як ваявода кіеўскага князя Уладзіміра Рурыкавіча пад 6743 (1235) годам[20]. Патронім Жыровіч можа быць скарочаным варыянтам імя па бацьку Жыраславіч. Акрамя таго, гэта імя магло выкарыстоўвацца ў якасці радавога, тады ёсць верагоднасць, што ў Жыраслава мог быць сын Нажыр, не згаданы ў крыніцах. У такім выпадку ў летапісах аказалася б прапушчана адно пакаленне. Прычыны гэтага маглі быць рознымі, напрыклад ранняя смерць або адсутнасць дзейнасці. Страта аднаго са звёнаў у такім генеалагічным ланцужку дазволіла б таксама растлумачыць досыць вялікі храналагічны разрыў паміж згадваннямі Жыраслава (1159) і яго ўнука (?) Даніїла (1235). Вядома, гэта магло мець месца толькі ў тым выпадку, калі здагадка аб выкарыстанні імя Жыраслаў у якасці радавога мае пад сабой рэальны гістарычны падмурак.

## Заключэнне

Падводзячы вынікі, варта адзначыць, што пацверджаны крыніцамі перыяд дзейнасці Жыраслава Нажыравіча ахоплівае толькі 1159 г. Уяўляецца верагодным, што баярын нарадзіўся ў першай трэці XII ст. і мог быць сынам Нажыра з акружэння Уладзіміра Манамаха або Нажыра Пераяславіча, які служыў Ізяславу Давыдавічу. Магчыма, ён саступаў у статусе іншым кіеўскім ваяводам, але валодаў значным вайсковым досведам, што дазволіла Расціславу Мсціславічу паставіць Жыраслава на чале значных сіл торкаў, накіраваных пад Менск. Лёс Жыраслава Нажыравіча пасля заканчэння менскага паходу 1159 г. у крыніцах не прасочваецца. Невядома, ці служыў ён далей Расціславу Мсціславічу і як доўга заставаўся на гэтай службе. Таксама невядомы час смерці Жыраслава. Яго магчымымі нашчадкамі можна лічыць трыпольскага ўрадніка Здзеслава Жыраславіча і кіеўскага ваяводу Даніїла Жыровіча (Нажыравіча).

[15]ПСРЛ. Т. 2. Ипатьевская летопись. СПб., 1908. Стб. 505. (Выкажу здагадку, што страта коней была выклікана не толькі голадам сярод торкаў, але і нейкім масавым захворваннем жывёлы, якое пачалося падчас аблогі Менска.)

[16]Latopis hustyński. Wrocław, 2003. S. 144.

[17]ПСРЛ. Т. 2. Ипатьевская летопись. СПб., 1908. Стб. 497.

[18]Там же. Стб. 544.

[19]Там же. Стб. 621, 677. (П. П. Талочка беспадстаўна лічыць, што Здзеслаў Жыраславіч служыў князю Мсціславу Мсціславічу [11, с. 129], хаця летапісныя звесткі не даюць ніякіх падстаў для такой высновы.)

[20]Даніїл згадваецца толькі ў Галіцка-Валынскім летапісе (Хроніка Раманавічаў). Але ў розных рэдакцыях летапісу ўказаны неадназначныя версіі яго імя па бацьку: у Іпацьеўскай рэдакцыі – *Данила Нажировича* (ПСРЛ. Т. 2. Ипатьевская летопись. СПб., 1908. Стб. 775), у Ермалаеўскай, Хлебнікаўскай і Пагодзінскай рэдакцыях – *Данила Жировича* (Kronika halicko-wołyńska (Kronika Romanowiczów). Kraków ; Warszawa, 2017. S. 688, uwaga 536).

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Алексеев ЛВ. *Полоцкая земля в IX–XIII вв. (очерки истории Северной Белоруссии)*. Москва: Наука; 1966. 295 с.
2. Алексеев ЛВ. *Западные земли домонгольской Руси: очерки истории, археологии, культуры. Книга 2.* Москва: Наука; 2006. 167 с.
3. Заяц Ю. Менская зямля: этапы фарміравання. *Беларускі гістарычны часопіс.* 1993;4:8–15.
4. Темушев СН. Минское княжество и Литва в XII – начале XIII в.: интерпретация летописных известий. В: Груша АІ, укладальнік. *Мінск і мінчане: 10 стагоддзяў гісторыі. Крыніцы па гісторыі горада. Сацыяльныя структуры і паўсядзённасць.* Мінск: Беларуская навука; 2012. с. 12–36.
5. Skulina T. *Staroruskie imiennictwo osobowe. Część 2.* Wrocław: Polska Akademia Nauk; 1974. 240 s.
6. Чучка ПП. *Слов'янські особові імена українців: історико-етимологічний словник.* Ужгород: Ліра; 2011. 432 с.
7. Нагирный ВН. Туровский посадник Жирослав Иванкович. Просопографический очерк. В: Мартынюк АВ, редактор. *Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы. Выпуск 12.* Минск: РИВШ; 2019. с. 31–41.
8. Taszycki W. *Najdawniejsze polskie imiona osobowe.* Kraków: Polska Akademia Umiejętności; 1925. 124 s.
9. Taszycki W, redaktor. *Słownik staropolskich nazw osobowych.* Wrocław: Polska Akademia Nauk; 1977. 533 s.
10. Бережков НГ. *Хронология русского летописания*. Москва: Издательство Академии наук СССР; 1963. 376 с.
11. Толочко ПП. *Власть в Древней Руси. X–XIII вв.* Санкт-Петербург: Алетейя; 2011. 200 с.
12. Тупиков НМ. *Словарь древне-русскихъ личных собственных имен.* Санкт-Петербург: Типография И. Н. Скороходова; 1903. 857 с.
13. Котович В. Лінгвокультурологічний портрет автохтонних українських астіонімів. *Вісник Львівського університету. Серія філологічна.* 2019;71(1):312–333. DOI: 10.30970/vpl.2019.71.10304.
14. Толочко ПП. *Киев и Киевская земля в эпоху феодальной раздробленности XII–XIII веков.* Киев: Наукова думка; 1980. 224 с.
15. Соловьев СМ. *История России с древнейших времен. Книга 1, тома 1–2.* Москва: Издательство социально-экономической литературы; 1959. 811 с.

## References

1. Alekseev LV. *Polotskaya zemlya v IX–XIII vv. (ocherki istorii Severnoi Belorussii)* [The Land of Polotsk in the 9th–13th centuries (essays in the history of Northern Belarus)]. Moscow: Nauka; 1966. 295 p. Russian.
2. Alekseev LV. *Zapadnye zemli domongol'skoi Rusi: ocherki istorii, arkheologii, kul'tury. Kniga 2* [The Western lands of pre-Mongol Rus': essays in history, archeology, culture. Book 2]. Moscow: Nauka; 2006. 167 p. Russian.
3. Zayac Yu. [The Land of Mensk: stages of formation]. *Belaruski gistarychny chasopis.* 1993;4:8–15. Belarusian.
4. Temushev SN. [The Principality of Minsk and Lithuanians in the 12th – early 13th centuries: interpretation of chronicle evidences]. In: Grusha AI, compiler. *Minsk i minchane: 10 stagoddzjaw gistoryi. Krynicy pa gistoyi goroda. Sacyjal'nyja struktury i pawsjadzionnasc'* [Minsk and its citizens: 10 centuries of history. Sources on the history of the city. Social structure and everyday life]. Minsk: Belaruskaja navuka; 2012. p. 12–36. Russian.
5. Skulina T. *Staroruskie imiennictwo osobowe. Część 2.* Wrocław: Polska Akademia Nauk; 1974. 240 s.
6. Chuchka PP. *Slov'jans'ki osobovi imena ukrai'nciv: istoryko-etymologichnyj slovnyk* [Slavic personal names of Ukrainians: a historical-etymological dictionary]. Uzhhorod: Lira; 2011. 432 p. Ukrainian.
7. Nagirnyy VN. [Posadnik of Turov Zhiroslav Ivankovich. The prosopographic essay]. In: Martyniuk AV, editor. *Studia Historica Europae Orientalis. Issue 12*. Minsk: National Institute for Higher Education; 2019. p. 31–41. Russian.
8. Taszycki W. *Najdawniejsze polskie imiona osobowe*. Kraków: Polska Akademia Umiejętności; 1925. 124 s.
9. Taszycki W, redaktor. *Słownik staropolskich nazw osobowych.* Wrocław: Polska Akademia Nauk; 1977. 533 s.
10. Berezhkov NG. *Khronolohiya russkogo letopisaniya* [Chronology of the Russian chronicles]. Moscow: Publishing House of the Academy of Sciences of USSR; 1963. 376 p. Russian.
11. Tolochko PP. *Vlast' v Drevnei Rusi. X–XIII vv.* [The power in Old Russian in the 10th–13th centuries]. Saint Petersburg: Aleteiya; 2011. 200 p. Russian.
12. Tupikov NM. *Slovar' drevne-russkikh lichnykh sobstvennykh imen* [The dictionary of old Russian personal proper names]. Saint Petersburg: Tipografiya I. N. Skorokhodova; 1903. 857 p. Russian.
13. Kotovych V. Linguistic and cultural portrait of autothton Ukrainian astionims. *Visnyk L'vivskogo universytetu. Seriya filolohichna*. 2019;71(1):312–333. Ukrainian. DOI: 10.30970/vpl.2019.71.10304.
14. Tolochko PP. *Kiev i Kievskaya zemlya v epokhu feodal'noi razdroblennosti XII–XIII vekov* [Kyiv and the Kyivan land in the period of feudal fragmentation of the 12th–13th centuries]. Kyiv: Naukova dumka; 1980. 224 p. Russian.
15. Soloviov SM. *Istoriya Rossii s drevneishikh vremen. Kniga 1, toma 1–2* [History of Russia since the ancient times. Book 1, volumes 1–2]. Moscow: Izdatel'stvo sotsial'no-ekonomicheskoi literatury; 1959. 811 p. Russian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 17.03.2020.*
*Received by editorial board 17.03.2020.*

***Пераклад С. М. Цемушава***[21].

[21]*Степан Николаевич Темушев* – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры истории России исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Сцяпан Мікалаевіч Цемушаў* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; дацэнт кафедры гісторыі Расіі гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Stsiapan N. Tsemushau*, PhD (history), docent; associate professorat the department of Russian history, faculty of history, Belarusian State University.

УДК 272:930:25

# МАССОВЫЕ ИСТОЧНИКИ ПО ЛИЧНОМУ СОСТАВУ ПРАВОСЛАВНОГО И РИМСКО-КАТОЛИЧЕСКОГО ДУХОВЕНСТВА КОНЦА XVIII – НАЧАЛА XX в.

***З. В. АНТОНОВИЧ***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

В архивных фондах православных и римско-католических консисторий Национального исторического архива Беларуси хранятся малоисследованные массовые источники – клировые ведомости и формулярные списки духовенства. Они позволяют осуществлять широкий круг исследований по истории конфессий в Беларуси и сопредельных странах, повседневности народа, по генеалогии и другим проблемам. Однако введение таких источников в научный оборот проблематично, что связано с сохранностью документов и объемом информации в них. Автор статьи путем сравнительного анализа формуляра и содержания документов определяет подходы к созданию массовых источников по личному составу духовенства в делопроизводстве обеих конфессий и круг основных и дополнительных сведений в них, что способствует расширению базы и диверсификации научных исследований.

***Ключевые слова:*** источниковедение Беларуси; конфессиональное источниковедение; православная церковь; Римско-католическая церковь; клировые ведомости; формулярные списки римско-католического духовенства.

# МАСАВЫЯ КРЫНІЦЫ ПА АСАБОВЫМ СКЛАДЗЕ ПРАВАСЛАЎНАГА І РЫМСКА-КАТАЛІЦКАГА ДУХАВЕНСТВА КАНЦА XVIII – ПАЧАТКУ XX ст.

***З. В. АНТАНОВІЧ***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

У архіўных фондах праваслаўных і рымска-каталіцкіх кансісторый Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі захоўваюцца маладаследаваныя масавыя крыніцы – кліравыя ведамасці і фармулярныя спісы духавенства. Яны дазваляюць ажыццяўляць шырокае кола даследаванняў па гісторыі канфесій у Беларусі і сумежных краінах, штодзённасці народаў, па генеалогіі і іншых праблемах. Аднак увядзенне ў навуковы ўжытак такіх крыніц выклікае складанасці, пераважна звязаныя з узроўнем захаванасці дакументаў і аб’ёмам інфармацыі ў іх. Аўтар артыкула шляхам параўнальнага аналізу фармуляраў і зместу дакументаў вызначае падыходы да стварэння масавых крыніц па асабовым складзе духавенства ў справаводстве абедзвюх канфесій і кола асноўных і дадатковых звестак у іх, што спрыяе пашырэнню базы і дыверсіфікацыі навуковых даследаванняў.

***Ключавыя словы:*** крыніцазнаўства Беларусі; канфесіянальнае крыніцазнаўства; праваслаўная царква; Рымска-каталіцкая царква; кліравыя ведамасці; фармулярныя спісы рымска-каталіцкага духавенства.

**Образец цитирования:**
Антановіч ЗВ. Масавыя крыніцы па асабовым складзе праваслаўнага і рымска-каталіцкага духавенства канца XVIII – пачатку XX ст. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2020;2:11–18.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2020-2-11-18

**For citation:**
Antanovich ZV. Mass sources on the personnel of the orthodox and Roman-Catholic clergy of the end of the 18$^{th}$ – the beginning of the 20$^{th}$ century. *Journal of the Belarusian State University. History.* 2020;2:11–18. Belarusian.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2020-2-11-18

**Автор:**
***Зинаида Васильевна Антонович*** – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры источниковедения исторического факультета.

**Author:**
***Zinaida V. Antanovich***, PhD (history), docent; associate professor at the department of source studies, faculty of history.
*zinantonowicz@gmail.com*
*https://orcid.org/0000-0003-0702-1915*

CC BY NC

Журнал Белорусского государственного университета. История. 2020;2:11–18
Journal of the Belarusian State University. History. 2020;2:11–18

# MASS SOURCES ON THE PERSONNEL OF THE ORTHODOX AND ROMAN-CATHOLIC CLERGY OF THE END OF THE 18th – THE BEGINNING OF THE 20th CENTURY

*Z. V. ANTANOVICH*[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

In the archival funds of the Orthodox and Roman-Catholic Consistories at the National Historical Archive of Belarus mass sources on the personnel are stored – clergy lists and service records of clergy. These documents were recorded each year by representatives of clergy and stored at the Consistories. They allow to carry out a wide number of studies on the history of Belarus and neighboring countries, confessions, everyday life, genealogy, etc. However, their use in scientific purposes is problematic, due to their safety and volume of information. The author of the article, through a comparative analysis of the form and content of the sources, defines approaches to creating mass sources on the clergy staff in the workflow of both confessions and the range of basic and additional information in them. The basic information includes personal data, education, work places, penalties, abilities to further work. If service records of Roman-Catholic clergy almost didn't change through the end of the 18th – the beginning of the 20th century, clergy lists of orthodox clergies changed in four stages gradually including information about clergy' family, property, etc. The results would help expand the source base and diversify scientific research.

***Keywords:*** source study of Belarus; confessional source study; the Orthodox Church; the Roman-Catholic Church; clerical lists; service records of the Roman-Catholic clergy.

## Уводзіны

Прадстаўнікі духавенства на працягу стагоддзяў выступалі ў ролі рэгулятараў грамадскага жыцця, фарміруючы светапогляд пакаленняў, стаўленне да дзяржаўных улад і прымаючы рашэнні па праблемах маральна-этычнага характару прыватных асоб, таму іх лёсы выклікаюць цікавасць грамадства і даследчыкаў. Найбольш інфарматыўнымі дакументамі канца XVIII – пачатку XX ст. па адзначанай праблематыцы з'яўляюцца кліравыя ведамасці (матэрыялы дзейнасці праваслаўнай царквы) і фармулярныя спісы (дакументы Рымска-каталіцкай царквы). Гэтыя крыніцы складаліся штогадова і мелі вызначаную структуру і змест, што адносіць іх да масавых крыніц сярод агульнай справаводнай дакументацыі канфесій (падсістэма дакументацыі па асабовым складзе духавенства). Яны канцэнтраваліся ў архівах кансісторый. Кансісторыі ў перыяд уваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі з'яўляліся калегіяльнымі канфесіянальнымі органамі з адміністрацыйнымі і судовымі функцыямі ў межах епархій (дыяцэзій). У выніку шэрагу адміністрацыйна-тэрытарыяльных рэарганізацый на беларускіх землях пасля іх уваходжання ў склад Расійскай імперыі дзейнічалі Літоўская (з 1900 г. – Гродзенская), Магілёўская, Мінская і Полацкая праваслаўныя епархіі, Магілёўская і Мінская рымска-каталіцкія дыяцэзіі. Частка тэрыторыі сучаснай Беларусі ўваходзіла ў склад Віленскай рымска-каталіцкай дыяцэзіі. У дадзеным артыкуле разглядаюцца матэрыялы справаводства названых органаў канфесіянальнай адміністрацыі Магілёўскай, Мінскай і Полацкай праваслаўных епархій, Магілёўскай і Мінскай рымска-каталіцкіх дыяцэзій, што захоўваюцца ў складзе архіўных фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ).

## Метадалогія даследавання

У НГАБ прадстаўлены архіўныя фонды васьмі кансісторый, з якіх тры праваслаўныя (Магілёўская, Мінская і Полацкая) і дзве рымска-каталіцкія (Магілёўская і Мінская), але захаванасць дакументаў у складзе фондаў нераўнамерная, што абумоўлена аб'ектыўнымі фактарамі (ваенныя дзеянні, надзвычайныя сітуацыі і інш.), а таксама ажыццяўленнем экспертызы каштоўнасці дакументаў і іх адбору да знішчэння як падчас дзейнасці кансісторый, так і пры знаходжанні матэрыялаў у дзяржаўных сховішчах[1]. Аналіз складу архіўных фондаў дазваляе сцвярджаць, што найлепш захаваліся кліравыя ведамасці па Мінскай епархіі: зафіксавана каля 830 спраў за 1796–1809, 1811–1904, 1906, 1908, 1912–1913 гг.[2] У выніку параўнання структуры, афармлення і зместу гэтых дакументаў за кожныя 5 гадоў выяўлена чатыры этапы змены фармуляра кліравых ведамасцей у Мінскай епархіі. Пры гэтым неабходна ўлічваць, што новыя фармуляры распаўсюджваліся ва ўсіх яе цэрквах на працягу 1–2 гадоў, а не адначасова [1].

Цэласныя комплексы фармулярных спісаў захаваліся ў архіўным фондзе Магілёўскай рымска-

[1]НГАБ. Ф. 136, 937, 1781, 2301, 2531.
[2]Там жа. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 40389–40393.

каталіцкай кансісторыі пераважна за 1858–1861, 1865, 1869–1870 гг.[3], а ў фондзе Мінскай рымска-каталіцкай кансісторыі – толькі за 1867 г.[4] Асобныя спісы за перыяд функцыянавання кансісторый сфарміраваны ў асабовыя справы святароў, справы аб духавенстве асобных касцёлаў, дэканатаў і кляштараў і іншыя віды спраў [2, с. 89–90]. Без выкарыстання дадатковых крыніц ступень захаванасці гэтых дакументаў не дазваляе цалкам узнавіць асабовы склад каталіцкага духавенства канца XVIII – пачатку XX ст. з біяграфічнымі звесткамі, але можна прасачыць змены ў структуры, змесце і афармленні даследуемых відаў крыніц. Адпаведна, для параўнання выкарыстоўваліся фармулярныя спісы з усёй сукупнасці дакументальнага комплексу. Дадатковымі крыніцамі даследавання выступілі нарматыўныя дакументы канфесіянальнай і агульнадзяржаўнай рэгламентацыі[5]. Хаця захаванасць згаданых крыніц у НГАБ можна ацаніць як дастатковую для правядзення даследаванняў, яны абмежавана выкарыстоўваюцца навукоўцамі, а параўнальны аналіз структуры і інфарматыўнасці асабовых звестак пра духавенства праваслаўнай і Рымска-каталіцкай цэркваў даследчыкі амаль не закраналі [1–6].

## Вынікі даследавання

У Расійскай імперыі фармулярныя спісы складаліся служачымі дзяржаўных устаноў і самакіравання з мэтай адсочвання прасоўвання па кар’ернай лесвіцы, ацэнкі служачых, узнагароджвання і атрымання пенсіі [7, с. 9–13]. Мэты збору асабовых звестак пра клір былі іншымі, хаця працэс іх фіксацыі і склад адпавядалі агульнадзяржаўным патрабаванням. Кліравым ведамасцям і фармулярным спісам духавенства адводзілася ўліковая функцыя, з іх дапамогай таксама адсочвалася забеспячэнне прадстаўніцтваў канфесій душпастарамі, ажыццяўлялася ацэнка іх дзейнасці і здольнасцей белага духавенства (протаіерэі, святары, протадыяканы, дыяканы, дзякі, а таксама прычотнікі на пасадах псаломшчыкаў[6]).

Патрабаванне аб прадстаўленні кліравых ведамасцей епархіяльнаму кіраўніцтву было ўведзена ў 1769 г., аднак першыя захаваныя дакументы па Мінскай епархіі адносяцца да 1796 г. Кліравыя ведамасці ўключалі тытульны аркуш, характарыстыку царкоўных пабудоў, прыпісных цэркваў і капліц (першая частка), інфармацыю пра святароў і царкоўных служачых, у тым ліку іх узрост, паходжанне, узровень адукацыі, сямейны стан, падсуднасць, кар’ерны рост (другая частка), і прыхаджан, колькасць двароў і насельніцтва (трэцяя частка) [1]. Да пачатку XX ст. гэты від дакументаў афармляўся на рускай мове, а з увядзеннем бланкаў маскоўскай сінадальнай тыпаграфіі ў 1870–80-я гг. нязменная інфармацыя ўносілася на царкоўнаславянскай мове.

Першапачаткова ў другі раздзел уключалася наступная інфармацыя пра белае духавенства або клір[7]: прозвішча, імя, імя па бацьку; узрост духавенства і іх сыноў; адукацыя, хіратонія і месцы служэння; асабовыя якасці і заганы; спагнанні і падсуднасць; месца навучання дзяцей; колькасць пахатнай і сенажатнай зямлі ў карыстанні белага духавенства[8]. У адрозненне ад грамадзянскіх і рымска-каталіцкіх паслужных спісаў у асобны раздзел кліравых ведамасцей не выносіліся звесткі пра паходжанне. Яно пазначалася пасля імя і прозвішча. Пераважная большасць кліру паходзіла з духавенства, але дазвалялася прымаць у яго склад і асоб іншага саслоўнага паходжання пасля пацвярджэння адпаведнасці іх адукацыі і паводзін, напрыклад, паводле духоўнага рэгламенту патрабавалася пасведчанне ад прыхаджан аб маральным стане кандыдата[9]. Сярод духавенства непрычтавага паходжання быў протадыякан Мінскага кафедральнага Петрапаўлаўскага сабора Павел Казлякоўскі, які паходзіў з дваран[10]. Пры гэтым мяшчане і сяляне дапускаліся да займання пасад духавенства пры наяўнасці вакансій, як, у прыватнасці, давыдгарадоцкі святар Андрэй Мазановіч, які паходзіў з сялян князя Юзафа Радзівіла[11]. Адукацыю звычайна атрымліваў адзін з сыноў святара або дзяка ў семінарыі, але за дрэнныя паводзіны або адсутнасць здольнасцей ён мог быць выключаны, што не пазбаўляла яго магчымасці будаваць духоўную кар’еру ў будучыні. Напрыклад, панамар слуцкай

[3]НГАБ. Ф. 1781. Воп. 25. Спр. 147–153.
[4]Там жа. Ф. 937. Воп. 6. Спр. 107.
[5]Полное собрание законов Российской империи с 1649 г. (далее – ПСЗРИ). Собр. 1 : в 45 т. СПб. : Тип. 2-го отд-ния собств. ЕИВ канцелярии, 1830–1851 ; ПСЗРИ. Собр. 2 : в 55 т. СПб. : Тип. 2-го отд-ния собств. ЕИВ канцелярии, 1830–1884 ; Свод законов Российской империи повелением государя императора Николая Павловича составленный (далее – СЗРИ). СПб. : Тип. 2-го отд-ния ЕИВ канцелярии, 1899 ; Устав духовных консисторий. СПб. : Синод. тип., 1843 і інш.
[6]О духовенстве // СЗРИ. Т. 9. Ст. 406.
[7]Там же.
[8]НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 40392.
[9]Духовный регламент всепресветлейшего: державнейшего государя Петра Первого, императора и самодержца всероссийского. М. : Синод. тип., 1897. С. 94–97 ; Устав духовных консисторий. СПб. : Синод. тип., 1843. Ст. 80 ; Устав духовных консисторий с дополнениями и разъяснениями Святейшего Синода и правительствующего Сената / сост. М. Н. Палибин. СПб. : Юрид. книж. маг. Н. К. Мартынова, 1900. Ст. 46.
[10]НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 40902. Арк. 80–98 адв.
[11]О духовенстве // СЗРИ. Т. 9. Ст. 427 ; НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 40433. Арк. 108 адв. – 109.

Уваскрасенскай царквы Іосіф Бяляўскі навучаўся толькі «российской грамоте»[12].

У 1802–1803 гг. адбываюцца змены ў структуры другой часткі кліравых ведамасцей. У дакуменце адзначаліся ўзровень пісьменнасці кліру, імёны дзяцей святароў і пазаштатных святароў, якія ўлічваліся таксама ва ўведзенай у фармуляр спраў выніковай ведамасці па духоўным праўленні (благачынні). Сем'і кліру звычайна былі шматдзетнымі, напрыклад, у выпускніка Кіеўскай духоўнай акадэміі Іаана Андрыеўскага было трое дзяцей, у Антонія Валасевіча – пяць, а у Міхаіла Туміловіча – дзевяць[13].

Шмат увагі ў агульнадзяржаўных нарматыўных актах Расійскай імперыі надавалася інфармацыі фармулярных спісаў пра падсуднасць, што адбілася і на звестках, якія ўносіліся ў кліравыя ведамасці. У першай трэці XIX ст. у адпаведны слупок уключаліся ўсе спагнанні[14], але ў 1834 г. гэта пазіцыя была перагледжана і туды сталі ўносіцца толькі судовыя рашэнні. Вымовы і спагнанні не адзначаліся да 1837 г., аднак потым пачалі ўключацца вымовы пры наяўнасці адпаведнага распараджэння канфесіянальнай адміністрацыі, а з 1938 г. і спагнанні[15]. Звесткі пра апраўдальныя прысуды не ўключаліся ў паслужныя спісы з 1837 па 1851 г.[16] У кліравых ведамасцях першапачаткова звесткі абмяжоўваліся фіксацыяй наяўнасці спагнання або знаходжання пад следствам, указаннем тэрміну і кароткім пераказам сутнасці справы[17]. У 1812 г. была дададзена адзнака органа, якім разглядалася справа[18]. Звесткі пра апраўдальныя прысуды ўносіліся рэдка, а дэталізаваная інфармацыя прадстаўлена адзінкавымі прыкладамі, як у кліравай ведамасці святара царквы ў с. Вялікая Калпяніца Фёдара Шчуроўскага[19].

У 1812 г. уводзіцца дзяленне кліравай ведамасці на дзве выразныя больш падрабязныя часткі (табліцы), адна з якіх змяшчае інфармацыю пра прыход, другая – пра духавенства. У апошняй акцэнтаваліся звесткі пра навучанне ў семінарыі, здольнасць прычту спяваць па нотах, змены ў складзе кліру[20]. Паступова змянілася інфармацыя пра духавенства, якая да 1829 г. стала ўключаць звесткі пра жонку і дачок святара, прасвіраняў, удоў і сірот, якія пражывалі пры царкве. З 1823 г. пасля даных аб прыходскім духавенстве фіксаваліся пазаштатныя святары і манахі, якія знаходзіліся пад апекай царквы.

У 1829 г. адбылося дзяленне фармуляра кліравых ведамасцей на тры часткі, у якія ўносілася інфармацыя пра царкву, прычт і прыход адпаведна. У другой частцы адзначаліся здольнасці членаў царкоўнага кліру (узровень пісьменнасці, валоданне асноўнымі догматамі веравызнання, колькасць прамоў за мінулы год і інш.), а таксама наяўнасць уласнай маёмасці. Гэта адбылося ў кантэксце ўвядзення новага ўзору фармулярных спісаў служачых у Расійскай імперыі ў 1828 г., паводле якога таксама выносілася ў асобны слупок наяўнасць нерухомай маёмасці і спосаб яе набыцця служачым дзяржаўнай установы або яго жонкай[21]. У пераважнай большасці праваслаўнага кліру Мінскай епархіі не было ўласнай маёмасці. Выключэннем можна лічыць святара жолкінскай царквы Паўла Юрашкевіча, які меў сасновы дом, два свірны, будынкі для захоўвання хлеба і ўтрымання дробнай жывёлы[22]. Хаця ў фармулярных спісах грамадзянскіх служачых узору 1828 г. таксама адзначаліся ўдзел у ваенных кампаніях і знаходжанне ў адпачынку[23], у кліравыя ведамасці гэтыя звесткі былі ўведзены толькі ў апошняй трэці XIX ст. Адпачынак праваслаўныя святары таксама бралі рэдка. У выпадку Міхаіла Туміловіча, якому 5 разоў выдзяляўся адпачынак па стане здароўя, скарыстацца такой магчымасцю не ўдалося па фінансавых прычынах[24]. Цікава, што сваяцтва кліру адной царквы пазначалася ў 1875–1895 гг.

У выніку змен фармуляра кліравых ведамасцей увогуле і раздзела пра духавенства ў прыватнасці сталі ўносіцца такія звесткі, як, напрыклад, у дакуменце святара царквы ў с. Вялікая Калпяніца Фёдара Шчуроўскага. Ён нарадзіўся ў сям'і дзяка с. Чарняўка Чаркаскага павета Кіеўскай губерні, у 1873 г. скончыў Кіеўскую духоўную семінарыю, у 1876 г. – духоўную акадэмію са званнем студэнта і быў прызначаны памочнікам інспектара мінскай семінарыі. Фёдар Шчуроўскі хіратанізаваны 31 жніўня 1881 г. у святары і прызначаны святаром калпяніцкай царквы. Адначасова ён выкладаў Закон Божы ў народным вучылішчы. З 1883 г. стаў таксама благачынным трэцяй акругі, следчым па духоўных справах. У 1886 г. удзельнічаў у правядзенні экзаменаў у Нясвіжскай семінарыі як прадстаўнік епіскапа, а праз 2 гады ўвайшоў у склад камісіі па падрых-

[12]НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 40610. Арк. 11 адв. – 12.
[13]Там жа. Арк. 35 адв. – 36 ; Спр. 40902. Арк. 120 адв. – 121 ; Спр. 41152. Арк. 54 адв. – 55.
[14]ПСЗРИ. Собр. 2. Т. 6 : 1831. Ст. 4253.
[15]Там же. Т. 9. Ст. 7603 ; Т. 10. Ст. 10513 ; Т. 13. Ст. 11574.
[16]Там же. Т. 10. Ст. 10513 ; Т. 26. Ст. 25777.
[17]НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 40392. Арк. 5 адв. – 6.
[18]Там жа. Спр. 40482.
[19]Там жа. Спр. 41143. Арк. 109–113 адв.
[20]Там жа. Спр. 40482. Арк. 1 адв. – 2.
[21]ПСЗРИ. Собр. 2. Т. 3 : 1828. Ст. 2278
[22]НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41074. Арк. 127 адв. – 128.
[23]ПСЗРИ. Собр. 2. Т. 3 : 1828. Ст. 2278.
[24]НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41152. Арк. 54 адв. – 55.

тоўцы праекта святкавання 50-годдзя Полацкага царкоўнага сабора 1839 г. Выкладчыцкую дзейнасць працягнуў у Баранавіцкім чыгуначным вучылішчы ў 1890–1897 гг., а з 1892 г. быў таксама дэпутатам ад духавенства пры разглядзе судовых спраў. Сярод яго ўзнагарод – скуф'я, медалі «У гонар царавання імператара Аляксандра III», «За ўдзел у перапісе», падзякі за выкладчыцкую дзейнасць і інш. Яго сыну Мікалаю было 28 гадоў, ён навучаўся ў Харкаўскім імператарскім інжынерна-тэхналагічным вучылішчы, а Віктар, народжаны ў 1904 г., знаходзіўся пры бацьку. Нерухомай маёмасці і сваякоў сярод прыходскага кліру Фёдар Шчуроўскі не меў. Яго душпастарская дзейнасць высока цанілася, хаця раней ён быў пад следствам, але разгляд справы скончыўся апраўданнем[25].

Рымска-каталіцкае прыходскае духавенства, да якога адносіліся пробашчы (адміністратары), вікарыі, капеланы, з мэтай уліку асабовага складу выкарыстоўвала фармулярныя спісы, распрацаваныя на падставе агульнадзяржаўных узораў, але з улікам спецыфікі прадстаўнікоў канфесіі. У параўнанні з узорам адпаведных дакументаў грамадзянскіх служачых у спісах духавенства адсутнічалі пазіцыі аб наяўнасці жонкі і дзяцей, уласнай маёмасці, знаходжанні ў адпачынку[26]. Таксама адзначаўся ўдзел рымска-каталіцкага духавенства ў ваенных кампаніях, хоць для такой інфармацыі не было асобнага слупка. Гэта было актуальна для Магілёўскай архідыяцэзіі, межы якой ахоплівалі Віцебскую і Магілёўскую губерні, а таксама асобныя парафіі і капліцы на тэрыторыі Расійскай імперыі, якія не былі аб'яднаны ў адміністрацыйна-тэрытарыяльную структуру. Асобныя святары выконвалі абавязкі капеланаў у воінскіх фарміраваннях [8, с. 50; 9, s. 536–583]. Так, у сярэдзіне XIX ст. гэту пасаду займалі Юзаф Кавалеўскі, Самуіл Кроп, Чэслаў Кацякоўскі, Фадзей Сікорскі, Ігнацій Гербацкі і інш.[27] Акрамя таго, ратацыя кадраў у Рымска-каталіцкай царкве ажыццяўлялася часцей, чым у праваслаўнай, і людзі з попытам душпастарскай дзейнасці ў войску перамяшчаліся на парафіяльныя пасады або сумяшчалі іх, як, напрыклад, пробашч іркуцкага касцёла Хрыстафор Швярміцкі[28].

Структура фармулярных спісаў рымска-каталіцкага духавенства ў XIX ст. фактычна не змянялася [2, с. 89–98]. З мэтай надання значнасці гэтым відам дакументаў выкарыстоўвалася папера з філігранямі, а звесткі ўносіліся на рускай мове[29]. Друкаваныя фармуляры ўвайшлі ў выкарыстанне ў апошняй трэці XIX ст.[30] У рэдкіх выпадках тыпаграфскім спосабам прыводзіліся звесткі папярэдняга фармулярнага спіса, як у дачыненні да Юзафа Францава Свіклі (нарадзіўся каля 1877 г.). У яго выпадку інфармацыя пра сялянскае паходжанне, хатнюю адукацыю і завяршэнне магілёўскай семінарыі, кар'ерныя змены з моманту першага прызначэння надрукаваны, а губерня, апошняе перамяшчэнне, забеспячэнне і подпіс рэжыцка-разненскага дэкана выкананы рукапісным спосабам[31].

Фармулярныя спісы рымска-каталіцкага духавенства пачыналіся з тытульнага аркуша, на якім адзначаліся від дакумента, пасада святара, імя і год складання. На развароце дакумента змяшчалася табліца з 8–9 слупкоў, у першым з якіх пазначаліся імя, імя па бацьку, прозвішча і пасада святара, калі апошняе адсутнічала на тытульным аркушы.

Характарыстыка паходжання святара (другі слупок) у першай палове XIX ст. уключала інфармацыю пра саслоўе, месца нараджэння, у тым ліку павет і губерню. Напрыклад, у фармулярным спісе Дамініка Браневіча, капелана вязынскай філіяльнай капліцы на могілках, нават пазначана парафія нараджэння[32], але такая падрабязная інфармацыя характэрная пераважна для адзінага захаванага комплексу гэтых дакументаў па Мінскай дыяцэзіі за 1867 г.[33] У другой палове XIX ст. адзначалася саслоўная прыналежнасць. Святары пераважна былі шляхецкага паходжання, але адміністратарам шадурска-дукштыгальскага касцёла быў сын обер-афіцэра Мечыслаў Дыдалевіч[34], а з сялян паходзіў выконваючы абавязкі адміністратара касцюковіцкага касцёла з 1864 г. Дамінік Лятук[35]. У гэтым слупку таксама магла пазначацца нацыянальнасць прадстаўніка духавенства. Асобы іншаземнага паходжання пераважна выконвалі душпастарскую дзейнасць у сталічных касцёлах. Так, у Маскве служылі вікарый Петрапаўлаўскага касцёла сын прускага падданага Фрыдрых Отэн, пробашч касцёла Святога Людовіка Пётр Кудэр і вікарый Пётр Тэроль[36]. Трэці слупок спіса быў прысвечаны месцу нараджэння з пазначэннем даты і ўзросту ксяндза, а з сярэдзіны XIX ст. запіс быў спрошчаны да падачы звестак пра ўзрост.

Далейшы кар'ерны рост і лёс прадстаўніка духавенства ў значнай ступені залежалі ад адукацыі, звесткі пра яе змяшчаліся ў чацвёртым слупку. Аду-

[25]НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41143. Арк. 109–113 адв.
[26]ПСЗРИ. Собр. 2. Т. 3 : 1828. Ст. 2278.
[27]НГАБ. Ф. 1781. Воп. 25. Спр. 151. Арк. 191–192, 364 адв. – 365, 386 адв. – 387, 400–401, 454–455.
[28]Там жа. Арк. 444–445.
[29]Там жа. Спр. 83.
[30]Там жа. Спр. 57. Арк. 143–146 ; Спр. 174. Арк. 1–1 адв. ; Спр. 261. Арк. 1–4 ; Спр. 271. Арк. 1–6.
[31]Там жа. Спр. 271. Арк. 5–6.
[32]Там жа. Ф. 937. Воп. 6. Спр. 107. Арк. 294 адв. – 295.
[33]Там жа. Спр. 107.
[34]Там жа. Ф. 1781. Воп. 25. Спр. 151. Арк. 317–318.
[35]Там жа. Арк. 86 адв. – 87.
[36]Там жа. Арк. 422–423, 432–435.

кацыя падзялялася на свецкую (агульную), якую атрымлівалі падчас хатняга навучання або ў вучылішчах і гімназіях, і спецыяльную, якую можна было набыць у пачатку XIX ст. у кляштарах, а пазней толькі ў семінарыях і духоўнай акадэміі. Асобныя святары пазначалі нават засвоеныя падчас навучання дысцыпліны. Даныя аб ардынацыі ў першай трэці XIX ст. прыводзіліся пераважна ў слупку, прысвечаным прафесійнай дзейнасці. У прыватнасці, запісвалася імя біскупа, які ажыццяўляў абрад, а звесткі аб падрыхтоўцы да святарства ўносіліся разам з данымі аб агульнай адукацыі або прафесійнай дзейнасці. У XIX ст. сустракаліся выпадкі, калі чалавек мог атрымліваць адукацыю ў некалькіх духоўных навучальных установах, праходзячы ў іх розныя курсы навук, або перапыняць гэты працэс з правам вяртання. Напрыклад, адміністратар стружанскага касцёла Ігнаці Пупшэвіч навучаўся ў віленскай, а затым – у краслаўскай семінарыі[37]. Цікава склаўся лёс Дамініка Стацэвіча, які стаў рэктарам Санкт-Пецярбургскай духоўнай акадэміі і членам рымска-каталіцкай калегіі пасля навучання ў Аршанскім павятовым вучылішчы і Папорцкім дамініканскім кляштары. Ён таксама выкладаў правазнаўства ў імператарскім вучылішчы[38].

Найбольшым па аб'ёме інфармацыі быў раздзел, прысвечаны святарскай дзейнасці (шосты слупок). Душпастарская праца выпускніка семінарыі або духоўнай акадэміі ў XIX ст. пачыналася з ардынацыі і ўказа кансісторыі па ўзгадненні з органамі дзяржаўнай улады аб прызначэнні на пасаду. Звычайна першай была ніжэйшая ў іерархіі духавенства пасада вікарыя. Яе таксама маглі займаць асобы, не здольныя да самастойнага выканання душпастарскіх абавязкаў або паніжаныя за парушэнні[39]. Сярод апошніх у 1860-я гг. у Мінскай дыяцэзіі быў Андрэй Коц[40], а ў Магілёўскай архідыяцэзіі – Андрэй Кучынскі[41].

Рымска-каталіцкім духавенствам у фармулярных спісах вельмі рэдка запаўняўся слупок пра падсуднасць і наяўнасць спагнанняў (сёмы слупок). Пераважна гэтыя звесткі адлюстроўваліся ў асабовых справах, калі яны разглядаліся канфесіянальнай адміністрацыяй, або ў матэрыялах дзейнасці дзяржаўных устаноў. Іншай прычынай з'яўляецца тое, што ў выніку абвінавачання ва ўдзеле ў паўстаннях 1830-х і 1860-х гг. да прадстаўнікоў духавенства прымянялася адміністрацыйная высылка з пазбаўленнем правоў на ажыццяўленне душпастарскай дзейнайсці [10, с. 111–117; 11, s. 95–220]. Унутрыканфесіянальнай адказнасці яна не прадугледжвала, таму інфармацыя пра абвінавачанне ёсць толькі ў спісах, складзеных пасля аднаўлення ў правах, што адбылося ў 1857 г. з Янам Шчытам, якому было дазволена вярнуцца з Саратава ў Віцебскую губерню[42]. Згаданы вышэй Хрыстафор Швярміцкі быў высланы ў Іркуцкую губерню без пазбаўлення правоў на ажыццяўленне душпастарскай дзейнасці, што дазволіла яму там развіваць парафію[43].

Штогадовыя даходы святара і іх крыніцы (восьмы слупок фармулярнага спіса) залежалі ад заможнасці парафіі да 1844 г., калі быў уведзены падзел на класы[44]. У выніку на ўтрыманне касцёлаў аднаго класа прыходзіліся аднолькавыя сумы, нягледзячы на іх крыніцы[45]. Пры гэтым святар мог таксама мець уласны даход ад сумяшчэння абавязкаў, пераважна ў кансісторыях або навучальных установах, як, напрыклад, Фелікс Камянецкі, які з'яўляўся выкладчыкам Закону Божага ў Горы-Горацкім земляробчым інстытуце. Яго даход ад выкладчыцкай дзейнасці складаў 300 руб., а ў якасці пробашча ён атрымліваў 275 руб.[46] Здольнасць да далейшага выканання сваіх абавязкаў (дзявяты слупок фармулярнага спіса) праяўлялі ўсе рымска-каталіцкія святары. Выключэнне складалі эмерыты, узрост якіх не дазваляў ім выконваць працу на высокім узроўні (як, у прыватнасці, быламу віцэ-пробашчу санкт-пецярбургскага касцёла Святой Кацярыны Андрэю Кучынскаму[47]), а таксама асобы з псіхічнымі або фізічнымі захворваннямі[48].

Цікавы лёс можна прасачыць па фармулярным спісе доктара багаслоўя аўтара біблейскай герменеўтыкі (*Hermeneutica Biblica Senarsiater pretaudi skripturum sakrum rulqotae latinie Accomedata* [49]) Адольфа Багенскага. Ён атрымаў адукацыю ў Віленскай гімназіі і мінскай семінарыі, а затым навучаўся ў Віленскай акадэміі. Праз 2 гады пасля ардынацыі, у 1836 г., выконваў абавязкі прафесара Свяшчэннага Пісання (заняў стала пасаду ў 1843 г.) і быў памочнікам інспектара па выхаванні ў Санкт-Пецярбургскай рымска-каталіцкай акадэміі (1838/39 навучальны год). У 1849 г. прызначаны канонікам ма-

[37]НГАБ. Ф. 1781. Воп. 25. Спр. 151. Арк. 343–344.
[38]Там жа. Арк. 355–357.
[39]Lietuvos valstybes istorijos archyvas (LVIA). F. 604. Ap. 1. B. 327б.
[40]НГАБ. Ф. 937. Воп. 6. Спр. 107. Арк. 15 адв. – 18.
[41]Там жа. Ф. 1781. Воп. 25. Спр. 151. Арк. 356 адв. – 358.
[42]Там жа. Арк. 12 адв.– 15.
[43]Там жа. Арк. 444–445.
[44]Там жа. Воп. 2. Спр. 3261. Арк. 5–6 адв.
[45]Там жа. Воп. 25. Спр. 83. Арк. 1–6.
[46]Там жа. Спр. 151. Арк. 36–37.
[47]Там жа. Арк. 356 адв. – 358.
[48]LVIA. F. 604. Ap. 1. B. 2631.
[49]Так у арыгінале.

гілёўскага капітула, а ў 1855 г. – прэлатам-кантарам. За сваю дзейнасць быў узнагароджаны нагрудным крыжам (1845), ордэнамі Святой Ганны III ступені (1846), Святога Станіслава II ступені (1856), бронзавым крыжам і медалём у памяць аб Крымскай вайне. Забеспячэнне А. Багенскага як прафесара акадэміі складала 857 руб., а на пасадзе прэлата капітула – 275 руб.[50]

## Заключэнне

Такім чынам, духавенства ў перыяд уваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі адыгрывала значную ролю на грамадска-палітычнай арэне і з'яўлялася адным з прывілеяваных саслоўяў, таму яго асабоваму складу надавалася вялікая ўвага. У гэтым даследаванні ажыццёўлены кампаратыўны аналіз масавых крыніц па асабовым складзе праваслаўнага і рымска-каталіцкага духавенства. Лёсы яго прадстаўнікоў прасочваліся вышэйстаячымі ўстановамі шляхам збору штогадовых звестак па вызначаным узоры. Сёння гэтыя крыніцы сканцэнтраваны пераважна ў комплексах кліравых ведамасцей у архіўных фондах праваслаўных кансісторый і фармулярных спісах духавенства ў фондах рымска-каталіцкіх кансісторый у НГАБ, сярод якіх па прычыне паўнаты захаванасці ўвагі патрабуюць фонды «Мінская праваслаўная духоўная кансісторыя» (ф. 136) і «Магілёўская рымска-каталіцкая кансісторыя» (ф. 1781). Структура прадстаўлення і змест асабовых звестак у гэтых крыніцах адпавядаюць фармулярным спісам грамадзянскіх служачых, якія былі спецыфікаваны пад уласцівасці канфесій. Яны запаўняліся штогадова на рускай мове (хаця з 1870-х гг. пастаянныя рэквізіты друкаваліся на царкоўнаславянскай мове) прадстаўнікамі духавенства, завяраліся святарамі, благачыннымі (дэканамі) і перадаваліся ў кансісторыі. Прадстаўнікі Рымска-каталіцкай царквы карысталіся паперай з філігранямі, а з апошняй трэці XIX ст. і друкаванымі фармулярамі, на якіх пакідалася месца для пераменнай інфармацыі пра апошняе месца дзейнасці, узнагароды і здольнасці.

Запаўненне звестак пра адукацыю, пасады, узнагароды і падсуднасць у кліравых ведамасцях і фармулярных спісах духавенства было ўніфікавана і ўключала год і апісанне падзеі, а для членаў сям'і пазначаўся толькі ўзрост. У асобных выпадках прадстаўнікі канфесій падавалі поўную дату прызначэння на пасаду, узнагароджання, накладання спагнанняў і адпаведны нумар указа кансісторыі.

Агульнай інфармацыяй для ўсіх крыніц з'яўляецца прадстаўленне наступных звестак: прозвішча, імя і імя па бацьку, пасады і ўзросту; саслоўнай прыналежнасці; месца атрымання адукацыі, інфармацыі пра пасвячэнне ў духоўны сан і пасады, якія займаў прадстаўнік духавенства, яго ўзнагароды, спагнанні і знаходжанне пад судом; здольнасці да далейшай дзейнасці. Пры гэтым калі структура фармулярных спісаў рымска-каталіцкага духавенства на працягу вызначанага перыяду не змянялася, то ў развіцці фармуляра кліравых ведамасцей вылучаецца чатыры этапы адпаведна пашырэнню прадстаўляемых звестак. Яны паступова сталі ўключаць інфармацыю пра жонак і дзяцей кліру, у тым ліку паводзіны і адукацыю апошніх, ступень сваяцтва, наяўнасць уласнай маёмасці і нават знаходжанне ў адпачынку. Асобна ў праваслаўнай царкве з 1823 г. пералічваліся пазаштатныя члены кліру, а ў Рымска-каталіцкай царкве складаліся фармулярныя спісы на эмерытаў, якія пражывалі пры капліцах і прыходах.

Нягледзячы на пэўную розніцу ў фармулярах і змесце кліравых ведамасцей праваслаўнага кліру і фармулярных спісаў рымска-каталіцкага духавенства, вынікі аналізу дазваляюць сцвярджаць пра ўніфікацыю падыходаў да стварэння масавых крыніц па асабовым складзе духавенства ў справаводстве абедзвюх канфесій на падставе нарматыўнай праваой базы Расійскай імперыі для прасочвання кар'ернага росту грамадзянскіх служачых. Вызначэнне кола асноўных і дадатковых звестак дазваляе пашырыць крыніцазнаўчую базу даследаванняў па гісторыі Беларусі і сумежжа з выкарыстаннем макрагістарычнага і мікрагістарычнага падыходаў.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Антановіч ЗВ. Кліравыя ведамасці Мінскай епархіі як гістарычная крыніца (па матэрыялах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі). *Беларускі археаграфічны штогоднік.* 2018;19:51–60.

2. Антановіч ЗВ. *Архівы Магілёўскай і Мінскай рымска-каталіцкіх кансісторый: гісторыя, структура, склад дакументаў (1782–1918 гг.).* Мінск: Экоперспектива; 2016. 226 с.

3. Владимиров ВН, Чибисов МЕ. Клировые ведомости как источник для изучения приходского духовенства Колывано-Воскресенского (Алтайского) горного округа. *Известия Алтайского государственного университета. История.* 2014;4:59–63. DOI: 10.14258/izvasu(2014)4.1-08.

4. Всеволодов АВ. *Православное приходское духовенство в 1840-е – 1880-е гг.: материальное обеспечение, корпоративная организация, самосознание (на материалах Вологодской епархии)* [диссертация]. Череповец: ЧГУ; 2014. 377 с.

[50] НГАБ. Ф. 1781. Воп. 25. Спр. 151. Арк. 14 адв. – 18.

5. Мангилёва АВ. Православное духовенство города Ирбита в первой трети XIX века (на основе данных клировых ведомостей). *Вестник Челябинского государственного университета. История.* 2011;1:114–123.
6. Спичак АВ. Эволюция оформления клировых ведомостей в Тобольской епархии в XVIII – начале XX веков. *Научный диалог*. 2015;12:328–338.
7. Зайончковский ПА. *Правительственный аппарат самодержавной России в XIX веке*. Москва: Мысль; 1978. 288 с.
8. Толстой ДА. *Римский католицизм в России. Том 1.* Санкт-Петербург: Типография В. Ф. Демакова; 1876. 178 с.
9. Boudou A. *Stolica Swięta a Rosja: dyplomatyczne stosunki między niemi w XIX stuleciu. Tom 1: 1814–1847.* Kraków: Wydawnictwo księży Jezuitów; 1928. 608 s.
10. Горбачева ОВ. Восстание 1863–1864 гг. и репрессивные мероприятия царизма в Беларуси. В: *Powstanie styczniowe 1863–1864. Wałka i uczęstnicy. Represje i wygnanie. Historiografia i tradycja*. Kielce: Wydawnictwo Akademii Świętokrzyskiej; 2005. s. 111–117.
11. Niebelski E. *Tunka: syberyjskie losy księży zesłańców 1863 roku*. Wrocław: Polskie Towarzystwo Ludoznawcze; 2011. 394 s.

## References

1. Antanovich ZV. The clergy lists of the Minsk Diocese as a historical source (based on the materials of the National Historical Archives of Belarus). *Belaruski arheagrafichny shtogodnik*. 2018;19:51–60. Belarusian.
2. Antanovich ZV. *Arhivy Magiljowskaj i Minskaj rymska-katalickih kansistoryj: gistoryja, struktura, sklad dakumentaw (1782–1918 gg.)* [Mohilev' and Minsk' roman-catholic consistories' archives: history, structure, content of documents (1782–1918)]. Minsk: Ekoperspektiva; 2016. 226 p. Belarusian.
3. Vladimirov VN, Chibisov ME. Clerics Statements as a Source for the Study of Kolyvano-Voskresensky (Altay) Mountain District Parish Clergy. *Izvestiya Altaiskogo gosudarstvennogo universiteta. Istoriya*. 2014;4:59–63. DOI: 10.14258/izvasu(2014)4.1-08. Russian.
4. Vsevolodov AV. *Pravoslavnoe prikhodskoe dukhovenstvo v 1840-e – 1880-e gg.: material'noe obespechenie, korporativnaya organizatsiya, samosoznanie (na materialakh Vologodskoi eparkhii)* [Orthodox parish clergy in the 1840–1880s: material support, corporate organization, self-awareness: based on materials from the Vologda diocese] [dissertation]. Cherepovets: Cherepovets State University; 2014. 377 p. Russian.
5. Mangileva AV. The Orthodox clergy of the Irbit in the first third of the 19th century (based on clergy lists). *Vestnik Chelyabinskogo gosudarstvennogo universiteta. Istoriya*. 2011;1:114–123. Russian.
6. Spichak AV. Evolution of clerical lists registration in Tobolsk Eparchy in 18th – beginning of 20th centuries. *Nauchnyi dialog*. 2015; 12:328–338. Russian.
7. Zayonchkovsky PA. *Pravitel'stvennyi apparat samoderzhavnoi Rossii v XIX veke* [The government apparatus of autocratic Russia in the 19th century]. Moscow: Mysl'; 1978. 288 p. Russian.
8. Tolstoy DA. *Rimskii katolitsizm v Rossii. Tom 1* [Roman Catholicism in Russia. Volume 1]. Saint Petersburg: Tipografiya V. F. Demakova; 1876. 178 p. Russian.
9. Boudou A. *Stolica Swięta a Rosja: dyplomatyczne stosunki między niemi w XIX stuleciu. T. 1: 1814–1847*. Kraków: Wydawnictwo księży Jezuitów; 1928. 608 s.
10. Gorbacheva OV. 1863–1864 uprising and repressive measures of Tsarism in Belarus. In: *Powstanie styczniowe 1863–1864. Wałka i uczęstnicy. Represje i wygnanie. Historiografia i tradycja.* Kielce: Wydawnictwo Akademii Świętokrzyskiej; 2005. p. 111–117. Russian.
11. Niebelski E. *Tunka: syberyjskie losy księży zesłańców 1863 roku*. Wrocław: Polskie Towarzystwo Ludoznawcze; 2011. 394 s.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 23.12.2019.*
*Received by editorial board 23.12.2019.*

*УДК [94(476):34]«1797/1840»*

# СУДЕБНАЯ СИСТЕМА НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ В 1797–1840 гг.

***И. Г. ГУЩИНСКИЙ***[1)]

[1)]*Белорусский государственный педагогический университет им. Максима Танка, ул. Советская, 18, 220030, г. Минск, Беларусь*

Исследуется судебная система, которая действовала на территории Беларуси в 1797–1840 гг., т. е. в период от преобразований Павла I до упразднения Николаем I местных особенностей в сфере правосудия, внедрения российской модели судоустройства и судопроизводства. В это время судебная система края заметно отличалась от той, которая существовала во внутренних губерниях Российской империи. Она совмещала в себе местную судебно-правовую традицию времен Великого княжества Литовского и Речи Посполитой и нормы российского законодательства. Данная судебная система действовала, хотя и с некоторыми изменениями, более трех десятилетий, пока под влиянием восстания 1830–1831 гг. самодержавие не перешло к ликвидации местных особенностей в судебно-правовой сфере.

***Ключевые слова:*** судебная система; судоустройство; судопроизводство; Статут Великого княжества Литовского 1588 г.; западные губернии; Российская империя.

***Благодарность.*** Автор выражает благодарность доктору исторических наук профессору кафедры истории Беларуси и славянских народов Белорусского государственного педагогического университета имени Максима Танка Анатолию Павловичу Житко за помощь в подготовке статьи.

# СУДОВАЯ СІСТЭМА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў 1797–1840 гг.

***І. Г. ГУШЧЫНСКІ***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, вул. Савецкая, 18, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Даследуецца судовая сістэма, якая дзейнічала на тэрыторыі Беларусі ў 1797–1840 гг., гэта значыць у перыяд ад пераўтварэнняў Паўла I да скасавання Мікалаем I мясцовых асаблівасцей у сферы правасуддзя і ўкаранення расійскай мадэлі судаўладкавання і судаводства. У гэты час судовая сістэма краю значна адрознівалася ад той, якая існавала ва ўнутраных губернях імперыі. Яна сумяшчала ў сабе мясцовую судова-прававую традыцыю часоў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай і нормы расійскага заканадаўства. Дадзеная судовая сістэма дзейнічала, хаця і з некаторымі зменамі, больш за тры дзесяцігоддзі, пакуль пад уплывам паўстання 1830–1831 гг. самадзяржаўе не перайшло да ліквідацыі мясцовых асаблівасцей у судова-прававой сферы.

***Ключавыя словы:*** судовая сістэма; судаўладкаванне; судаводства; Статут ВКЛ 1588 г.; заходнія губерні; Расійская імперыя.

***Падзяка.*** Аўтар выказвае падзяку доктару гістарычных навук прафесару кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Анатолію Паўлавічу Жытко за дапамогу ў падрыхтоўцы артыкула.

**Образец цитирования:**
Гушчынскі ІГ. Судовая сістэма на тэрыторыі Беларусі ў 1797–1840 гг. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2020;2:19–30.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2020-2-19-30

**For citation:**
Hushchynski IH. The judicial system in the territory of Belarus in 1797–1840. *Journal of the Belarusian State University. History.* 2020;2:19–30. Belarusian.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2020-2-19-30

**Автор:**
***Игорь Геннадьевич Гущинский*** – кандидат исторических наук, доцент; заместитель декана по учебной работе факультета дошкольного образования.

**Author:**
***Ihar H. Hushchynski***, PhD (history), docent; deputy dean for academic affairs at the pre-school faculty.
*hushchynski@gmail.com*
*https://orcid.org/0000-0001-6866-7723*

Журнал Белорусского государственного университета. История. 2020;2:19–30
Journal of the Belarusian State University. History. 2020;2:19–30

# THE JUDICIAL SYSTEM IN THE TERRITORY OF BELARUS IN 1797–1840

*I. H. HUSHCHYNSKI*[a]

[a]*Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank, 18 Savieckaja Street, Minsk 220030, Belarus*

The article presents the study of the judicial system that operated on the territory of Belarus from 1797–1840, i. e., from the time of Paul I reforms to the abolition of local features in the sphere of justice by Nikolai I and the introduction of the Russian model of judicial system and legal proceedings. At this time, the judicial system of the region was significantly different from that in the inner provinces of the empire. In this judicial system, retaining of the local judicial legal tradition of the times of the Grand Duchy of Lithuania and the Polish-Lithuanian Commonwealth was combined with the use of Russian law. This judicial system has been operating, albeit with some changes, for more than 3 decades, while under the influence of the anti-Russian uprising of 1830–1831 the autocracy did not proceed to eliminate local features in the judicial sphere. This judicial system has operated, albeit with some changes, for more than 3 decades – until when under the influence of the uprising of 1830–1831 the autocracy proceed to eliminate local features in the judicial sphere.

***Keywords:*** judicial system; judiciary; legal proceedings; Third Statute of the Grand Duchy of Lithuania; the Western Provinces; the Russian Empire.

***Acknowledgements.*** The author is grateful to Anatoly Pavlovich Zhitko, doctor of science, professor at the department of history of Belarus and Slavic peoples of the Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank for assistance in preparing the article.

## Уводзіны

Пасля далучэння тэрыторыі Беларусі да Расійскай імперыі ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай расійскімі ўладамі праводзіліся мерапрыемствы па ўкараненні тут агульнаімперскай мадэлі мясцовага кіравання і суда. Галоўнае месца сярод іх займала ўвядзенне заканадаўчага акта «Учреждения для управления губерний Всероссийской империи» (далей – «Учреждения...»), падпісанага 7 лістапада 1775 г. Кацярынай II, які вызначаў сістэму мясцовага кіравання і суда ў краіне. На той частцы тэрыторыі Беларусі, якая была ўключана ў склад Расійскай імперыі пасля першага і другога падзелаў Рэчы Паспалітай, ён быў уведзены ў 1778 і 1795 гг. адпаведна. На землях, далучаных у выніку трэцяга падзелу, адкрыццё судовых і адміністрацыйных устаноў, паводле «Учреждений...», было запланавана на канец 1796 г. Аднак з-за смерці Кацярыны II у лістападзе 1796 г. гэтага так і не адбылося. Пераемнік імператрыцы Павел I замест правядзення ранейшай фарсіравана ўніфікатарскай палітыкі ўзяў курс на захаванне ці ўзнаўленне тут парадкаў часоў ВКЛ і Рэчы Паспалітай. У першую чаргу гэта датычылася судовай сістэмы. Павел I захаваў у заходніх губернях дзеянне мясцовага права (Статута ВКЛ 1588 г. і сеймавых канстытуцый Рэчы Паспалітай), а таксама аднавіў, хаця і не ў поўнай ступені, сістэму судовых органаў часоў ВКЛ. У выніку дадзеных пераўтварэнняў у краі сфарміравалася судовая сістэма, якая значна адрознівалася ад расійскай. Яна дзейнічала, хаця і з некаторымі зменамі, на працягу больш як трох дзесяцігоддзяў, пакуль пад уплывам паўстання 1830–1831 гг. самадзяржаўе не перайшло да ліквідацыі мясцовых асаблівасцей у судова-прававой сферы. Дадзены працэс адбываўся паэтапна. На ўсёй тэрыторыі Беларусі расійская мадэль судовай сістэмы ўкаранілася ў 1840 г.

Судовая сістэма, як і ва ўсе часы, у 1797–1840 гг. адыгрывала важную ролю ў жыцці грамадства на тэрыторыі Беларусі. У дадзены перыяд асаблівасці судова-прававога ладу з'яўляліся адным з галоўных фактараў, які вызначаў спецыфіку сацыяльна-эканамічнага развіцця і грамадскага жыцця краю ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі Расійскай імперыі. Таму, натуральна, судовая сістэма, якая дзейнічала ў той час на беларускіх землях, была разгледжана ў вялікай колькасці абагульняючых навуковых прац і вучэбных выданняў па гісторыі Беларусі і гісторыі дзяржавы і права. Дадзенай тэме ці асобным яе аспектам прысвечаны шэраг спецыяльных даследаванняў [1–7]. Таксама праблема судовай сістэмы краю разглядаемага перыяду закраналася даследчыкамі пры вывучэнні гісторыі адміністрацыйнага кіравання [8], чыноўніцтва [9; 10], гарадоў [11]. Папярэднія даследаванні дазволілі сабраць значны пласт інфармацыі, якая служыць базай для далейшага вывучэння судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Тым не менш аналіз сучаснага ўзроўню распрацаванасці дадзенай праблемы паказаў, што яна раскрыта ў навуковай літаратуры ў значнай ступені схематычна і фрагментарна. У якасці крыніцы інфармацыі аб судовай сістэме выкарыстоўваліся пераважна заканадаўчыя акты, хаця яны

далёка не ў поўнай ступені адлюстроўвалі рэальны стан судаўладкавання і судаводства. Некаторыя аспекты дадзенай праблемы наогул засталіся практычна не раскрытымі ў гістарыяграфіі (напрыклад, кампрамісарскія і падкаморскія суды, адрозненні ў судаўладкаванні розных губерняў). Таму далейшае вывучэнне судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі ў 1797–1840 гг. захоўвае сваю **актуальнасць**.

**Мэтай** прадстаўленага ў дадзеным артыкуле даследавання з'яўляецца ўстанаўленне мадэлі судаўладкавання і раскрыццё асноўных сутнасных характарыстык судаводства на тэрыторыі Беларусі ў перыяд ад пераўтварэнняў у судовай сістэме краю, праведзеных Паўлам I, да канчатковага скасавання тут мясцовых асаблівасцей у сферы правасуддзя ў 1840 г. Дасягненне дадзенай мэты прадугледжвае вырашэнне наступных даследчых задач: паказаць змены ў судовай сістэме на тэрыторыі Беларусі ў перыяд праўлення Паўла I; раскрыць функцыі і склад розных судовых органаў; вызначыць прававую базу, на падставе якой дзейнічалі суды; выявіць адрозненні ў арганізацыі сферы правасуддзя ў розных губернях; ахарактарызаваць ролю генерал-губернатараў і губернатараў у судовай сістэме. Вырашэнне гэтых задач будзе садзейнічаць больш глыбокаму асэнсаванню сацыяльна-палітычных працэсаў, палітыкі самадзяржаўя і ўвогуле ўсебаковаму вывучэнню гісторыі Беларусі акрэсленага перыяду.

## Метадалогія даследавання

Прадстаўленае ў дадзеным артыкуле даследаванне базіруецца на тэарэтыка-метадалагічных прынцыпах гістарызму, аб'ектыўнасці, сістэмнага аналізу і каштоўнаснага падыходу. Непасрэдным інструментарыем дасягнення даследчай мэты сталі як агульнанавуковыя (аналіз і сінтэз, індукцыя і дэдукцыя і г. д.), так і канкрэтна-гістарычныя метады (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны). Гэта дазволіла ўстанавіць мадэль судовай сістэмы, якая дзейнічала на тэрыторыі Беларусі ў 1797–1840 гг. Крыніцазнаўчую базу даследавання склалі заканадаўчыя акты Расійскай імперыі, дакументы судовых і адміністрацыйных устаноў з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ), а таксама фактычныя звесткі аб судаўладкаванні і судаводстве ў заходніх губернях у разглядаемы перыяд, якія ўтрымліваюцца ў працах вядомага правазнаўца таго часу Аляксандра Каравіцкага (1797–1864) [5; 6; 12].

## Вынікі і іх абмеркаванне

**Змены ў судовай сістэме на тэрыторыі Беларусі ў перыяд праўлення Паўла I.** 12 снежня 1796 г. Павел I падпісаў указ аб новым падзеле дзяржавы на губерні[1]. Важным палажэннем дакумента было прызнанне за так званымі заходнімі губернямі (гэта значыць тэрыторыямі, далучанымі да Расійскай імперыі ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай) асобых правоў і прывілеяў, адным з праяўленняў чаго неўзабаве стала аднаўленне тут у агульных рысах сістэмы судаўладкавання часоў ВКЛ. Таксама ўказ ад 12 снежня 1796 г. прадугледжваў аб'яднанне Магілёўскай і Полацкай губерняў у адну Беларускую губерню з цэнтрам у Віцебску, а таксама стварэнне Літоўскай губерні з цэнтрам у Вільні замест планаваных асобных Віленскай і Слонімскай губерняў. Пазней, у 1801–1802 гг., адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел краю зноў змяніўся: Беларуская губерня была падзелена на Віцебскую і Магілёўскую, а Літоўская – на Віленскую і Гродзенскую[2].

Паводле зацверджаных 31 снежня 1796 г. Паўлам I штатаў адміністрацыйных і судовых устаноў[3], а таксама ўказа ад 6 лютага 1797 г. аб утварэнні Літоўскай губерні[4], у заходніх губернях прадугледжвалася сістэма судаўладкавання, набліжаная да той, якая тут існавала да падзелаў Рэчы Паспалітай. Нагадаем, судовая сістэма ВКЛ мела двухступеньчатую структуру і складалася з мясцовых судоў, якія дзейнічалі на ўзроўні павета ці горада (земскія, гродскія, падкаморскія, магістрацкія і некаторыя іншыя суды), і Трыбунала ВКЛ (Галоўнага суда) як апеляцыйнай інстанцыі [13]. Судаўладкаванне ў заходніх губернях пасля пераўтварэнняў Паўла I таксама складалася з судоў дзвюх інстанцый (гл. малюнак). Суды першай інстанцыі дзейнічалі на ўзроўні павета ці горада, а апеляцыйнай судовай інстанцыяй з'яўляліся галоўныя суды, якія знаходзіліся ў губернскіх гарадах. Рашэнні галоўных судоў можна было абскардзіць у Сенаце Расійскай імперыі. Акрамя падзелу на інстанцыі, ёсць і іншая прыкмета для тыпалагізацыі судовых органаў краю ў разглядаемы перыяд. Суды былі двух тыпаў – звычайныя (ардынарныйныя) і надзвычайныя (экстраардынарыйныя) [5]. Да звычайных судоў адносіліся ўста-

[1]Полное собрание законов Российской империи с 1649 г. (далее – ПСЗРИ). Собр. 1 : в 45 т. СПб. : Тип. 2-го отд-ния собств. ЕИВ канцелярии, 1830–1851. Т. 24 : 1796–1797. № 17634.
[2]Там же. Т. 26 : 1800–1801. № 20004 ; Т. 27 : 1802–1803. № 20162.
[3]Там же. Т. 44 : Кн. штатов. Ч. 2. Отд-ние 4. К № 17702.
[4]Там же. Т. 24 : 1796–1797. № 17788.

новы, якія мелі канкрэтнае месцазнаходжанне і вызначаны на пэўны тэрмін склад, разглядалі любыя справы ў межах сваёй юрысдыкцыі. Пры гэтым звычайныя суды павятовага ўзроўню (земскія, гродскія, земскія павятовыя) вялі разбор спраў не круглы год, а паводле прынцыпу сесій (кадэнцый, рочкаў). Надзвычайныя суды адрозніваліся ад звычайных тым, што ствараліся па рашэнні звычайных судоў для разбору канкрэтнай справы, адпаведна, справы яны не распачыналі і не мелі ўласнага памяшкання.

Склад судоў у заходніх губернях выбіраўся дваранствам ці гарадскімі саслоўнымі групамі (акрамя пасад саветнікаў у галоўных судах, якія прызначаліся ад урада). Першапачаткова расійскія ўлады дазволілі праводзіць выбары на падставе мясцовых традыцый. Гэта азначала, што канкрэтны тэрмін заняцця пасад не абмяжоўваўся. Аднак у 1802 г. на заходнія губерні было распаўсюджана правіла аб правядзенні выбараў кожныя 3 гады, як гэта прадугледжвалася «Учреждениями...»[5]. Для ўдзелу ў дваранскіх выбарах дапускаліся не ўсе дваране павета. Для гэтага быў вызначаны дастаткова высокі маёмасны цэнз, а пазней уводзілася яшчэ і патрабаванне мець класны чын, атрыманы на ваеннай ці грамадзянскай дзяржаўнай службе [14].

Судовая сістэма, якая сфарміравалася ў заходніх губернях у выніку пераўтварэнняў Паўла I, дзейнічала (з невялікімі карэкціроўкамі) да 1831 г., калі пад уплывам паўстання ўлада прыняла меры па ліквідацыі мясцовых асаблівасцей у судовай сістэме[6]. У Віцебскай і Магілёўскай губернях яны былі цалкам скасаваны. У Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губернях на дадзеным этапе ўрад фактычна абмежаваўся прысваеннем судовым установам назваў іх расійскіх аналагаў. Разам з тым у гэтых губернях да 1840 г.[7] працягваў дзейнічаць Статут ВКЛ 1588 г., у судаводстве магла выкарыстоўвацца польская мова, існаваў інстытут адвакатуры, захоўваліся спецыфічныя суды, якіх не было ва ўнутраных губернях (эксдывізарскія, кампрамісарскія і ўведзеныя з 1810 г. межавыя).

**Земскія павятовыя, земскія і гродскія суды.** У паветах асноўнымі судовымі ўстановамі былі альбо земскія павятовыя суды (у Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губернях), альбо асобныя земскія і гродскія суды (у Гродзенскай і Віленскай губернях). Яны мелі ўласнае памяшканне, выбарны на пэўны тэрмін склад, вызначаныя тэрміны працы.

Земскія павятовыя суды, якія дзейнічалі ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях, былі падобныя на земскія суды часоў ВКЛ і лічыліся іх пераемнікамі. Аднак па шэрагу важных прыкмет яны былі прыведзены ў адпаведнасць з расійскімі павятовымі (*уездными*) судамі. Так, земскія павятовыя суды разглядалі як крымінальныя, так і грамадзянскія справы, хаця ў часы ВКЛ кампетэнцыя земскіх судоў абмяжоўвалася грамадзянскімі справамі, а на крымінальных спецыялізаваліся асобныя гродскія суды. Склад земскіх павятовых судоў Віцебскай, Магілёўскай і Віцебскай губерняў выбіраўся мясцовым дваранствам і практычна адпавядаў складу колішніх земскіх судоў: у іх уваходзілі земскі суддзя, двое падсудкаў (асэсары), пі-




Сістэма судовых устаноў на тэрыторыі Беларусі ў 1797–1831 гг.
The court system in the territory of Belarus in 1797–1831

[5]ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 27 : 1802–1803. № 20273.
[6]Там же. Собр. 2 : в 55 т. СПб. : Тип. 2-го отд-ния собств. ЕИВ канцелярии, 1830–1884. Т. 6 : 1831. Отд-ние 1. № 4233 ; Отд-ние 2. № 4894.
[7]Там же. Т. 15 : 1840. Отд-ние 1. № 13591.

сар (натарый) і некалькі возных (выконвалі функцыі судовага прыстава)[8]. У складзе земскіх павятовых судоў, у адрозненне ад расійскіх *уездных*, не прадугледжваліся засядацелі ад непрыватнаўласніцкіх сялян[9]. Аднак галоўная спецыфіка гэтых судоў, як і наогул усіх мясцовых судоў заходніх губерняў, заключалася ў выкарыстанні мясцовага права (пераважна ў сферы грамадзянскага судаводства). Адзначым, што земскія павятовыя суды ў дакументах часта называліся проста павятовымі ці земскімі[10]. Назва «земскія» ўказвала на іх пераемнасць з былымі земскімі судамі часоў ВКЛ, «павятовыя» – на іх адпаведнасць расійскім *уездным* судам. Фармальна земскія павятовыя суды павінны былі ажыццяўляць сваю дзейнасць паводле перыядычнага прынцыпу: весці разбор спраў не пастаянна, а збірацца 3 разы на год на шасцітыднёвыя сесіі (кадэнцыі)[11]. Тэрміны правядзення кадэнцый захоўваліся тыя ж, што былі ў земскіх судах ВКЛ. Іх пачатак суадносіўся з каталіцкімі святамі, ад якіх яны атрымалі назвы (Трохкаралеўская, Троіцкая і Міхальская кадэнцыі). Земскія павятовыя суды павінны былі дзейнічаць толькі ў студзені – лютым, маі – ліпені і кастрычніку – лістападзе [5]. Аднак з той прычыны, што земскія павятовыя суды, у адрозненне ад былых земскіх, разглядалі не толькі грамадзянскія, але і крымінальныя справы, ім фактычна даводзілася дзейнічаць круглы год[12]. Справа ў тым, што земскія павятовыя суды былі абавязаны збірацца для разбору крымінальнай справы адразу па яе паступленні, нават па-за тэрмінамі кадэнцый[13], і пры гэтым не маглі пад пагрозай прыцягнення да крымінальнай адказнасці спыняць працу, пакуль не будуць вырашаны ўсе крымінальныя справы, якія паступілі [7].

Што датычыцца Віленскай і Гродзенскай губерняў, то тут асноўнымі судовымі ўстановамі павятовага ўзроўню былі, як і ў часы ВКЛ, земскія і гродскія суды. Яны знаходзіліся ў павятовых гарадах і размяшчаліся, як правіла, у адным будынку альбо побач. Земскія і гродскія суды складаліся з выбарных ад мясцовага дваранства старшыні (прэзідэнта), трох-чатырох суддзяў, пісара і аднаго-двух возных [5; 6]. Земскія суды разглядалі грамадзянскія справы. Яны засядалі падчас кадэнцый, тэрміны якіх былі такімі ж, як у згаданых вышэй земскіх павятовых судоў [5]. Гродскія суды спецыялізаваліся на крымінальных справах, але маглі разглядаць і грамадзянскія. Яны, як і земскія суды, працавалі не пастаянна, а паводле прынцыпу сесій, якія называліся рочкамі. Гродскія суды збіраліся 4 разы на год і працавалі на працягу месяца (у сакавіку, маі, верасні і снежні) [5]. Дадзеныя тэрміны практычна супадалі з перыядамі паміж кадэнцыямі земскіх судоў, што дазваляла забяспечваць функцыянаванне правасуддзя ў павеце на працягу ўсяго года.

Выбарным ад мясцовага дваранства земскім павятовым, земскім і гродскім судам былі падсудныя не толькі дваране, але і іншыя катэгорыі негарадскога насельніцтва, таму сялян судзілі суддзі выключна з ліку дваран.

**Падкаморскія і маршалкаўска-камісарскія суды.** У паветах таксама прадугледжваліся спецыяльныя судовыя органы для разбору спрэчак аб межах зямельных уладанняў – падкаморскія суды, якія дзейнічалі ў ВКЛ яшчэ з часоў Статута ВКЛ 1566 г. Дадзеныя суды адносіліся да тыпу надзвычайных (экстраардынарыйных) [5]. Яны не мелі памяшкання і ўступалі ў паўнамоцтвы толькі на перыяд разбору канкрэтнай межавой спрэчкі. Самі судовыя справы першапачаткова ўзнікалі, як правіла, у земскіх павятовых (земскіх) судах альбо грамадзянскіх дэпартаментах галоўных судоў, а ўжо затым накіроўваліся для вырашэння ў падкаморскі суд[14]. Падкаморскія суды складаліся з выбарных ад мясцовага дваранства падкаморыя, каморніка і align вознага[15]. У якасці месца судовага працэсу звычайна прызначаўся з узаемнай згоды суцяжнікаў адзін з маёнткаў, межы якога з'яўляліся прадметам спрэчкі[16]. Апеляцыі на рашэнні падкаморскіх судоў падаваліся ў грамадзянскія дэпартаменты галоўных судоў. Там прымалася рашэнне аб стварэнні судовай прысутнасці для разгляду апеляцыі. Такі суд называўся маршалкаўскім, камісарскім або маршалкаўска-камісарскім. У яго склад уваходзілі маршалак адпаведнага павета (у якасці старшыні суда), а таксама некалькі членаў, якія выбіраліся бакамі па ўзаемнай згодзе. Рашэнне маршалкаўскага суда лічылася канчатковым і не падлягала апеляцыі (за выключэннем выпадкаў, калі справа датычылася казённай маёмасці)[17].

Мяркуючы па інфармацыі дакументаў, якія захаваліся ў НГАБ, падкаморскія суды былі запатрабаваны галоўным чынам у Гродзенскай, Віленскай і Мінскай губернях. Што датычыцца Віцебскай і Магілёўскай губерняў, то матэрыялаў судовых спраў падкаморскіх судоў у ходзе даследавання выявіць

[8]ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 44 : Кн. штатов. Ч. 2. Отд-ние 4. К № 17702. С. 397–398 ; к № 24985. С. 225.
[9]Там же. К № 24985. С. 222.
[10]Там же. К № 17702. С. 397.
[11]Там же. Т. 24 : 1796–1797. № 18135.
[12]НГАБ. Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 144. Арк. 11.
[13]ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 24 : 1796–1797. № 18135.
[14]НГАБ. Ф. 1834. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 1, 20.
[15]ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 44 : Кн. штатов. Ч. 2. Отд-ние 4. К № 17702. С. 397.
[16]НГАБ. Ф. 1834. Воп. 1. Спр. 2. Арк. 1а.
[17]Там жа. Ф. 588. Воп. 2. Спр. 47. Арк. 1–2.

не ўдалося, хаця пасады падкаморыяў тут існавалі[18]. Найбольш верагодна, гэта звязана з тым, што ва ўсходняй частцы Беларусі, далучанай да Расійскай імперыі ў 1772 г., у першай палове 1780-х гг. расійскімі ўладамі была рэалізавана дзяржаўная праграма межавання зямель [15]. У той жа час у Рэчы Паспалітай, хаця аналагічны план і быў ухвалены ў 1788 г. Чатырохгадовым сеймам, яго не ажыццявілі [12]. Адпаведна, у Мінскай, Віленскай і Гродзенскай губернях праблема спрэчак аб межах уладанняў стаяла больш востра. Таму ў 1810–1812 гг. тут была створана цэлая сістэма межавых судоў[19]. Падкаморскія суды фармальна праіснавалі да 1832 г.[20]

**Магістраты і ратушы.** У гарадах функцыі суда першай інстанцыі выконвалі магістраты ці ратушы. Іх уладкаванне на тэрыторыі заходніх губерняў у заканадаўстве было адлюстравана невыразна. У штатах губерняў у графе «городовые магистраты» было пазначана, што яны існуюць за кошт гарадоў на іх правах і прывілеях[21]. Гэта азначала, што ў заходніх губернях маглі працягваць дзейнічаць на папярэдніх умовах магістраты, якія існавалі з часоў надзялення адпаведных гарадоў Магдэбургскім правам ці іншымі прывілеямі на самакіраванне. На практыцы склалася сітуацыя, калі ў розных гарадах краю магістраты мелі рознае ўладкаванне.

У Віцебскай і Магілёўскай губернях дзейнічалі гарадавыя магістраты і ратушы расійскага ўзору, уведзеныя тут яшчэ ў 1778 г. у адпаведнасці з «Учреждениями…» Кацярыны II. Гарадавыя магістраты былі ў павятовых гарадах, ратушы, – як правіла, у заштатных. Паводле «Учреждений…», гарадавыя магістраты складаліся з двух бургамістраў і чатырох ратманаў, якія выбіраліся ад купецтва і мяшчанства тэрмінам на 3 гады. Для разгляду справы было дастаткова прысутнасці аднаго бургамістра і двух ратманаў. У гарадскіх паселішчах з колькасцю насельніцтва да 500 душ ратушы маглі ўвогуле складацца з аднаго бургамістра і двух ратманаў. У адрозненне ад земскіх павятовых судоў магістраты ажыццяўлялі правасуддзе круглы год[22]. Пры гарадавых магістратах працягвалі дзейнічаць спецыяльныя суды для гандлёвых спраў – славесныя суды. Мяркуючы па дакументах, яны складаліся з двух выбарных суддзяў – ад хрысціян і яўрэяў[23]. Таксама пры гарадавых магістратах па-ранейшаму дзейнічалі сірочыя суды, якія разглядалі справы па апецы над малалетнімі сіротамі і ўдовамі [16].

У Мінскай губерні таксама дзейнічалі гарадавыя магістраты і ратушы, уведзеныя тут на падставе «Учреждений…» у 1795 г. Аднак, у адрозненне ад унутрырасійскіх губерняў, тут іх склад быў дапоўнены пасадамі лаўнікаў, якія ўваходзілі ў папярэднія магістраты, створаныя на падставе Магдэбургскага права [17]. Прычым гэта датычылася не толькі гарадоў, у якіх на момант уключэння ў склад Расійскай імперыі існавалі такія магістраты (Мінск, Пінск, Мазыр, Дзісна, Слуцк і Нясвіж [18]), але і іншых[24]. Яшчэ адной асаблівасцю мясцовых магістратаў была наяўнасць трэцяга бургамістра – ад яўрэйскай часткі насельніцтва горада[25].

Запланаванае на канец 1796 г. увядзенне расійскай мадэлі судаўладкавання на тэрыторыі Літоўскай губерні было адменена Паўлам I. У сувязі з гэтым у гарадах, дзе на той момант дзейнічала Магдэбургскае права, правасуддзе яшчэ нейкі час ажыццяўлялася папярэднімі магістратамі [11]. Прынамсі, гэта датычыла Вільні, Гродна, Коўна, Брэста, Навагрудка, Трокаў, Ліды і Ваўкавыска[26]. Магістрацкі суд тут мог быць двух відаў – войтаўскі (войтаўска-лаўніцкі) і бурмістарскі (радзецкі, бурмістарска-радзецкі). Крымінальныя і найбольш значныя грамадзянскія справы разбіраліся войтам і лаўнікамі (войтаўска-лаўніцкі суд). Справы па дробных крымінальных праступках, нязначных грамадзянскіх спрэчках, а таксама пытанні аб апякунстве маглі вырашацца бурмістарска-радзецкім судом, які складаўся з бурмістра (прэзідэнта) і некалькіх радцаў. У дробных гарадах і мястэчках такога дзялення магло не быць: там дзейнічалі адзіныя магістрацкія суды [5]. Вядома, што, напрыклад, у Навагрудку войтаўска-лаўніцкі суд дзейнічаў прынамсі да пачатку другога дзесяцігоддзя XIX ст.[27] Аднак з цягам часу суды ў гарадах Гродзенскай і Віленскай губерняў па складзе і структуры сталі адпавядаць расійскаму ўзору. Мяркуючы па тэксце кнігі вядомага правазнаўца таго часу Аляксандра Каравіцкага «Літоўскі грамадзянскі працэс» (*Proces cywilny litewski*, 1826), на момант яе выдання магістраты і ратушы фарміраваліся тут ужо на падставе «Учреждений…».

**Кампрамісарскія і эксдывізарскія суды.** Акрамя згаданых вышэй падкаморскіх судоў, да тыпу надзвычайных адносіліся таксама кампрамісарскія і эксдывізарскія суды [5]. Яны ствараліся па рашэнні судоў першай інстанцыі (земскіх павятовых, земскіх, гродскіх судоў, магістратаў) ці галоўных судоў для разбору канкрэтнай справы.

[18]НГАБ. Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 1280.
[19]ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 31 : 1810–1811. № 24370, 24655 ; Т. 32 : 1812–1814. № 25005.
[20]Там же. Собр. 2. Т. 7 : 1832. № 5068.
[21]Там же. Собр. 1. Т. 44 : Кн. штатов. Ч. 2. Отд-ние 4. К № 24985. С. 228–231.
[22]Там же. Т. 20 : 1775–1780. № 14392.
[23]НГАБ. Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 2720. Арк. 5 адв.
[24]Там жа. Ф. 156. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 230 адв. Ф. 1832. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 1–15.
[25]Там жа. Ф. 156. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 230.
[26]ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 24 : 1796–1797. № 18266.
[27]НГАБ. Ф. 1820. Воп. 1. Спр. 4 ; Ф. 146. Воп. 2. Спр. 115. Арк. 15–16.

Кампрамісарскія суды, якія таксама называліся палюбоўнымі, па сваёй сутнасці з'яўляліся мясцовым варыянтам трацейскага суда. Для таго каб вырашыць спрэчку праз кампрамісарскі суд, бакі павінны былі заключыць адпаведную дамову і засведчыць яе ў мясцовым судзе першай інстанцыі. У склад кампрамісарскага суда ўваходзілі, як правіла, адзін суперарбітр, якога суцяжнікі выбіралі супольна, і па адным арбітры ад кожнага боку [5]. Рашэнне кампрамісарскага суда лічылася канчатковым, бо пры яго стварэнні бакі гарантавалі адзін аднаму, што не будуць рабіць спроб распачаць цяжбу па той жа справе ў звычайным судовым парадку[28].

Эксдывізарскія (эксдывізарска-таксатарскія) суды прызначаліся для разбору спраў аб падзеле маёмасці неплацежаздольных даўжнікоў паміж некалькімі крэдыторамі [5]. Дадзеныя суды ствараліся для разгляду канкрэтнай справы па рашэнні мясцовага суда першай інстанцыі ці грамадзянскага дэпартамента галоўнага суда. У склад эксдывізарскага суда ўваходзілі суддзі (эксдывізары), землямеры (каморнікі), а таксама сакратары для вядзення запісаў (рэгенты) [5]. Як правіла, было тры эксдывізары, адзін рэгент і некалькі (у залежнасці ад памеру маёнтка) каморнікаў. Пасяджэнні эксдывізарскага суда звычайна адбываліся на месцы знаходжання маёмасці, якую дзялілі. Рашэнне гэтага суда магло быць абскарджана ў грамадзянскім дэпартаменце галоўнага суда [2]. Фактычна разнавіднасцю эксдывізарскіх судоў былі ствараемыя па распараджэнні імператара спецыяльныя камісіі для разбору даўгоў некаторых буйных землеўладальнікаў (напрыклад, Дамініка Радзівіла) [19].

**Галоўныя суды.** Пасля пераўтварэнняў Паўла I судамі другой інстанцыі ў заходніх губернях сталі галоўныя суды, якія знаходзіліся ў губернскіх гарадах. Яны лічыліся пераемнікамі былога Трыбунала ВКЛ, які раней таксама называлі Галоўным судом [20]. Аднак па шэрагу важных параметраў галоўныя суды заходніх губерняў фактычна прыводзіліся ў адпаведнасць з расійскімі палатамі крымінальнага і грамадзянскага суда і значна адрозніваліся ад былога Трыбунала ВКЛ. Так, яны дзейнічалі на пастаяннай аснове, а не паводле прынцыпу з'ездаў на сесіі (кадэнцыі)[29]. Таксама ад колішняга Трыбунала ВКЛ галоўныя суды адрозніваліся тым, што яны дзяліліся на два дэпартаменты – крымінальны (першы) і грамадзянскі (другі). Фактычна гэта былі асобныя судовыя ўстановы, якія па сваіх функцыях адпавядалі палатам крымінальнага і грамадзянскага суда ўнутрырасійскіх губерняў. Склад галоўных судоў, у адрозненне ад Трыбунала ВКЛ, фарміраваўся як з прызначаемых ад урада чыноўнікаў, так і з выбарных ад мясцовага дваранства. Старшыні дэпартаментаў прызначаліся імператарам з ліку некалькіх выбраных мясцовым дваранствам кандыдатаў[30]. Акрамя старшынь, у склад кожнага з дэпартаментаў галоўных судоў уваходзілі адзін саветнік (прызначаўся Сенатам ад урада) і ад двух да чатырох засядацеляў (выбіраліся ад мясцовага дваранства)[31].

У Літоўскай губерні ў 1797–1801 гг. галоўны суд істотна адрозніваўся ад іншых. Ён, як і колішні Трыбунал ВКЛ, не дзяліўся на дэпартаменты і меў цалкам выбарны склад[32]. Што адметна, у сваёй дзейнасці Галоўны літоўскі суд паралельна выкарыстоўваў і назву «Літоўскі трыбунал» [5]. Акрамя Вільні, суд засядаў таксама ў Гродне[33]. Пасля таго як у верасні 1801 г. Літоўская губерня была падзелена на Віленскую і Гродзенскую, тут стварылі асобныя Віленскі і Гродзенскі галоўныя суды[34]. Яны ўжо мелі практычна такое ж уладкаванне, як і галоўныя суды іншых заходніх губерняў: дзяліліся на крымінальны і грамадзянскі дэпартаменты, а таксама ўключалі ў свой склад прызначаных ад урада суддзяў (двух саветнікаў), якіх у Галоўным літоўскім судзе не было[35]. Адрозненнем Гродзенскага і Віленскага галоўных судоў у параўнанні з Мінскім, Віцебскім і Магілёўскім галоўнымі судамі з'яўлялася большая колькасць выбарных ад дваранства засядацеляў – па чатыры ў кожным дэпартаменце, а не па два[36].

Асноўнай функцыяй крымінальных дэпартаментаў галоўных судоў была рэвізія прыгавораў па крымінальных справах судоў першай інстанцыі. Прынамсі, гэта датычылася ўсіх прыгавораў, якія прадугледжвалі для вінаватага грамадзянскую смерць, пазбаўленне гонару ці цялеснае пакаранне (акрамя яго лёгкіх форм за менш значныя праступкі) [6]. Рэвізія справы ў крымінальным дэпартаменце фактычна ўяўляла сабой новы яе разгляд, але на падставе ўжо наяўных матэрыялаў (допытаў, заключэнняў экспертаў, вынікаў вобыскаў і г. д.) [6][37]. Крымінальныя дэпартаменты галоўных судоў маглі выступаць і ў якасці суда першай інстанцыі, напрыклад, па справах аб злачынствах службовых асоб [7]. Рашэнні галоўных судоў па крымінальных справах перад прывядзеннем іх у выкананне мусілі быць адобраны губернскім пракурорам. Калі той апратэстоўваў прыгавор, справа накіроўвалася га-

[28]НГАБ. Ф. 588. Воп. 1. Спр. 206. Арк. 1–2.
[29]ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 24 : 1796–1797. № 18135.
[30]Там же. № 17789 ; Т. 26 : 1800–1801. № 19628.
[31]Там же. Т. 44 : Кн. штатов. Ч. 2. Отд-ние 4. К № 17702 ; к № 24985. С. 225 ; Т. 36 : 1819. № 28063 ; Т. 38 : 1822–1823. № 28862.
[32]Там же. Т. 24 : 1796–1797. № 17788.
[33]Там же. Т. 24 : 1796–1797. № 17788 ; Т. 25 : 1798–1799. № 18405, 18909.
[34]Там же. Т. 26 : 1800–1801. № 20096.
[35]Там же. Т. 44 : Кн. штатов. Ч. 2. Отд-ние 4. К № 24985. С. 226.
[36]Там же. С. 225–226.
[37]НГАБ. Ф. 76. Воп. 1. Спр. 19.

лоўнаму начальніку губерні (генерал-губернатару, вайсковаму ці грамадзянскаму губернатару) [6]. Па шэрагу катэгорый крымінальных спраў рашэнні галоўных судоў падлягалі абавязковай рэвізіі ў Сенаце (у адносінах да малалетніх, прыгавораных да грамадзянскай смерці дваран і чыноўнікаў, пры вынясенні прысуду больш чым 10 асуджаным і ў некаторых іншых выпадках) [6].

Грамадзянскія дэпартаменты галоўных судоў разглядалі апеляцыі на рашэнні судоў першай інстанцыі па грамадзянскіх цяжбах. Прычым справы, якія закраналі інтарэсы казны ці духавенства, маглі разглядацца ў другім дэпартаменце галоўнага суда толькі пасля атрымання па іх папярэдняга заключэння асоб пракурорскага нагляду [7]. Рашэнні грамадзянскіх дэпартаментаў галоўных судоў маглі быць абскарджаны ў Сенаце [7].

**Надворныя суды.** У 1797–1801 гг. у заходніх губернях існавалі так званыя надворныя суды[38]. Яны знаходзіліся ў Вільні (для Літоўскай губерні) і Жытоміры (для астатніх заходніх губерняў, у тым ліку Беларускай і Мінскай) [8]. У іх кампетэнцыю ўваходзіў разгляд рознага роду спраў, якія датычыліся гарадскіх прывілеяў ці казённых уладанняў. Надворныя суды складаліся на парытэтных пачатках з чыноўнікаў, прызначаных ад урада, і выбарных ад мясцовага дваранства. Апеляцыйнай інстанцыяй для гэтых судоў быў Сенат[39]. У лістападзе 1797 г. у Літоўскай губерні па хадайніцтве мясцовага ваеннага губернатара Мікалая Рэпніна да юрысдыкцыі надворнага суда былі аднесены справы аб службовых злачынствах чыноўнікаў. Да гэтага яны былі падсуднымі Галоўнаму літоўскаму суду, склад якога поўнасцю выбіраўся мясцовым дваранствам[40]. Хутчэй за ўсё, Мікалай Рэпнін сумняваўся ў яго бесстароннасці адносна рускіх чыноўнікаў. Літоўскі і Валынскі надворныя суды былі скасаваны ў канцы 1801 г.[41]

**Сістэма межавых судоў.** Як ужо адзначалася вышэй, у 1810–1812 гг. у Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губернях для разбору спрэчак аб межах зямельных уладанняў была створана цэлая сістэма межавых судоў (гл. малюнак). Гэта прадугледжвалася «Положением о размежевании Литовско-Виленской губернии» ад 6 кастрычніка 1810 г.[42] (у 1811 г. яго дзеянне было распаўсюджана на Гродзенскую губерню[43], а ў 1812 г. – на Мінскую[44]). У аснове дадзенага дакумента ляжаў план межавання зямель Рэчы Паспалітай, ухвалены Чатырохгадовым сеймам у 1788 г. [12].

Паводле «Положения о размежевании Литовско-Виленской губернии», сістэма межавых судоў выглядала наступным чынам. Дваранствам павета выбіраліся на трохгадовы тэрмін ад 15 да 21 межавых суддзяў. З іх ліку ў павятовым горадзе стваралася пастаянная судовая прысутнасць з пяці суддзяў (у адпаведнасці з вызначанай чаргой) – апеляцыйны межавы суд. Дадзеная судовая ўстанова прымала прашэнні аб разборы спрэчак, прызначала межавы суд першай інстанцыі, а таксама разглядала апеляцыі на рашэнні апошняга. Для разбору справы па першай інстанцыі апеляцыйным межавым судом праз жэрабя выбіраўся адзін з межавых суддзяў, прызначаліся сакратары (рэгенты) і каморнікі (землямеры), а ад суцяжнікаў прызначаліся арбітры. У вызначаны тэрмін удзельнікі суда прыбывалі на месца і ўжо там непасрэдна вяліся судовыя пасяджэнні (у адным з маёнткаў, які падлягаў размежаванню). Апеляцыі на рашэнні межавых судоў першай інстанцыі маглі разглядацца як па месцы знаходжання апеляцыйнага межавога суда (згаданай прысутнасцю з пяці суддзяў), так і з выездам на месца. У апошнім выпадку для вырашэння справы на месцы апеляцыйным судом накіроўваліся тры суддзі. Рашэнне апеляцыйнага межавога суда лічылася канчатковым і абскарджанню не падлягала[45].

Мяркуючы па ўсім, аб'ектыўнасць гэтых судоў нярэдка выклікала сумненні ў суцяжнікаў. Натуральна, унутры павета было складана пазбегнуць сітуацыі, калі ўзнікала падазрэнне, што хтосьці з суддзяў мог мець нейкія адносіны з адным з зацікаўленых бакоў і не быць бесстаронні пры вырашэнні справы. У сувязі з гэтым у канцы 1815 – 1816 г. у Гродзенскай, Мінскай і Віленскай губернях па просьбе мясцовага дваранства была ўведзена яшчэ і трэцяя інстанцыя межавых судоў – апеляцыйныя нармальныя суды (таксама іх называлі губернскімі апеляцыйнымі межавымі судамі). Яны разглядалі скаргі на пастановы павятовых апеляцыйных межавых судоў і прымалі канчатковыя рашэнні па справах. Апеляцыйныя нармальныя суды знаходзіліся ў губернскіх гарадах і складаліся з выбраных суддзяў (па адным ад кожнага павета)[46].

**Асаблівасці судаводства.** У сваёй дзейнасці судовыя ўстановы на тэрыторыі Беларусі ў разглядаемы перыяд сумяшчалі выкарыстанне мясцовага права (Статута ВКЛ 1588 г. і некаторых канстытуцый Сейма Рэчы Паспалітай) і расійскага заканадаўства.

[38]ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 24 : 1796–1797. № 17788, 18165.
[39]Там же. № 17788.
[40]Там же. № 18238.
[41]Там же. Т. 26 : 1800–1801. № 20096.
[42]Там же. Т. 31 : 1810–1811. № 24370.
[43]Там же. № 24655.
[44]Там же. Т. 32 : 1812–1814. № 25005.
[45]Там же. Т. 31 : 1810–1811. № 24655.
[46]Там же. Т. 33 : 1815–1816. № 26001, 26087, 26428.

Прымяненне расійскіх прававых норм у большай ступені датычылася крымінальных спраў. Крымінальны судовы працэс быў такім жа, як і ва ўнутраных губернях, – следчым (інквізіцыйным, вышуковым). Такі парадак судаводства азначаў, што разгляд справы судом ажыццяўляўся негалосна (за зачыненымі дзвярыма, без прысутнасці абвінавачанага) і, як правіла, выключна на падставе пісьмовых матэрыялаў папярэдняга следства, прадастаўленых паліцэйскімі органамі. Прынцып спаборнасці ў крымінальным судаводстве адсутнічаў, бо функцыі як абвінавачання, так і абароны браў на сябе сам суд. Адпаведна, гэта фактычна выключала ўдзел адвакатаў у судовым працэсе па крымінальных справах. У часы ВКЛ, наадварот, судаводства, у тым ліку і па крымінальных справах, мела выразныя рысы спаборнасці [13]. У разглядаемы перыяд пры вынясенні прыгавораў суды спасылаліся як на мясцовае права (галоўным чынам на Статут ВКЛ 1588 г.)[47], так і на расійскае заканадаўства (Соборное уложение 1649 г., Воинский устав 1715 г., Устав о благочинии 1782 г. і інш.)[48]. Пры гэтым галоўныя суды, у складзе якіх, акрамя дэпутатаў ад дваранства, былі прызначаны ад урада саветнікі, выкарыстоўвалі практычна толькі расійскае заканадаўства.

Грамадзянскае судаводства ў заходніх губернях, як і да далучэння краю да Расійскай імперыі, пераважна грунтавалася на нормах Статута ВКЛ 1588 г., а таксама сеймавых канстытуцый Рэчы Паспалітай. Судовы працэс меў выразныя рысы спаборнасці, працягваў функцыянаваць інстытут адвакатуры. Аднак для некаторых катэгорый грамадзянскіх спраў расійскімі ўладамі былі зроблены выключэнні. Напрыклад, у следчым парадку разглядаліся грамадзянскія справы, якія датычыліся інтарэсаў казны, спрэчак аб выхадзе з прыгоннай залежнасці, і некаторыя іншыя [5].

Паралельнае выкарыстанне мясцовых прававых норм і расійскага заканадаўства стварала сітуацыю своеасаблівага прававога дуалізму. У выніку ўзнікала блытаніна адносна падсуднасці спраў той ці іншай судовай установе, выкарыстання мясцовых ці расійскіх прававых норм, вядзення справаводства на польскай ці рускай мове і г. д.[49] За вырашэннем спрэчных сітуацый судовыя ўстановы, пракуроры і губернатары часта звярталіся ў Сенат.

Расійскія ўлады дазволілі выкарыстанне ў судах польскай мовы. На практыцы ўжывалася як польская, так і руская мова. У судах першай інстанцыі пераважала польская мова, асабліва гэта датычылася грамадзянскага судаводства. Што да галоўных судоў, то крымінальныя дэпартаменты вялі справаводства на рускай мове, а грамадзянскія выкарыстоўвалі разам з ёй і польскую. Ужыванне галоўнымі судамі рускай мовы было неабходным: па-першае, іх прыгаворы затым ішлі на зацвярджэнне губернатара ці вайсковага губернатара або на апеляцыю ў Сенат; па-другое, у склад гэтых судоў уваходзілі прызначаныя ад урада рускія чыноўнікі.

**Пракуратура.** Пасля далучэння тэрыторыі Беларусі да Расійскай імперыі тут укаранілася сістэма органаў пракурорскага нагляду. Яна ўвасаблялася ў пасадах пракурораў і стрapчых. Асноўнымі іх функцыямі з’яўляліся кантроль за выкананнем законнасці ў судаводстве, дзейнасцю службовых асоб, утрыманнем пад вартай арыштантаў і г. д. Пасля замены на імператарскім прастоле Кацярыны II Паўлам I структура пракуратуры была значна скарочана. З дастаткова разгалінаванай сістэмы пасад пракурораў і страпчых, прадугледжанай «Учреждениями…» 1775 г., былі пакінуты толькі губернскія пракуроры[50]. Аднак у 1799 г. для кантролю за працай судовых і адміністрацыйных устаноў у заходніх губернях былі ўведзены пасады фіскалаў[51]. У іх функцыі ўваходзіла правядзенне інспекцыі ўстаноў, прадухіленне цяганіны ў разглядзе спраў, рознага роду злоўжыванняў і г. д. Пры Аляксандру I былі аднаўлены пасады павятовых і губернскіх страпчых, а пасаду фіскалаў скасавалі [21]. Паводле штатаў губерняў 1802 г., на губернскім узроўні дзейнічалі губернскі пракурор і двое губернскіх страпчых (крымінальных і грамадзянскіх спраў), якія прызначаліся Сенатам. У паветах былі павятовыя страпчыя, якіх прызначала губернскае праўленне[52].

**Уплыў адміністрацыйнай улады на судовую сістэму.** Укараненне расійскай сістэмы мясцовага кіравання ў заходніх губернях, якое адбылося яшчэ падчас праўлення Кацярыны II, праявілася ў надзяленні адміністрацыйнай улады значнымі паўнамоцтвамі ў сферы правасуддзя, чаго не было ў часы ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Гэта засталося нязменным і пасля рэфармавання судовай сістэмы краю пры Паўле I, калі было часткова адноўлена судаўладкаванне часоў ВКЛ.

Губернскія начальнікі (генерал-губернатары, вайсковыя і грамадзянскія губернатары) маглі прымаць удзел непасрэдна ў выкананні правасуддзя, асабліва гэта датычылася крымінальнага судаводства. Генерал-губернатары (вайсковыя губернатары) маглі запатрабаваць вырашаную галоўным судом крымінальную справу на ўласную рэвізію. Звычайна такая практыка ўжывалася ў дачыненні да найбольш значных спраў ці выпадкаў, калі паступалі скаргі на дзеянні суда [6]. Губернскія началь-

[47]НГАБ. Ф. 76. Воп. 1. Спр. 78 ; Ф. 1601. Воп. 1. Спр. 2 ; Ф. 3215. Воп. 2. Спр. 35.
[48]Там жа. Ф. 76. Воп. 1. Спр. 19 ; Ф. 3215. Воп. 2. Спр. 11.
[49]Там жа. Ф. 3219. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 468.
[50]ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 44 : Кн. штатов. Ч. 2. Отд-ние 4. К № 17702.
[51]Там же. Т. 25 : 1798–1799. № 18955.
[52]Там же. Т. 20 : 1775–1780. № 14392 ; Т. 44 : Кн. штатов. Ч. 2. Отд-ние 4. К № 24985. С. 220, 223, 230.

нікі, у тым ліку грамадзянскія губернатары, сваім рашэннем маглі прыпыніць выкананне любога судовага прыгавору, калі лічылі яго няправільным, і накіраваць сваё меркаванне ў Сенат [6].

Мясцовае губернскае начальства па-ранейшаму мела ўплыў на фарміраванне кадравага складу судоў. Непасрэдна па ўказанні губернатараў ці губернскіх праўленняў у судовыя ўстановы прызначаўся персанал ніжэйшага звяна (канцылярскія служачыя, перакладчыкі, вартаўнікі)[53] [7]. Вынікі дваранскіх выбараў абавязкова праходзілі працэдуру зацвярджэння губернатарам. У сувязі з гэтым павятовыя прадвадзіцелі дваранства разам са спісамі выбраных кандыдатур падавалі губернатару звесткі аб іх асабістых якасцях і здольнасцях да службы[54]. Што датычыцца магчымага ўмяшання расійскіх улад у самі дваранскія выбары (у тым ліку на судовыя пасады), то губернскае начальства магло выказваць свае рэкамендацыі адносна кандыдатур [22]. Аднак звестак аб ціску на выбаршчыкаў ці нейкіх маніпуляцыях з боку ўлад пры правядзенні выбараў у разглядаемы перыяд не выяўлена. Разам з тым і без гэтага судовыя чыноўнікі, безумоўна, знаходзіліся ў падначаленым становішчы ў адносінах да губернскага начальства. Нават для таго, каб на нейкі час адлучыцца ад пасады, судовым служboўцам трэба было атрымаць дазвол губернатара[55]. Наогул начальнікі губерняў успрымалі суды як свае падведамныя ўстановы. Так, у 1797 г. беларускі губернатар Сямён Жыгулін прадпісваў другому дэпартаменту Беларускага галоўнага суда «стараться все дела рассматривать и решать справедливо, беспристрастно и скоро, ибо примеченная неисправность и медленность будут с департамента взысканы мною без всякого послабления»[56].

**Адвакатура.** Адметнай асаблівасцю судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі ў разглядаемы перыяд была наяўнасць інстытута адвакатуры. Адвакаты ўдзельнічалі ў судовым працэсе толькі па грамадзянскіх справах, якія разбіраліся на падставе мясцовага права. У сферы крымінальнага судаводства дзейнічалі расійскія парадкі: судовы працэс з'яўляўся следчым, а значыць, не быў спаборным. Адпаведна, месца для інстытута адвакатуры ў ім фактычна не было. Адвакаты дапускаліся да крымінальных спраў толькі непрацяглы перыяд падчас вайны 1812 г. на тэрыторыі, падведамаснай Камісіі часовага ўрада ВКЛ[57]. Умовы адвакацкай дзейнасці ў заходніх губернях рэгламентаваліся нормамі Статута ВКЛ 1588 г., некаторых сеймавых канстытуцый Рэчы Паспалітай, а таксама шэрагам заканадаўчых актаў Расійскай імперыі. Так, царскім указам ад 14 снежня 1797 г. вызначаліся крытэрыі для атрымання права займацца адвакацкай дзейнасцю ў судах Літоўскай губерні: дваранскае паходжанне, валоданне сваімі вёскамі (для гарадскіх адвакатаў магістратаў і ратуш – наяўнасць лаўкі ці маёнтка ў дадзеным горадзе), добрая рэпутацыя, пасведчанне аб адукацыі, навучанне на працягу некалькіх гадоў у дасведчанага ў судаводстве чалавека ці ў канцылярыі пад наглядам рэгента (так называлася пасада загадчыка канцылярыі суда)[58]. У 1811 г. дзеянне ўказа ад 14 снежня 1797 г. было распаўсюджана на ўсе заходнія губерні[59].

## Заключэнне

Такім чынам, у выніку пераўтварэнняў Паўла I на тэрыторыі Беларусі склалася своеасаблівая судовая сістэма. Яна істотна адрознівалася ад судовай сістэмы ва ўнутрырасійскіх губернях. На беларускіх землях яна грунтавалася на традыцыях судаўладкавання і судаводства часоў ВКЛ і Рэчы Паспалітай, але пры гэтым была адаптавана да рэалій Расійскай імперыі. Судовыя ўстановы захоўвалі назвы і ўладкаванне часоў ВКЛ (хаця і не ў поўнай меры), працягвала дзейнічаць мясцовае права (Статут ВКЛ 1588 г. і сеймавыя канстытуцыі Рэчы Паспалітай), у справаводстве магла выкарыстоўвацца польская мова (пераважна ў грамадзянскім судаводстве судоў ніжэйшага ўзроўню), шырокімі паўнамоцтвамі ў сферы правасуддзя была надзелена шляхта. Разам з тым па многіх аспектах дадзеная судовая сістэма істотна адрознівалася ад былой у бок уніфікацыі з расійскімі судовымі парадкамі (выкарыстанне расійскіх законаў, прызначэнне на некаторыя судовыя пасады чыноўнікаў ад урада, значная роля губернатараў у ажыццяўленні правасуддзя, падпарадкаванне вышэйшай судовай інстанцыі – Сенату і інш.). Нормамі мясцовага права рэгуляваліся пераважна прыватнаправавыя адносіны, а ў сферы публічнага права дамінавалі расійскія законы і парадкі. Пры гэтым судовая сістэма ў Віцебскай і Магілёўскай губернях у разглядаемы перыяд у большай ступені ў параўнанні з астатнімі заходнімі губернямі была набліжана да расійскай, а ў 1831 г. увогуле з ёй уніфікавана. На астатняй частцы тэрыторыі Беларусі сфера правасуддзя захоўвала істотныя мясцовыя асаблівасці да 1840 г.

[53]НГАБ. Ф. 3215. Воп. 2. Спр. 7. Арк. 6.
[54]Там жа. Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 2132. Арк. 5–5 адв.
[55]Там жа. Ф. 156. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 69.
[56]Там жа. Ф. 3215. Воп. 2. Спр. 7. Арк. 22 адв.
[57]Kuryer Litewski. 1812. 18 sierp. S. 1.
[58]ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 24 : 1796–1797. № 18266.
[59]Там же. Т. 31 : 1810–1811. № 24778.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Жытко АП, Талмачова СА. Судовая сістэма на тэрыторыі Беларусі (канец XVIII – сярэдзіна XIX ст.). *Весці БДПУ. Серыя 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія*. 2014;2:20–25.

2. Гушчынскі IГ. Эксдывізарскія суды на тэрыторыі Беларусі (канец XVIII ст. – 1840 г.). *Беларускі гістарычны часопіс*. 2018;11:26–36.

3. Гушчынскі IГ. Гістарыяграфія гісторыі судовых устаноў на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. *Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки*. 2017;1:8–15.

4. Гушчынскі IГ. Заканадаўчае забеспячэнне інстытута адвакатуры на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст. *Весці БДПУ. Серыя 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія*. 2017;2:28–32.

5. Korowicki A. *Proces cywilny litewski*. Wilno: Józef Zawadzki; 1826. 316 s.

6. Korowicki A. *Porządek sądowy kryminalny podług praw rossyyskich ułożony*. Wilno: Józef Zawadzki; 1831. 135 s.

7. Шелкопляс ВА. *Судебные органы в Беларуси: конец XVIII – первая половина XIX веков*. Минск: Академия МВД Республики Беларусь; 1997. 64 с.

8. Жукович ПН. Западная Россия в царствование императора Павла. *Журнал Министерства народного просвещения. Новая серия*. 1916;6:183–226.

9. Киселев АА. *Система управления и чиновничество белорусских губерний в конце XVIII – первой половине XIX в*. Минск: Военная академия Республики Беларусь; 2007. 171 с.

10. Луговцова СЛ. Характеристика межевых судей Беларуси в первой трети XIX столетия (на примере Ошмянского уезда). В: *«Долгий XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы: исследования по Новой и Новейшей истории. Выпуск 2* [Интернет]. Минск: РИВШ; 2019 [процитировано 17 января 2020 г.]. с. 41–46. Доступно по: http://elib.bsu.by/handle/123456789/217848.

11. Лютый АМ. *Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX века*. Минск: Наука и техника; 1987. 179 с.

12. Korowicki A. *Proces graniczny*. Wilno: Józef Zawadzki; 1827. 148 s.

13. Юхо ЯА. *Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. Частка 1.* Мінск: РІВШ БДУ; 2000. 352 с.

14. Токць С. Шляхецкае самакіраванне ў Гродзенскай губерні (пачатак XIX ст. – 60-я гады XIX ст.). *Białoruskie zeszyty historyczne*. 1997;7:5–22.

15. Анішчанка ЯК. *Генеральнае межаванне ў Беларусі*. Горкі: Выдавецтва Горацкага гарвыканкама; 2002. 120 с.

16. Леонтьева ТЕ, Антонович ЗВ, Насытко ЕП, Вернер ИЛ, Анищенко ЕК, Лютаревич АА и др. *Витебская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1802–1917)*. Минск: БелНИИДАД; 2009. 524 с.

17. Кузнецов ИН, Шелкопляс ВА. *История государства и права Беларуси*. Минск: Дикта; 1999. 272 с.

18. Жукович ПН. Управление и суд в Западной России в царствование Екатерины II. *Журнал Министерства народного просвещения. Новая серия*. 1914;5:1–60.

19. Луговцова СЛ. Реформирование системы судебных учреждений Беларуси в последней трети XVIII в. *Працы гістарычнага факультэта БДУ* [Інтэрнэт]. 2009 [працытавана 20 студзеня 2020 г.];4:289–295. Даступна па: http://elib.bsu.by/handle/123456789/2456.

20. Ясинский МН. *Главный Литовский трибунал, его происхождение, организация и компетенция. Выпуск 1.* Киев: Типография Н. А. Гирич; 1901. 253 с.

21. Леонтьева ТЕ, составитель. *Минская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1793–1917)*. Минск: БелНИИДАД; 2006. 392 с.

22. Клочков МВ. *Очерки правительственной деятельности времени Павла I*. Петроград: Сенатская типография; 1916. 631 с.

## References

1. Zhytko AP, Talmachova SA. [The judicial system in the territory of Belarus (the late 18th – the middle of 19th century)]. *Vesci BDPU. Seryja 2. Gistoryja. Filasofija. Palitalogija. Sacyjalogija. Jekanomika. Kul’turalogija*. 2014;2:20–25. Belarusian.

2. Gushchynski IG. [Exdywizor courts in the territory of Belarus (the late 18th century – 1840)]. *Belaruski gistarychny chasopis*. 2018;11:26–36. Belarusian.

3. Gushchynski IG. The historiography of history of judicial system on the territory of Belarus at the end of the 18th – the first half of the 19th century. *Vestnik Polotskogo gosudarstvennogo universiteta. Seriya A. Gumanitarnye nauki*. 2017;1:8–15. Belarusian.

4. Gushchynski IG. Legal activities of the bar institute on the territory of Belarus in the late 18th – the first third of 19th century. *BSPU Bulletin. Series 2. History. Philosophy. Political Science. Sociology. Economics. Culture Studies*. 2017;2:28–32.

5. Korowicki A. *Proces cywilny litewski*. Wilno: Józef Zawadzki; 1826. 316 s.

6. Korowicki A. *Porządek sądowy kryminalny podług praw rossyyskich ułożony*. Wilno: Józef Zawadzki; 1831. 135 s.

7. Shelkoplyas VA. *Sudebnye organy v Belarusi: konets XVIII – pervaya polovina XIX vekov* [Judicial bodies in Belarus: late 18th – first half of 19th century]. Minsk: Academy of Ministry of Internal Affairs of the Republic of Belarus; 1997. 64 p. Russian.

8. Zhukovich PN. [Western Russia during the reign of Emperor Paul]. *Zhurnal Ministerstva narodnogo prosveshcheniya. Novaya seriya*. 1916;6:183–226. Russian.

9. Kiselev AA. *Sistema upravleniya i chinovnichestvo belorusskikh gubernii v kontse XVIII – pervoi polovine XIX v*. [The governance system and bureaucracy of the Belarusian provinces at the end of the 18th – the first branch of the 19th century]. Minsk: Military Academy of the Republic of Belarus; 2007. 171 p. Russian.

10. Lugovcova SL. [Characteristics of the boundary judges of Belarus in the first third of the 19th century (the example of Oshmyany district)]. In: *«Dolgii XX vek» v istorii Belarusi i Vostochnoi Evropy: issledovaniya po Novoi i Noveishei istorii. Vypusk 2* [The «Long 19th century» in the history of Belarus and Eastern Europe: studies on the New and Contemporary history. Issue 2] [Internet]. Minsk: National Institute for Higher Education; 2019 [cited 2020 January 17]. p. 41–46. Available from: http://elib.bsu.by/handle/123456789/217848. Russian.

11. Lyutyi AM. *Sotsial'no-ekonomicheskoe razvitie gorodov Belorussii v kontse XVIII – pervoi polovine XIX veka* [Socio-economic development of the cities of Belarus in the late 18th – first half of the 19th century]. Minsk: Nauka i tekhnika; 1987. 179 p. Russian.

12. Korowicki A. *Proces graniczny*. Wilno: Józef Zawadzki; 1827. 148 s.

13. Juho JaA. *Gistoryja dzjarzhavy i prava Belarusi. Chastka 1* [History of state and law of Belarus. Part 1]. Minsk: National Institute for Higher Education, Belarusian State University; 2000. 352 p. Belarusian.

14. Tokc' S. [Noble self-governance in Grodno province (the beginning of 19th century – the 60s of 19th century)]. *Białoruskie zeszyty historyczne.* 1997;7:5–22. Belarusian.

15. Anishchanka JaK. *General'nae mezhavanne w Belarusi* [General surveying in Belarus]. Gorki: Vydavectva Gorackaga garvykankama; 2002. 120 p. Belarusian.

16. Leont'eva TE, Antonovich ZV, Nasytko EP, Verner IL, Anishchenko EK, Lyutarevich AA, et al. *Vitebskaya guberniya: gosudarstvennye, religioznye i obshchestvennye uchrezhdeniya (1802–1917)* [Vitebsk province: state, religious and public institutions (1802–1917)]. Minsk: BelNIIDAD; 2009. 524 p. Russian.

17. Kuznetsov IN, Shelkoplyas VA. *Istoriya gosudarstva i prava Belarusi* [History of state and law of Belarus]. Minsk: Dikta; 1999. 272 p. Russian.

18. Zhukovich PN. [Governance and courts in Western Russia during the reign of Catherine II]. *Zhurnal Ministerstva narodnogo prosveshcheniya. Novaya seriya.* 1914;5:1–60. Russian.

19. Lugovcova SL. [Reforming the system of judicial institutions in Belarus in the last third of the 18th century]. *Pracy gistarychnaga fakul'tjeta BDU* [Internet]. 2009 [cited 2020 January 20];4:289–295. Available from: http://elib.bsu.by/handle/123456789/2456. Russian.

20. Jasinskij MN. *Glavnyi Litovskii tribunal, ego proiskhozhdenie, organizatsiya i kompetentsiya. Vypusk 1* [The main Lithuanian tribunal, its origin, organization and competence. Issue 1]. Kyiv: Tipografija N. A. Girich; 1901. 253 p. Russian.

21. Leont'eva TE, editor. *Minskaya guberniya: gosudarstvennye, religioznye i obshchestvennye uchrezhdeniya (1793–1917)* [Minsk province: state, religious and public institutions (1793–1917)]. Minsk: BelNIIDAD; 2006. 392 p. Russian.

22. Klochkov MV. *Ocherki pravitel'stvennoi deyatel'nosti vremeni Pavla I* [Essays on Government Activities of the Time of Paul I]. Petrograd: Senatskaya tipografiya; 1916. 631 p. Russian.

*Артыкул пастуніў у рэдкалегію 30.01.2020.*
*Received by editorial board 30.01.2020.*

*УДК 329.12(=161.1)(476)«1907/1917»*

# ДЕПУТАТЫ III И IV ГОСУДАРСТВЕННОЙ ДУМЫ ОТ МОГИЛЁВСКОЙ ГУБЕРНИИ: СОЦИАЛЬНЫЕ И ПОЛИТИЧЕСКИЕ ХАРАКТЕРИСТИКИ

***Д. С. ЛАВРИНОВИЧ***[1)]

[1)]*Могилёвский государственный университет им. А. А. Кулешова, ул. Космонавтов, 1, 212022, г. Могилёв, Беларусь*

Раскрывается социальный статус членов Государственной думы от Могилёвской губернии. Показано, что из-за цензового характера избирательного закона от 3 июня 1907 г. в составе депутатского корпуса преобладали представители элитарных групп населения (дворяне, крупные землевладельцы), большой вес имели депутаты из церковной и чиновничьей среды. По политическим убеждениям практически все посланцы Могилёвской губернии являлись сторонниками консервативного лагеря. В центре внимания думцев оказались столыпинская земельная реформа и законопроект о введении выборных земств в западных губерниях Российской империи. В 1915 г. часть депутатов IV Думы от Могилёвской губернии примкнули к «Прогрессивному блоку» и приняли участие в борьбе против царского правительства, а Б. А. Энгельгардт, как председатель военной комиссии Временного комитета Государственной думы, сыграл важную роль во время Февральской революции 1917 г.

***Ключевые слова:*** Государственная дума; Могилёвская губерния; депутаты; социальный статус; русские националисты; правые; «Прогрессивный блок».

# ДЭПУТАТЫ III І IV ДЗЯРЖАЎНАЙ ДУМЫ АД МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ: САЦЫЯЛЬНЫЯ І ПАЛІТЫЧНЫЯ ХАРАКТАРЫСТЫКІ

***Д. С. ЛАЎРЫНОВІЧ***[1*]

[1*]*Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова, вул. Касманаўтаў, 1, 212022, г. Магілёў, Беларусь*

Раскрываецца сацыяльны статус членаў Дзяржаўнай думы ад Магілёўскай губерні. Паказана, што з-за цэнзавага характару выбарчага закона ад 3 чэрвеня 1907 г. у складзе дэпутацкага корпуса пераважалі прадстаўнікі элітарных груп насельніцтва (дваране, буйныя землеўладальнікі), вялікую вагу мелі дэпутаты з царкоўнага і чыноўніцкага асяроддзя. Па палітычных пазіцыях амаль усе пасланцы Магілёўскай губерні з'яўляліся прыхільнікамі кансерватыўнага лагера. У цэнтры ўвагі думцаў апынуліся сталыпінская зямельная рэформа і законапраект аб увядзенні выбарных земстваў у заходніх губернях Расійскай імперыі. У 1915 г. частка дэпутатаў IV Думы ад Магілёўскай губерні далучыліся да «Прагрэсіўнага блока» і прынялі ўдзел у барацьбе супраць царскага ўрада, а Б. А. Энгельгардт, як старшыня ваеннай камісіі Часовага камітэта Дзяржаўнай думы, адыграў важную ролю падчас Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.

***Ключавыя словы:*** Дзяржаўная дума; Магілёўская губерня; дэпутаты; сацыяльны статус; рускія нацыяналісты; правыя; «Прагрэсіўны блок».

**Образец цитирования:**
Лавринович ДС. Депутаты III и IV Государственной думы от Могилёвской губернии: социальные и политические характеристики. *Журнал Белорусского государственного университета. История.* 2020;2:31–39.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2020-2-31-39

**For citation:**
Lavrinovich DS. Deputies from the Mogilev province to the State Duma III and IV: social and political characteristics. *Journal of the Belarusian State University. History.* 2020;2:31–39. Russian.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2020-2-31-39

**Автор:**
***Дмитрий Сергеевич Лавринович*** – доктор исторических наук, профессор; первый проректор.

**Author:**
***Dmitry S. Lavrinovich***, doctor of science (history), full professor; first vice-rector.
*lavrin-dmitrij@yandex.ru*

**Журнал Белорусского государственного университета. История. 2020;2:31–39**
**Journal of the Belarusian State University. History. 2020;2:31–39**

# DEPUTIES FROM THE MOGILEV PROVINCE TO THE STATE DUMA III AND IV: SOCIAL AND POLITICAL CHARACTERISTICS

***D. S. LAVRINOVICH*[a]**

[a]*Mogilev State A. Kuleshov University,*
*1 Kasmanaйтай Street, Mahiliой 212022, Belarus*

The article reveals social characteristics of the State Duma deputies. The author shows that due to the censorship nature of the electoral law of 3 June 1907, the deputy corps was dominated by the representatives of the elite groups of population (nobles, large landowners). Besides, the important role was played by the deputies from the church and the officials. Most of them, according to their political views, were supporters of the conservative centre. Deputies focused on the Stolypin's land reform and the draft law on the introduction of elected zemstvos in the western provinces of the Russian Empire. In 1915, part of deputies of Duma IV from Mogilev province joined the «Progressive coalition», took part in the fight against the tsarist government, and B. A. Engelhardt, as a Chairman of the Military Commission of the Provisional Committee in the State Duma, played an important role during the February Revolution of 1917.

***Keywords:*** State Duma; Mogilev province; deputies; social status; Russian nationalists; right-wing; «Progressive coalition».

## Введение

История каждой из четырех Государственных дум дореволюционной России по-своему интересна и поучительна. Первые две Думы, избранные и действовавшие в период революции 1905–1907 гг., вступили в конфронтацию с царским правительством. Завоевавшие большинство на выборах депутаты левых и либеральных партий выставили заранее неприемлемые для царского правительства требования в сферах государственного строительства, текущей политики, по аграрному, национальному, рабочему и другим вопросам. Заявка на кардинальную перестройку сложившейся в империи политической системы и социально-экономических отношений не могла не привести к адекватной реакции верховной власти – роспуску законодательных палат. Изменение избирательного закона 3 июня 1907 г. было актом государственного переворота со стороны Николая II, так как царь нарушил утвержденные им же Основные государственные законы Российской империи от 23 апреля 1906 г. Однако, очевидно, такая мера оправдывалась в глазах императора необходимостью стабилизации российского общества, борьбой с террором революционных партий, которому потакали ведущие думские фракции – кадеты и трудовики.

Государственная дума 3-го созыва, выбранная уже по новому избирательному закону, в условиях политической реакции перешла от чистой демагогии и оппозиции к конструктивной работе, основанной на сотрудничестве думского большинства в лице фракций октябристов, русских националистов и группы центра с правительством П. А. Столыпина. В исторической литературе этот политический союз называется третьеиюньской системой. В советской историографии она однозначно оценивалась негативно, но при этом забывалось, что в истории российского парламентаризма впервые сложилась уникальная ситуация, когда правительственная власть и представители общественности вступили в диалог, сумев прийти к некоторым важным для всей страны решениям: реформе крестьянского землевладения, страхованию рабочих, расширению земского самоуправления и др. Следует отметить, что III Государственная дума просуществовала весь отведенный ей законом срок, подав пример движения, хотя и едва заметного, по пути к прогрессу.

Партийный состав IV Государственной думы, избранной в 1912 г., претерпел лишь незначительные изменения по сравнению с III Думой. Но политический центр, сложившийся при П. А. Столыпине, начал распадаться. В IV Думе имелись возможности для формирования двух блоков – правоцентристского (из фракций правых, русских националистов и октябристов) и левоцентристского (из фракций кадетов, прогрессистов и октябристов). Обострение отношений с исполнительной властью предопределило эволюцию IV Государственной думы влево в 1912–1914 гг., а события Первой мировой войны, показавшие неспособность царского правительства справиться с возникшими проблемами (экономический, транспортный, продовольственный кризисы, перебои в снабжении армии), окончательно привели к складыванию оппозиционного большинства в законодательных палатах (Государственной думе и Государственном совете) в лице «Прогрессивного блока». В него вошли как либеральные (кадеты, прогрессисты, октябристы), так и консервативные (прогрессивные националисты, центр) фракции, а также три группы Государственного совета.

Создание либерально-консервативной оппозиции означало падение третьеиюньской систе-

мы. Думское большинство потребовало замены царского Совета министров «правительством народного доверия», для которого была подготовлена и программа, включавшая в себя список самых необходимых реформ и мер. Отказ Николая II от сотрудничества с «Прогрессивным блоком» привел к открытой конфронтации IV Государственной думы с Советом министров, чем-то напоминающей времена I и II Государственной думы. Разочаровавшись в возможности прийти к власти легальным путем, думские оппозиционеры начали формирование теневого кабинета на случай дворцового переворота или революции. После свержения царизма 2 марта 1917 г. подготовленное думцами правительство пришло к власти.

Цель настоящей статьи – раскрыть социальный статус депутатов Государственной думы 3-го и 4-го созывов от Могилёвской губернии, установив его связь с политической и общественной деятельностью, показать их отношение к законодательным инициативам правительства, трансформацию политических позиций под влиянием Первой мировой войны, уточнить роль в борьбе «Прогрессивного блока» за власть. Выбор Могилёвской губернии обусловлен, с одной стороны, большей значимостью для нее столыпинских аграрных преобразований (из-за преобладания крестьянской общины), а с другой стороны, тем, что она была одной из губерний «черты оседлости» с типичными для данного региона социально-экономическими характеристиками.

## Основная часть

Депутатами III Государственной думы от Могилёвской губернии осенью 1907 г. были избраны Василий Федорович Голынец, Николай Константинович фон Гюббенет, Николай Николаевич Ладомирский, епископ Гомельский Митрофан, Иван Петрович Созонович, Кирилл Фомич Томашевич, Филипп Тимофеевич Шевцов. Они отличались друг от друга происхождением, имущественным положением, уровнем образования, жизненным опытом, придерживались разных политических взглядов.

Трое депутатов (Н. К. фон Гюббенет, Н. Н. Ладомирский и И. П. Созонович) были дворянами, известными своей общественной деятельностью. Н. К. фон Гюббенет владел имением Ярошевка Климовичского уезда Могилёвской губернии (706 дес. земли). Он получил высшее образование, окончив Александровский лицей в Санкт-Петербурге, но свою жизнь связал с Могилёвской губернией. В родном уезде Н. К. фон Гюббенет за собственные средства построил несколько школ, в 1907 г. стал одним из основателей и первым председателем Общества распространения среднего образования в Климовичском уезде. В 1896 г. возглавлял делегацию могилёвского дворянства на торжествах по случаю коронации Николая II в Москве. Был почетным мировым судьей по Чериковскому и Климовичскому уездам, занимал должность климовичского уездного предводителя дворянства, дослужился до чина действительного статского советника [1, с. 155; 2, с. 33].

***Acknowledgements.*** The author expresses sincere gratitude to A. G. Kaletchyc, M. M. Kryvaltsevich, V. M. Sidarovich, V. G. Beliavets, A. M. Vashanau for the opportunity to use their materials for research.

## Уводзіны

Адным з найбольш адметных культурных феноменаў эпохі позняга неаліту на тэрыторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы з’яўлялася культура шарападобных амфар (КША). Гэта культура склалася ў канцы 4-га тыс. да н. э. на прасторах еўрапейскіх нізін ад басейна Эльбы да Віслы і на працягу 3-га – пачатку 2-га тыс. да н. э. распаўсюдзілася ад Балтыйскага мора на поўначы да міжрэчча Серата і Прута на поўдні, ад Одэра на захадзе да Падняпроўя на ўсходзе. Пачынаючы з другой чвэрці 3-га тыс. да н. э. носьбіты КША пранікалі і на тэрыторыю сучаснай Беларусі.

Першыя звесткі аб выяўленні матэрыялаў КША на Заходнім Палессі былі апублікаваны ў другой палове 1960-х гг. [1, с. 157]. Аднак даволі прадстаўнічая бібліяграфія, прысвечаная пытанням распаўсюджання КША на паўднёвым захадзе краіны, дагэтуль не атрымала дэталёвага асэнсавання. Папершае, асноўным прадметам гістарыяграфічных аглядаў станавіліся навуковыя дасягненні апошніх дзесяцігоддзяў. Высновы, зробленыя даследчыкамі ў 1960–70-я гг., не аналізаваліся. Па-другое, намаганні аўтараў скіроўваліся пераважна на разгляд крыніцазнаўчых аспектаў вывучэння КША. Практычна па-за ўвагай спецыялістаў заставаліся метадалагічныя складнікі даследчых канцэпцый [2; 3, s. 230, 232; 4, с. 430]. Разам з тым усебаковы аналіз гісторыі вывучэння КША на заходнепалескіх абшарах неабходны не толькі для ацэнкі сучаснага стану і перспектыў рэканструкцыі культурнага развіцця рэгіёна ў перыяд неаліту – бронзавага веку, але і для належнага разумення гісторыі айчыннай археалогіі. Згаданыя акалічнасці абумоўліваюць **актуальнасць** дадзенага артыкула.

**Мэтай** гэтай публікацыі з'яўляецца разгляд этапаў гісторыі вывучэння КША на тэрыторыі Заходняга Палесся, што дапаможа вызначыць ступень вырашанасці асноўных праблем і акрэсліць кірункі будучых даследаванняў.

## Вывучэнне КША ў 1960–90-я гг.

На працягу значнага перыяду вывучэннем КША на тэрыторыі Заходняга Палесся займаўся амаль выключна У. Ф. Ісаенка. Даследчык не стварыў цэльную канцэпцыю развіцця культуры ў межах згаданага рэгіёна. Разам з тым аналіз урыўкавых звестак, прыведзеных у шэрагу публікацый У. Ф. Ісаенкі, дазваляе сістэматызаваць уяўленні навукоўца аб распаўсюджанні КША на паўднёвым захадзе Беларусі і прадставіць іх ва ўпарадкаваным выглядзе.

Калі змест асобных тэзісаў У. Ф. Ісаенкі неаднаразова карэкціраваўся, то тэарэтычны базіс, на які абапіраўся даследчык, на працягу дзесяцігоддзяў заставаўся нязменным. У 1969 г. У. Ф. Ісаенка сцвярджаў, што археалагічная культура – гэта «гістарычная агульнасць археалагічных помнікаў пэўнага перыяду, эпохі на акрэсленай тэрыторыі. Пры вылучэнні археалагічных культур… перавага аддаецца прыкметам, якія не залежаць ад аднолькавых умоў існавання або адной ступені грамадскаэканамічнага развіцця (форма і арнаментацыя посуду, тып жылля, упрыгожанні і інш.). Археалагічная культура ранніх эпох з'яўляецца паказчыкам адзінства этнасу, мовы і, магчыма, антрапалагічнага тыпу»[1]. Такіх поглядаў навуковец прытрымліваўся і ў 1990-я гг.[2] [5, с. 29].

Тэарэтычная мадэль, у межах якой працаваў У. Ф. Ісаенка, адпавядала так званай тэорыі культурных цаглін (*cultural brick theory*) (параўн. [6, p. 35, 37, 246–247]). Згодна з гэтым падыходам археалагічная культура ўспрымаецца як сукупнасць прыкмет з выразнымі межамі іх распаўсюджання, а вылучэнне таксанамічных адзінак і аднясенне да іх археалагічных матэрыялаў не выклікае вялікіх цяжкасцей [7, с. 56–59, 361]. Аналагічнае разуменне аднаго з фундаментальных паняццяў археалогіі адзначалася ў працах многіх археолагаў другой паловы XX ст. [7, с. 55–56; 8, с. 71]. Варта таксама ўлічваць, што агучанае У. Ф. Ісаенкам палажэнне аб поўным супадзенні археалагічнай культуры і этнасу характэрнае для так званай этнакомплекснай версіі вызначэння археалагічнай культуры [7, с. 149]. Менавіта такі падыход падтрымлівала пераважная большасць савецкіх даследчыкаў (параўн. [7, с. 149–152; 8, с. 71]).

Такім чынам, метадалагічныя асновы працы У. Ф. Ісаенкі цалкам знаходзіліся ў рэчышчы тых тэарэтычных мадэлей, што дамінавалі ва ўсходнееўрапейскай археалогіі ў пасляваенны час. Разам з тым канкрэтныя высновы навукоўца, якія датычыліся праблемы прысутнасці КША на тэрыторыі Заходняга Палесся, вылучаліся самастойнасцю і арыгінальнасцю.

У пачатку 1950-х гг. А. Я. Брусаў, разглядаючы неалітычныя культуры «еўрапейскай часткі СССР», услед за І. Ф. Лявіцкім вылучыў асобную валынскую мегалітычную культуру, якую супрацьпаставіў КША на тэрыторыі Цэнтральнай Еўропы. Даследчык абгрунтоўваў мясцовае паходжанне «культуры валынскіх мегалітаў», крытыкуючы «тэндэнцыйную» гіпотэзу «фашысцкіх археолагаў» аб прасоўванні носьбітаў КША з больш заходніх рэгіёнаў [9, с. 220–227].

Прыступіўшы да вывучэння археалагічных культур эпохі неаліту ва ўмовах новай ідэалагічнай кан'юнктуры, У. Ф. Ісаенка адмовіўся ад палітызаванага аўтахтоннага кірунку інтэрпрэтацыі. Ужо пачынаючы з другой паловы 1960-х гг., падзяляючы падыходы І. К. Свешнікава і Т. Вісляньскага [10, s. 86–90; 11, p. 9], навуковец разглядаў валынскую мегалітычную культуру ў якасці адной з груп КША [12, рыс. 3, *8*]. Мяркуючы па апублікаваных У. Ф. Ісаенкам і М. М. Чарняўскім картах рассялення першабытных плямён (1970), распаўсюджанне КША ў заходніх раёнах Беларусі звязвалася з уплывам не

[1] *Ісаенка У. Ф.* Археалагічная культура // Беларус. сав. энцыкл. Т. 1. А – Афіна. / гал. рэд. П. У. Броўка. Мінск : БелСЭ, 1969. С. 468.

[2] *Ісаенка У. Ф.* Археалагічная культура // Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: В. В. Гетаў [і інш.]. Мінск : БелЭн, 1993. С. 47–48.

валынскіх, а польскіх «амфарных» супольнасцей [13, рис. 27, *3*, *4*, рис. 43, *1*, *2*]. Згаданая рэканструкцыя кірункаў міграцыі «шарападобнікаў» паўтаралася і ў пазнейшых публікацыях У. Ф. Ісаенкі [14, рис. 46, *11*].

Даследчык неаднаразова закранаў пытанне аб межах КША на тэрыторыі Беларусі. У канцы 1960-х гг. ён меркаваў, што КША была распаўсюджана на паўднёвым захадзе краіны [12, рис. 3]. Манаграфія 1976 г. утрымлівае супярэчлівыя даныя. Прыводзячы карту культур эпохі неаліту, У. Ф. Ісаенка ўключыў у арэал КША толькі Панямонне [14, рис. 46]. Пры гэтым у тэкставай частцы публікацыі навуковец адзначыў прысутнасць «помнікаў з шарападобнымі амфарамі» і на Заходнім Палессі [14, с. 115]. У пачатку 2000-х гг. навуковец згадваў помнікі КША ў ваколіцах г. Ваўкавыска і в. Моталь Іванаўскага раёна [15, с. 9].

Даволі супярэчлівымі выглядаюць і спробы У. Ф. Ісаенкі вызначыць храналагічныя межы існавання КША на тэрыторыі Заходняга Палесся. Варта ўлічваць, што навуковец распрацоўваў выключна адносную храналогію культуры, абапіраючыся на даныя, атрыманыя ў сумежных рэгіёнах. У другой палове 1960-х – пачатку 1970-х гг. даследчык адносіў распаўсюджанне КША да неалітычнага часу альбо да ранняга перыяду бронзавага веку. Гэтыя эпохі, паводле некаліброванай храналогіі, абмяжоўваліся 2700/2500–1700 гг. да н. э. і канцом 3-га або пачаткам 2-га тыс. да н. э. – 1600/1500 гг. да н. э. адпаведна [12, рис. 3, рис. 9, *1*, *2*; 13, с. 109, 117, рис. 43, *1*, *2*]. У манаграфіі, у якой падводзіліся вынікі даследавання каменнага і бронзавага вякоў Прыпяцкага Палесся, У. Ф. Ісаенка датаваў помнікі КША на паўднёвым захадзе краіны канцом сярэдняга неаліту – познім неалітам (каля 2500–1800/1700 гг. да н. э.) [14, с. 110, 115, рис. 45]. У працы даследчыка, якая выйшла ў тым жа годзе, адзначалася, што КША існавала ў энеаліце – бронзавым веку (сярэдзіне 3-га – пачатку 2-га тыс. да н. э.) [16, с. 19, рис. 1, 13]. У першай палове 1980-х гг. навуковец зноў аднёс КША на захадзе Палесся да неалітычнай эпохі [17, с. 16–17].

Закранаў У. Ф. Ісаенка і праблемы ўзаемадзеяння прышлай КША і мясцовых культур неаліту – бронзавага веку. На думку даследчыка, прысутнасць на тэрыторыі паўднёвага захаду Беларусі КША, а таксама некаторых іншых сінхронных культур садзейнічала ўскладненню форм і арнаментацыі «грабеньчатай керамікі плямён Палесся»[3] [14, с. 115]. Акрамя таго, навуковец меркаваў, што КША і валынская мегалітычная культура ўздзейнічалі на палескую групу (культуру) шнуравой керамікі [13, с. 124]. Абгрунтаванні згаданых сцверджанняў не прапаноўваліся.

Звяртаючыся да праблем гаспадарчых заняткаў носьбітаў КША, У. Ф. Ісаенка адзначаў, што «шарападобнікі» займаліся земляробствам і жывёлагадоўляй [16, с. 19]. Разам з тым станаўленне вытворчай гаспадаркі на тэрыторыі Заходняга Палесся ён звязваў з уздзеяннем іншых цэнтральнаеўрапейскіх культур – культуры лейкападобных кубкаў і культуры шнуравой керамікі [18, с. 5–15].

Не абмінаў У. Ф. Ісаенка і пытанні этнічных інтэрпрэтацый. Пачатковым пунктам у дыскусіі беларускіх даследчыкаў аб этнічнай прыналежнасці насельніцтва КША варта лічыць публікацыю Э. М. Загарульскага [19]. Навуковец зыходзіў з таго меркавання, што тэрыторыя, месца і час распаўсюджання КША, а таксама даныя аб этнічных працэсах, якія адбываліся ў арэале культуры ў 3-м тыс. да н. э., адпавядалі ўмовам складвання новай этнічнай агульнасці – славян. У сувязі з гэтым ён атаясамліваў КША з першай славянскай археалагічнай культурай. Улічваючы факт выяўлення помнікаў КША на Беларускім Панямонні, Э. М. Загарульскі ўключаў у арэал прарадзімы славян заходнія і паўднёва-заходнія раёны Беларусі [19, с. 51–53]. Гіпотэза Э. М. Загарульскага не знайшла падтрымкі сярод спецыялістаў і неаднаразова крытыкавалася У. Ф. Ісаенкам [20, с. 24–25; 5, с. 27]. На яго думку, носьбіты КША з'яўляліся паўночнымі еўрапеоідамі, «якія маглі размаўляць на даіндаеўрапейскай мове альбо засвойваць індаеўрапейскую мову пад моцным уплывам плямён старажытнаямнай культуры» [5, с. 27].

## Вывучэнне культуры шарападобных амфар на сучасным этапе

Пачатак новага этапу ў вывучэнні КША на тэрыторыі Заходняга Палесся, як і ўсёй Усходняй Еўропы ў цэлым, звязаны са змяненнем метадалогіі даследаванняў. Па-першае, адбыўся пераход ад манатэтычнай да політэтычнай тэорыі археалагічнай культуры [11, p. 7]. У адпаведнасці з політэтычным падыходам археалагічная культура разглядаецца як комплекс прыкмет, якія распаўсюджваюцца незалежна адна ад адной у розных накірунках і на розныя тэрыторыі. Частка гэтых адзнак прысутнічае таксама ў іншых культурах. Трансфармацыя культуры заключаецца толькі ў частковых зменах асобных рыс ці іх груп, а не ўсяго комплексу прыкмет адначасова [6, p. 37–38, 247–249, fig. 3, 53; 7, с. 362]. Згодна з вызначэннем М. Шмыт, КША – гэта «надрэгіянальная структура пэўных узаемазвязаных элементаў матэрыяльнай культуры і сацыяльных паводзін (перш за ўсё ў сферы рытуаль-

[3]Тут і далей пераклад наш. – *А. В.*

ных практык і эканомікі)» [21, p. 232]. Па-другое, навукоўцы адмовіліся ад ідэі абавязковага атаясамлення археалагічнай культуры і этнасу (параўн. [22, s. 111; 8, с. 71]). Спецыялісты падкрэсліваюць неабходнасць правядзення палеагенетычных даследаванняў для вызначэння ролі носьбітаў КША ў этнакультурных і палеадэмаграфічных працэсах эпохі неаліту [21, p. 251; 23].

У адпаведнасці з політэтычным падыходам М. Шмыт прапанавала падзяляць усе ўсходнееўрапейскія комплексы з рысамі КША на «чыстыя» (непасрэдна звязаныя з КША, часам, аднак, толькі гіпатэтычна) і «сінкрэтычныя» (іншакультурныя комплексы, у якіх прысутнічаюць асобныя рысы КША). У лік «чыстых» комплексаў даследчыца ўключыла пахаванні, паселішчы і майстэрні. Да прыкмет, генетычна звязаных з КША, былі аднесены адметнасці марфалогіі і арнаментацыі керамікі, крамянёвага і касцянога інвентару, бурштынавых упрыгожанняў і пахавальнага абраду [11, p. 11–13, 120–128; 24, s. 167]. Напрацоўкі М. Шмыт, як найбольш прыдатныя для асэнсавання феномена КША на тэрыторыі Заходняга Палесся, знайшлі падтрымку і развіццё ў публікацыях М. М. Крывальцэвіча [25; 26] і аўтара дадзенага артыкула[4].

Разглядаючы КША на тэрыторыі Усходняй Еўропы, М. Шмыт адзначыла прысутнасць на паўднёвым захадзе Беларусі некалькіх пунктаў з «чыстымі»




*Мал. 1.* КША на тэрыторыі Заходняга Палесся: I – кераміка з прыкметамі КША (*1* – Камянюкі-2; *2* – Моталь-1; *3* – Моталь-11; *4* – Моталь-13; *5* – Моталь-20; *6* – Гнеўчыцы; *7* – Перасудавічы; *8* – Камень-2; *9* – Камень-6; *10* – Камень-8; *11* – Дубы-1, -2; *12* – Вяз-2; *13* – Бакінічы-1; *14* – Царабень; *15* – Лемяшэвічы; *16* – Сушыцк; *17* – Грыўковічы-2; *18* – Бухліцкі Хутар); II – сякеры з прыкметамі КША (*19* – Падлессе Радваніцкае; *20* – Дуброва; *21* – Оўзічы; *22* – Стараселле; *23* – Тышкавічы; *24* – Дзівін; *25* – Навасёлкі; *26* – Хабовічы; *27* – Мікашэвічы; *28* – Збураж; *29* – Ласіцк; *30* – Пасянічы; *31* – Садовы; *32* – Парахонск; *33* – Засімавічы; *34* – Бузуны; *35* – Хвойнікі; *36* – Дубай; *37* – Велямічы; *38* – Альгомель); III – долаты з прыкметамі КША (*39* – Аляксеевічы; *40* – Мяфёдавічы; *41* – Сігневічы; *42* – Камень-2).
Крыніца: [25], з дапаўненнямі аўтара

*Fig. 1.* The Globular Amphora Culture (GAC) in the Western Palessye: I – pottery with GAC traits (*1* – Kamianiuki-2; *2* – Motaĺ-1; *3* – Motaĺ-11; *4* – Motaĺ-13; *5* – Motaĺ-20; *6* – Hnieučycy; *7* – Pierasudavičy; *8* – Kamień-2; *9* – Kamień-6; *10* – Kamień-8; *11* – Duby-1, -2; *12* – Viaz-2; *13* – Bakiničy-1; *14* – Cierabień; *15* – Liemiaševičy; *16* – Sušyck; *17* – Hryŭkovičy-2; *18* – Buchlicki Chutar); II – axes with GAC traits (*19* – Padlessie Radvanickaje; *20* – Dubrova; *21* – Oŭzičy; *22* – Starasiellie; *23* – Tyškavičy; *24* – Dzivin; *25* – Navasiolki; *26* – Chabovičy; *27* – Mikashevičy; *28* – Zburaž; *29* – Lasick; *30* – Pasianičy; *31* – Sadovy; *32* – Parachonsk; *33* – Zasimavičy; *34* – Buzuny; *35* – Chvojniki; *36* – Dubaj; *37* – Vieliamičy; *38* – Aĺhomieĺ); III – chisels with GAC traits (*39* – Aliaksiejevičy; *40* – Miafiodavičy; *41* – Sihnievičy; *42* – Kamień-2).
Source: [25], with author's additions

[4] *Зуева А. У.* Культура шарападобных амфар на тэрыторыі Беларусі і яе роля ў развіцці супольнасцей III – пачатку II тыс. да н. э. : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.06. Мінск, 2011. С. 9–12.

амфарнымі матэрыяламі [11, p. 256, 258]. Аднак, на думку беларускіх навукоўцаў, у рэгіёне сустракаюцца выключна кераміка «сінкрэтычнага» тыпу і асобныя крамянёвыя вырабы, характэрныя для «шарападобнікаў» (мал. 1) [27, с. 77; 28, s. 269; 25, s. 143–147; 26, s. 210; 3, s. 230, 232; 4, с. 427, 430, мал. 245]. На сучасным этапе даследаванняў прыкметы, якія адпавядаюць традыцыі КША, зарэгістраваны ў матэрыялах нёманскай культуры і групы шнуравой керамікі палескага тыпу.

Кераміка нёманскай культуры з элементамі КША параўнальна малалікая (мал. 2, *1*, *2*, *4*). «Амфарныя» рысы прасочваюцца выключна ў арнаментацыі посуду. Заходнепалескія супольнасці «ляснога» неаліту зрэдку выкарыстоўвалі аздабленне ў выглядзе вертыкальных адбіткаў лінейнага штампа, зігзага, выкананага штампам. У параўнанні з КША арнамент наносіўся ў мадыфікаванай манеры: як правіла, штампаваныя адбіткі мелі нерэгулярныя абрысы, «амфарныя» матывы часта спалучаліся з тыповым «нёманскім» дэкорам (наколамі, уцісканнямі і інш.) ці размяшчаліся ў адпаведнасці з «лясной» неалітычнай традыцыяй на зрэзе венца.

Значна больш выразны кампанент КША вылучаецца ў матэрыялах групы шнуравой керамікі палескага тыпу (мал. 2, *3*, *5–10*). Асобныя аспекты праблемы прысутнасці «амфарнага» кампанента ў лакальных «шнуравых» комплексах неаднаразова закраналіся ў літаратуры [28, s. 269; 27, с. 77; 25, s. 143–147; 26, s. 210]. З улікам апублікаваных даных, а таксама на падставе вынікаў уласнага вывучэння заходнепалескіх калекцый варта адзначыць наступнае. Прыкметы, якія маюць генетычныя вытокі ў КША, ідэнтыфікаваны ў арнаментацыі і мікрамарфалогіі посуду. Даволі шматлікія фрагменты заходнепалескай шнуравой керамікі ўпрыгожаны гарызантальнымі пасамі вертыкальных адбіткаў лінейнага штампа, штампаванымі зігзагамі. У адзінкавых выпадках сустракаецца аздабленне ў выглядзе фестонаў, а таксама трубчасты арнамент (так званыя адбіткі птушынага пяра). Даследчыкі звяртаюць увагу на пэўную трансфармацыю амфарных рыс у мясцовым культурным асяроддзі. Напрыклад, штамп, якім наносіўся арнамент, часта прыціскаўся да паверхні пасудзіны пад вуглом, у выніку чаго адбіткі набывалі падтрохвугольную




*Мал. 2.* Кераміка з прыкметамі культуры шарападобных амфар, выяўленая на тэрыторыі Заходняга Палесся. Нёманская культура: *1*, *2* (Камень-6), *4* (Камень-2); група шнуравой керамікі палескага тыпу: *3* (Грыўковічы-2), *5* (Бакінічы-1), *6*, *8* (Камень-8), *7* (Камень-2), *9* (Моталь-1), *10* (Сушыцк); тшцінецкае культурнае кола: *11* (Камень-6) (малюнкі А. У. Вайтовіч (*1–2*, *4–11*), В. М. Сідаровіча (*3*))

*Fig. 2.* Pottery with GAC traitsfrom the territory of Western Palessye. Neman Culture: *1*, *2* (Kamień-6), *4* (Kamień-2); Palessye group of the Corded Ware Culture Circle: *3* (Hryŭkovičy-2), *5* (Bakiničy-1), *6*, *8* (Kamień-8), *7* (Kamień-2), *9* (Motaĺ-1), *10* (Sušyck); Trcziniec Culture Circle: *11* (Kamień-6) (drawing by A. U. Vaitovich (*1–2*, *4–11*), V. M. Sidarovich (*3*))

форму. Матывы, характэрныя для КША, не толькі выкарыстоўваліся самастойна, але і ўключаліся ў складаныя кампазіцыі, у якія ўваходзіла таксама «шнуравое» аздабленне (напрыклад, «елачка»). Акрамя таго, не выключаецца, што распаўсюджанне ў заходнепалескім рэгіёне тыповых для КША матываў, утвораных, аднак, вусеневымі адбіткамі, таксама варта звязваць з далейшым развіццём традыцый «шарападобнікаў» [26, s. 210].

Спецыялістамі неаднаразова рабіліся захады па ідэнтыфікацыі ў калекцыях, атрыманых на тэрыторыі паўднёва-заходняй Беларусі, крамянёвых вырабаў КША (мал. 3). Найбольшую ўвагу даследчыкаў прыцягваюць рубячыя прылады, тэхніка-стылістычныя характарыстыкі якіх адпавядаюць «амфарным» стандартам. У лік такіх артэфактаў уключаны трапецападобныя сякеры з чатырохбаковым папярочным сячэннем, зашліфаваныя па ўсёй паверхні і часта запаліраваныя ў прылёзавай частцы (гл. мал. 3, *1–6*), а таксама прамавугольныя ці трапецападобныя ў плане шліфаваныя долаты (гл. мал. 3, *8*, *9*). Адзначаючы пэўную культурную ўніверсальнасць і немагчымасць адназначнай таксанамічнай ідэнтыфікацыі гэтых знаходак, М. Шмыт прапанавала разглядаць іх у якасці вырабаў, гіпатэтычна звязаных з КША [11, p. 11–12, 34–35, 123–124]. На сёння сякеры і долаты, аналагічныя «амфарным» прыладам, вядомыя ў шматлікіх пунктах у межах Заходняга Палесся [11, p. 261–266; 29, s. 12–13; 25, s. 146; 30, s. 17, 19–20]. Такія артэфакты зрэдку сустракаюцца ў матэрыялах шматкультурных паселішчаў (напрыклад, Камень-2 Пінскага раёна[5]), аднак пераважная большасць сякер і долатаў адносяцца да катэгорыі выпадковых знаходак, пазбаўленых кантэкставай інфармацыі.

Акрамя таго, у літаратуры закраналася і праблема вылучэння немакралітычных артэфактаў КША. Так, у 2003 г. В. С. Абухоўскі аднёс да гэтай культуры




*Мал. 3*. Крамянёвыя вырабы, знойдзеныя на тэрыторыі Заходняга Палесся. Сякеры і долаты з прыкметамі культуры шарападобных амфар: *1* (Хвойнікі), *2* (Мікашэвічы), *3* (Парахонск), *4* (Засімавічы), *5* (Хабовічы), *6* (Падлессе Радваніцкае), *8* (Камень-2), *9* (Сігневічы); адшчэп з «паласатага» крэменю: *7* (Моталь-1) (малюнкі А. У. Вайтовіч (*1–6*, *8*, *9*), А. М. Вашанава (*7*))

*Fig. 3*. Lithic artefacts from the territory of Western Palessye. Axes and chisels with GAC traits: *1* (Chvojniki), *2* (Mikaševičy), *3* (Parachonsk), *4* (Zasimavičy), *5* (Chabovičy), *6* (Padlessie Radvanickaje), *8* (Kamień-2), *9* (Sihnievičy); flake made of banded flint: *7* (Motaĺ-1) (drawing by A. U. Vaitovich (*1–6*, *8*, *9*), A. M. Vashanau (*7*))

[5]Фонды Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

серыю шырокіх пласцін з ваколіц в. Дружба (Скорбічы) Брэсцкага раёна [29, s. 51, rус. 89, *6–8*]. Цікавасць выклікае адшчэп з «паласатага» крэменю, нядаўна выяўлены ў крамянёвым інвентары паселішча Моталь-1 (мал. 3, *7*)[6]. Агульнапрызнанае сцверджанне аб тым, што «паласатаму» крэменю з Кшамёнак Апатоўскіх належала значная роля ў жыцці «амфарных» супольнасцей, дазваляе разглядаць знаходку менавіта ў кантэксце КША.

Такім чынам, згодна з актуальнымі ўяўленнямі, КША была адным з актыўных удзельнікаў культурнага развіцця Заходняга Палесся ў эпоху першабытнасці. Разам з тым пытанні аб шляхах, механізмах і часе распаўсюджання культуры ў рэгіёне застаюцца далёкімі ад канчатковага вырашэння.

Сучасны стан вывучанасці праблемы дазваляе меркаваць, што з'яўленне «амфарных» прыкмет на паўднёвым захадзе Беларусі – вынік разнастайных культурных сітуацый. На думку М. Шмыт, носьбіты КША маглі перамяшчацца ўздоўж Прыпяці і яе прытокаў да Бярэзіны [11, p. 194; 24, s. 181]. Разам з тым адсутнасць на тэрыторыі Заходняга Палесся «чыстых» комплексаў культуры прымушае разглядаць гіпотэзу аб інфільтрацыі асобных невялікіх груп мігрантаў толькі ў якасці папярэдняй.

Пэўныя цяжкасці выклікаюць пошукі крыніц прытоку арнаменту, утворанага адбіткамі лінейнага штампа, у нёманскую культуру. Варта ўлічваць, што на Заходнім Палессі кераміка з такім тыпам аздаблення з'явілася ўжо ў сярэднім неаліце [31, с. 239], што, згодна з агульнапрызнаным меркаваннем, было выклікана ўздзеяннем традыцый культуры лейкападобных кубкаў [11, p. 120–121; 32, с. 135–136]. У сувязі з гэтым нельга выключаць магчымасці таго, што аздабленне позненеалітычнага посуду нёманскай культуры вертыкальнымі адбіткамі лінейнага штампа і зігзагамі, выкананымі штампам, было абумоўлена далейшым развіццём традыцый «лейкападобнікаў», успрынятых на папярэднім этапе. Аднак цалкам верагоднай з'яўляецца і альтэрнатыўная інтэрпрэтацыя, згодна з якой згаданыя тыпы арнаменту маглі трапляць да позніх груп насельніцтва «ляснога» неаліту праз пасрэдніцтва мясцовых «шнуравых» супольнасцей менавіта ў якасці «амфарнай» культурнай спадчыны.

Праблема прысутнасці «амфарнага» кампанента ў заходнепалескіх «шнуравых» комплексах распрацавана больш дэталёва. Верагодна, прыкметы КША распаўсюджваліся ў «шнуравым» асяроддзі праз пасрэдніцтва тых культур, якія ўжо ўспрынялі пэўныя «амфарныя» традыцыі і ідэі. У ролі пасрэднікаў маглі выступаць найперш сярэднедняпроўская культура і жуцаўская (прыморская) культура, якія адчувалі ўплыў КША (гл., напрыклад, [11, p. 175–178; 24, s. 178–181; 8, с. 76–79; 33]) і элементы якіх зарэгістраваны ў матэрыялах групы шнуравой керамікі палескага тыпу [27; 25, s. 147–153; 26].

Згаданыя рэканструкцыі культурных працэсаў на тэрыторыі Заходняга Палесся ў познім неаліце – пачатковым перыядзе бронзавага веку адпавядаюць мадэлям распаўсюджання «амфарных» прыкмет у іншых рэгіёнах Беларусі [33, S. 240, 242; 34, с. 111; 35, p. 617–618].

Культурна-таксанамічная інтэрпрэтацыя «сінкрэтычных» матэрыялаў КША ўскладняецца недастатковай ступенню распрацаванасці храналогіі і перыядызацыі лакальных культур. Акрамя таго, на сучасным узроўні развіцця навукі існуе магчымасць акрэсліць толькі прыблізны час распаўсюджання «амфарных» прыкмет на паўднёвым захадзе краіны. Прымаючы пад увагу вынікі параўнальна-тыпалагічнага аналізу «лясной» неалітычнай і шнуравой керамікі [31; 25–27], а таксама даныя, якія датычаць храналогіі КША ў сумежных рэгіёнах [11, p. 66–71], можна меркаваць, што прыток «амфарных» традыцый на Заходняе Палессе, паводле калібраванай храналогіі, меў месца ў другой чвэрці 3-га – першай чвэрці 2-га тыс. да н. э. (параўн. [36, с. 21]).

Маладаследаванай з'яўляецца і праблема ўдзелу КША ў культурных трансфармацыях, што адбываліся на поўдні краіны ў перыяд пераходу ад неаліту да эпохі бронзы, у першую чаргу ў працэсах фарміравання комплексаў тшцінецкага культурнага кола. Згодна з высновамі М. М. Крывальцэвіча, які займаўся вывучэннем тшцінецкіх помнікаў у Прыпяцкім басейне, фарміраванне новых структур стала вынікам складаных узаемаадносін трох культурных плыней – традыцый кола культуры шнуравой керамікі, КША і нёманскай культуры [37]. З гэтым меркаваннем пагаджалася М. Шмыт, дапускаючы, што лакальныя тшцінецкія групы маглі ўспрымаць асобныя прыкметы КША праз пасрэдніцтва сярэднедняпроўскай культуры [11, p. 199; 24, s. 181]. Разам з тым дэталёвы таксанамічны аналіз, накіраваны на вылучэнне прыкмет КША ў тшцінецкіх комплексах на заходніх абшарах Прыпяцкага Палесся, застаецца справай будучыні.

Пытанне аб «амфарным» чынніку культурных змен у межах Брэсцкага Палесся і Загароддзя таксама распрацавана недастаткова. У літаратуры звярталася ўвага на прысутнасць у мясцовых тшцінецкіх матэрыялах прыкмет генетычнага амфарнага паходжання. Да іх ліку неабходна аднесці арнамент у выглядзе адбіткаў птушынага пяра (мал. 2, *11*). Не выключаецца, што менавіта ў кантэксце развіцця «амфарных» традыцый варта разглядаць і тэхналагічныя адметнасці тшцінецкай керамікі (дамешкі буйна- і сярэднезярністай жарствы) [38, s. 271].

[6]Фонды філіяла Мотальскага музея народнай творчасці «Нашы карані».

Такім чынам, можна меркаваць, што на тэрыторыі Заходняга Палесся асобныя элементы КША выкарыстоўваліся і ў раннім бронзавым веку (які, паводле перыядызацыйнай схемы, распрацаванай М. М. Крывальцэвічам для поўдня Беларусі, датуецца перыядам каля 1700/1600–1200/1000 гг. да н. э. (калібраваная храналогія) [39]). Такое трывалае і працяглае захоўванне «амфарных» прыкмет характэрнае не толькі для мясцовых тшцінецкіх комплексаў. Наяўнасць перажытачных рыс КША адзначалася даследчыкамі і ў матэрыялах «заходняга тшцінцу» [22, s. 116–122; 40, s. 115]. Значная ўвага навукоўцаў скіроўваецца і на разгляд праблем гаспадарчых заняткаў старажытнага насельніцтва Заходняга Палесся. Згодна з сучаснымі ўяўленнямі знаёмства мясцовых супольнасцей «ляснога» неаліту з земляробствам адбывалася ўжо ў раннім і сярэднім неаліце. Відавочнае ўзрастанне ролі земляробства і ўкараненне жывёлагадоўлі мела месца ў 3-м – пачатку 2-га тыс. да н. э. – у перыяд распаўсюджання «шнуравых» і «амфарных» традыцый [25, с. 138–139; 38, s. 268–271; 4, с. 471–476]. Аднак пытанне аб канкрэтнай ролі КША ў станаўленні вытвараючых форм гаспадаркі на паўднёвым захадзе Беларусі пакуль што застаецца адкрытым.

## Высновы

У гісторыі вывучэння КША на тэрыторыі Заходняга Палесся вылучаюцца два этапы: 1960–90-я гг. і перыяд з канца 1990-х гг. да цяперашняга часу.

На першым этапе метадалагічнай асновай даследаванняў з'яўлялася так званая тэорыя культурных цаглін. Галоўнае дасягненне этапу заключалася ў пастаноўцы праблемы прысутнасці КША на паўднёвым захадзе Беларусі (У. Ф. Ісаенка), пры гэтым заходнепалескія «амфарныя» супольнасці самастойным прадметам вывучэння не станавіліся. У найбольшай ступені распрацоўваліся пытанні меж распаўсюджання культуры ў рэгіёне. Крыніцазнаўчыя аспекты вывучэння амфарных матэрыялаў амаль не знайшлі адлюстравання ў гістарыяграфіі.

На рубяжы XX–XXI стст. даследчыкі пачалі разглядаць КША ў межах політэтычнай тэорыі археалагічнай культуры (М. Шмыт). Феномен КША на тэрыторыі Заходняга Палесся стаў прадметам мэтанакіраваных даследаванняў (М. М. Крывальцэвіч, А. У. Вайтовіч (Зуева)).

На сучасным этапе найбольш шматлікія помнікі з «сінкрэтычнымі» матэрыяламі КША зарэгістраваны ў мікрарэгіёнах Камень – Пагост-Загароддзе і Моталь – Тышкавічы (гл. мал. 1). Згаданая сітуацыя, верагодна, адлюстроўвае не столькі асаблівасці культурнай сітуацыі ў мінулым, колькі стан археалагічнай вывучанасці Заходняга Палесся. У сувязі з гэтым актуальнай задачай з'яўляецца пашырэнне геаграфіі палявых прац. З іншага боку, не губляе сваёй значнасці і задача паўторнай апрацоўкі ўжо існуючых калекцый, прычым увага спецыялістаў павінна скіроўвацца на аналіз крамянёвых інвентароў заходнепалескіх паселішчаў. Па-ранейшаму застаецца надзённай і праблема публікацыі вынікаў палявых і камеральных даследаванняў.

Ва ўмовах пэўнай абмежаванасці крыніц асобныя аспекты распаўсюджання КША на паўднёвым захадзе Беларусі вывучаны нераўнамерна. У літаратуры цэнтральнае месца занялі праблемы сістэматызацыі і культурна-таксанамічнай інтэрпрэтацыі прыкмет КША ў іншакультурным асяроддзі (гл. мал. 2 і 3). Зроблены толькі першыя крокі па рэканструкцыі шляхоў і кірункаў прытоку «амфарных» культурных традыцый. Далейшай распрацоўкі патрабуюць пытанні храналогіі пашырэння і трансфармацыі «амфарных» рыс у рэгіёне. Нарэшце, найбольш істотнай даследчай задачай з'яўляецца вызначэнне ролі КША ў сацыяльна-эканамічным развіцці заходнепалескіх супольнасцей у 3-м – пачатку 2-га тыс. да н. э.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Исаенко ВФ, Чернявский ММ. Новые данные по спорным вопросам бронзового века Белоруссии. В: Будько ВД, редактор. *Белорусские древности. Доклады к конференции по археологии Белоруссии; январь – февраль 1966 г.; Минск, БССР*. Минск: АН БССР; 1967. с. 155–187.
2. Зуева АУ. Вывучэнне культуры шарападобных амфар на тэрыторыі Беларусі ў канцы XX – пачатку XXI ст. *Веснік БДУ. Серыя 3. Гісторыя. Эканоміка. Права*. 2009;2:3–7.
3. Ткачоў А. Папярэднія вынікі археалагічных даследаванняў помнікаў каменнага і бронзавага вякоў на тэрыторыі Белавежскай пушчы. W: Stankiewicz U, Wawrusiewicz A, redaktorzy. *Na rubieży kultur. Badania nad okresem neolitu i wczesną epoką brązu*. Białystok: Instytucja kultury woj. Podlaskiego; 2011. s. 229–236.
4. Калечыц АГ. *Чалавек і асяроддзе: каменны век, Заходняе Палессе*. Мінск: Беларуская навука; 2018. 584 с.
5. Ісаенка УФ. Каменны век. Пераход ад праабшчыны да роду. У: Касцюк МП, рэдактар. *Нарысы гісторыі Беларусі. Частка 1*. Мінск: Беларусь; 1994. с. 9–29.
6. Clarke DL. *Analytical archaeology*. 2nd edition. London: Methuen & Co. Ltd; 1971. 684 p.
7. Клейн ЛС. *Археологическая типология*. Ленинград: АН СССР; 1991. 448 с.
8. Крывальцэвіч ММ. *Могільнік сярэдзіны III–II тыс. да н. э. на Верхнім Дняпры – Прорва-1*. Мінск: Інстытут гісторыі НАН Беларусі; 2006. 202 с.
9. Брюсов АЯ. *Очерки по истории племен европейской части СССР в неолитическую эпоху*. Москва: АН СССР; 1952. 360 с.

10. Wiślański T. *Kultura amfor kulistych w Polsce północno-zachodniej*. Wrocław: Zakład Narodowy imienia Ossolińskich; 1966. 286 s.

11. Szmyt M. *Between West and East. People of the Globular Amphora Culture in Eastern Europe: 2960–2350 BC*. Poznan: Adam Mickiewicz University; 1999. 350 p. (Baltic-Pontic Studies; volume 8).

12. Исаенко ВФ. *Археологическая карта Белоруссии. Выпуск 1. Памятники каменного века.* Минск: Полымя; 1968. 125 с.

13. Исаенко ВФ, Митрофанов АГ, Штыхов ГВ, редакторы. *Очерки по археологии Белоруссии. Часть 1. Каменный и бронзовый века*. Минск: Наука и техника; 1970. 271 с.

14. Исаенко ВФ. *Неолит Припятского Полесья*. Минск: Наука и техника; 1976. 128 с.

15. Ісаенка УФ. Этнакультурнае асяроддзе ў старажытным Палессі. У: Клімчук ФД, рэдактар. *Загароддзе-2. Матэрыялы навукова-краязнаўчай канферэнцыі; верасень 1999 г.; Пінск, Беларусь.* Мінск: Тэхналогія; 2000. с. 7–14.

16. Исаенко ВФ. *Археологическая карта Белоруссии. Выпуск 3. Памятники бронзового века.* Минск: Полымя; 1976. 150 с.

17. Исаенко ВФ. Полесье в первобытную эпоху. В: Толстой НИ, редактор. *Полесье и этногенез славян. Предварительные материалы и тезисы конференции*. Москва: Наука; 1983. с. 16–17.

18. Исаенко ВФ. Первые земледельцы и скотоводы Белоруссии. В: Шабуня КИ, редактор. *Из истории крестьянства Белоруссии. Сборник статей по материалам первой сессии республиканского симпозиума по истории сельского хозяйства и крестьянства Белоруссии; декабрь 1975 г.; Минск, БССР.* Минск: Наука и техника; 1978. с. 5–15.

19. Загорульский ЭМ. *Древняя история Белоруссии: очерки этнической истории и материальной культуры (до IX в.).* Минск: БГУ; 1977. 134 с.

20. Исаенко ВФ. Первобытные культуры Полесья. В: Штыхов ГВ, редактор. *Белорусская археология: достижения археологов за годы советской власти*. Минск: Наука и техника; 1987. с. 15–26.

21. Szmyt M. Eastern European Destinations of Central European cultural patterns. The case of the Globular Amphora Culture: end of the 4$^{th}$ – middle of the 3$^{rd}$ millennium BC. *Baltic-Pontic Studies.* 2009;14:232–251.

22. Makarowicz P. *Rola społeczności kultury iwieńskiej w genezie trzcinieckiego kręgu kulturowego (2000–1600 BC).* Poznań: Universytet imienia A. Mickiewicza; 1998. 454 s.

23. Tassi F, Vai S, Shirotto S, Lari M. Genome diversity in the Neolithic Globular Amphorae culture and the spread of Indo-European languages. *Proceedings of the Royal Society B*. 2017;284:20171540. DOI: 10.1098/rspb.2017.1540.

24. Szmyt M. Społeczności kultury amfor kulistych w Europie Wschodniej. W: Czebreszuk J, Kryvaltsevič M, Makarowicz P, redaktorzy. *Od neolityzacji do początków epoki brązu. Przemiany kulturowe w międzyrzeczu Odry i Dniepru między VI i II tys. przed Chr*. Poznań: Wydawnictwo Poznańskie; 2001. s. 167–193.

25. Крывальцэвіч ММ. Беларускае Палессе ў перыяд пераходу ад неаліту да эпохі бронзы: праблемы і перспектывы археалагічнага вывучэння. W: Kośko A, Kalečус A, redaktorzy. *Wspólnota dziedzictwa kulturowegoziem Białorusii Polski*. Warszawa: Krajowy ośrodek badań i dokumentacji zabytków; 2004. s. 137–162.

26. Крывальцэвіч М. Новыя вынікі даследавання позняга неаліту – пачатку эпохі бронзы ў Заходнім Палессі. W: Stankiewicz U, Wawrusiewicz A, redaktorzy. *Na rubieży kultur. Badania nad okresem neolitu i wczesną epoką brązu.* Białystok: Instytucja kultury wojwodstwa Podlaskiego; 2011. s. 207–217.

27. Крывальцэвіч М, Ісаенка У, Майсеня С. Кераміка «шнуравога» і «тшцінецкага» гарызонтаў паселішча Камень-2 (Заходняе Палессе). *Гістарычна-археалагічны зборнік*. 2003;18:69–91.

28. Крывальцэвіч ММ. «Шнуравы гарызонт» на Беларусі: праблемы ідэнтыфікацыі і генезіса. W: Czebreszuk J, Kryvaltsevič M, Makarowicz P, redaktorzy. *Od neolityzacji do początków epoki brązy. Przemiany kulturowe w międzyrzeczu Odry i Dniepru między VI i II tys. przed Chr*. Poznań: Wydawnictwo Poznańskie; 2001. s. 259–275.

29. Obuchowski W. *Zabytki krzemienne i kamienne od paleolitu do wczesnej epoki żelaza z terenów Białorusi w zbiorach Państwowego Museum Archeologicznego w Warszawie.* Warszawa: Wydawnictwo PMA; 2003. 208 s.

30. Абухоўскі ВС, Зуева АУ, Сідаровіч ВМ. Чатырохбаковыя крамянёвыя шліфаваныя сякеры ў зборы Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі. *Acta Achaeologica Albaruthenica*. 2008;3:17–41.

31. Чарняўскі ММ. Неаліт з грабеньчата-накольчатай і накольчатай керамікай Заходняй Беларусі: асаблівасці эвалюцыі. W: Czebreszuk J, Kryvaltsevič M, Makarowicz P, redaktorzy. *Od neolityzacji do początków epoki brązy. Przemiany kulturowe w międzyrzeczu Odry i Dniepru między VI i II tys. przed Chr*. Poznań: Wydawnictwo Poznańskie; 2001. s. 231–240.

32. Wawrusewicz A. Taksonomiczne podstawy identyfikacji tradycji kultury pucharów lejkowatych w środowisku strefy leśnej Europy Wschodniej. Perspectywa subneolitu kontynentalnego. *Матэрыялы па археалогіі Беларусі*. 2010;18:131–146.

33. Kryvaltsevich M. Die Rolle der Kugelamphorenkultur bei der Entwicklung der Gesellschaften des oberen Dnjeprgebietes. In: Beran J, Einecke R, Schimpff V, Wagner K, Weber Th, editors. *Lehren – Sammeln – Publizieren.* Leipzig: Leipziger Universitetsverlag; 2016. S. 231–244.

34. Вайтович АВ. Роль культуры шаровидных амфор в развитии сообществ Верхнего Понеманья. *Самарский научный вестник*. 2019;8(2):106–114.

35. Чарняўскі М, Вайтовіч А. Культура шарападобных амфар і яе ўплывы на Беларускім Паазер'і (паводле матэрыялаў Крывінскага тарфяніка). W: Szmyt M, editor. *Vir Bimaris. From Kujawy Cradle to Black Sea Steppes. Studies on the Prehistory of the Baltic-Pontic Between-the-Seas. In Recognition of Professor Aleksander Kośko.* Poznań: Adam Mickiewicz University; 2019. p. 609–620.

36. Крывальцэвіч ММ. Першыя людзі на тэрыторыі Прыпяцкага Палесся: каменны і бронзавы вякі. У: Каваленя АА, рэдактар. *Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі: Прыпяцкае Палессе*. Мінск: Беларуская навука; 2016. с. 8–37.

37. Крывальцэвіч ММ. Да праблемы ўзнікнення «Тшцінца» на поўдні Беларусі. In: Kośko A, Czebreszuk J, redaktorzy. *«Trzciniec» – system kulturowy czy interkulturowy process?* Poznań: Wydawnictwo Poznańskie; 1998. s. 345–353.

38. Kaleczyc A, Michalczuk W. Mikroregion Motolski (Polesie Zachodnie) w perspektywie procesów interstadium epok neolitu i brązu. Ujęcie genezy horyzontu trzcinieckiego. W: Stankiewicz U, Wawrusiewicz A, redaktorzy. *Na rubieży kultur. Badania nad okresem neolitu i wczesną epoką brązu*. Białystok: Instytucja kultury wojwodstwa Podlaskiego; 2011. s. 267–278.

39. Крывальцэвіч ММ. Праблемы перыядызацыі і храналогіі эпохі бронзы на тэрыторыі Паўднёвай Беларусі. *Гістарычна-археалагічны зборнік*. 2006;22:39–52.

40. Białowarczuk M, Gawrońska J. Kultura amfor kulistych w przemianach późnego neolitu i wczesnej epoki brązu w północno-wschodniej Polsce. W: Stankiewicz U, Wawrusiewicz A, redaktorzy. *Na rubieży kultur. Badania nad okresem neolitu i wczesną epoką brązu*. Białystok: Instytucja kultury wojwodstwa Podlaskiego; 2011. s. 109–120.

## References

1. Isayenko VF, Cherniavsky MM. [New data on the controversial issues of the Bronze Age of Belarus]. In: Buďko VD, editor. *Belorusskie drevnosti. Doklady k konferentsii po arkheologii Belorussii; yanvar' – fevral' 1966 g.; Minsk, BSSR* [Belarusian antiquities. Materials of the conference on the archaeology of Belarus; 1966 January – February; Minsk, BSSR]. Minsk: Academy of Science of BSSR; 1967. p. 155–187. Russian.

2. Zuyeva AU. The history of the investigation of the Globular Amphora Culture on the territory of Belarus at the end of 20th – the beginning of 21st century.*Vesnik BDU. Seryja 3. Gistoryja. Jekanomika. Prava*. 2009;2:3–7. Belarusian.

3. Tkachov O. [Preliminary results of archaeological research of the Stone Age and Bronze Age sites within the area of Białoweża Forest]. In: Stankiewicz U, Wawrusiewicz A, redaktorzy. *Na rubieży kultur. Badania nad okresem neolitu i wczesną epoką brązu*. Białystok: Instytucja kultury woj. Podlaskiego; 2011. s. 229–236. Belarusian.

4. Kaletchyc AG. *Chalavek i asjaroddze: kamenny vek, Zahodnjae Palesse* [The man and the environment: the Stone Age, the West Palessye]. Minsk: Belaruskaja navuka; 2018. 584 p. Belarusian.

5. Isayenka UF. [The Stone Age. The transition from the pre-society to the kinship relations]. In: Kastsiuk MP, editor. *Narysy gistoryi Belarusi. Chastka 1* [Essays on the history of Belarus. Part 1]. Minsk: Belarus; 1994. p. 9–29. Russian.

6. Clarke DL. *Analytical archaeology.* 2nd edition. London: Methuen & Co. Ltd; 1971. 684 p.

7. Klein LS. *Arkheologicheskaya tipologiya* [Archaeological typology]. Leningrad: Academy of Science of USSR; 1991. 448 p. Russian.

8. Kryvaltsevich MM. *Mogil'nik sjarjedziny III–II tys. da n. je. na Verhnim Dnjapry – Prorva-1* [Prorva-1 – a cemetery of the middle 3rd – early 2nd millennium BC on the Upper Dnieper]. Minsk: Institute of the History, National Academy of Science of Belarus; 2006. 202 p. Belarusian.

9. Brusov AJa. *Ocherki po istorii plemen evropeiskoi chasti SSSR v neoliticheskuyu epokhu* [Essays on the history of the tribes of the European part of the USSR in the Neolithic]. Moscow: Academy of the Science of USSR; 1952. 360 p. Russian.

10. Wiślański T. *Kultura amfor kulistych w Polsce północno-zachodniej*. Wrocław: Zakład Narodowy imienia Ossolińskich; 1966. 286 s.

11. Szmyt M. *Between West and East. People of the Globular Amphora Culture in Eastern Europe: 2960–2350 BC*. Poznan: Adam Mickiewicz University; 1999. 350 p. (Baltic-Pontic Studies; volume 8).

12. Isayenko VF. *Arkheologicheskaya karta Belorussii. Vypusk 1. Pamyatniki kamennogo veka* [Archaeological map of Belarus. Issue 1. The Stone Age sites]. Minsk: Polymja; 1968. 125 p. Russian.

13. Isayenko VF, Mitrofanov AG, Shtychov GV, editors. *Ocherki po arkheologii Belorussii. Chast' 1. Kamennyi i bronzovyi veka* [Essays on the archaeology of Belarus. Part 1. Stone Age and Bronze Age]. Minsk: Nauka i tekhnika; 1970. 271 p. Russian.

14. Isayenko VF. *Neolit Pripyatskogo Poles'ya* [The Neolithic on the Pripyat Polesye]. Minsk: Nauka i tekhnika; 1976. 128 p. Russian.

15. Isaenka UF. [Ethnocultural environment on the territory of the prehistoric Palessye]. In: Klimchuk FD, editor. *Zagaroddze-2. Matjeryjaly navukova-krajaznawchaj kanferjencyi; verasen' 1999 g.; Pinsk, Belarus* [Zagaroddze-2. Materials of the conference on the local history; 1999 September; Pinsk, Belarus]. Minsk: Tjehnalogija; 2000. p. 7–14. Belarusian.

16. Isayenko VF. *Arkheologicheskaya karta Belorussii. Vypusk 3. Pamyatniki bronzovogo veka* [Archaeological map of Belarus. Issue 3. The Bronze Age sites]. Minsk: Polymia; 1976. 150 p. Russian.

17. Isayenko VF. [Polesie in the prehistoric epoch]. In: Tolstoy NI, editor. *Poles'e i etnogenez slavyan. Predvaritel'nye materialy i tezisy konferentsii* [Polesie and the ethnogenesis of the Slavs. Preliminary materials and abstracts of the conference]. Moscow: Nauka; 1983. p. 16–17. Russian.

18. Isayenko VF. [The first Belarus farmers and pastoralists]. In: Shabunia KI, editor. *Iz istorii krest'yanstva Belorussii. Sbornik statei po materialam pervoi sessii respublikanskogo simpoziuma po istorii sel'skogo khozyaistva i krest'yanstva Belorussii; dekabr' 1975 g.; Minsk, BSSR* [From the history of the peasantry of Belarus. The collection of the papers of the first session of the republican symposium on the history of agriculture and the peasantry of Belarus; 1975 December; Minsk, BSSR]. Minsk: Nauka i tekhnika; 1978. p. 5–15. Russian.

19. Zagorulskij EM. *Drevnyaya istoriya Belorussii: ocherki etnicheskoi istorii i material'noi kul'tury (do IX v.)* [Ancient history of Belarus: essays on the ethnic history and material culture (before 9th century)]. Minsk: Belarusian State University; 1977. 134 p. Russian.

20. Isayenko VF. [The primitive cultures of Polesie]. In: Shtychov GV, editor. *Belorusskaya arkheologiya: dostizheniya arkheologov za gody sovetskoi vlasti* [Belarusian archaeology: the archievements of the archaeologists during the Soviet period]. Minsk: Nauka i tekhnika; 1987. p. 15–26. Russian.

21. Szmyt M. Eastern European Destinations of Central European cultural patterns. The case of the Globular Amphora Culture: end of the 4th – middle of the 3rd millennium BC. *Baltic-Pontic Studies.* 2009;14:232–251.

22. Makarowicz P. *Rola społeczności kultury iwieńskiej w genezie trzcinieckiego kręgu kulturowego (2000–1600 BC).* Poznań: Universytet imienia A. Mickiewicza; 1998. 454 s.

23. Tassi F, Vai S, Shirotto S, Lari M. Genome diversity in the Neolithic Globular Amphorae culture and the spread of Indo-European languages. *Proceedings of the Royal Society B*. 2017;284:20171540. DOI: 10.1098/rspb.2017.1540.

24. Szmyt M. Społeczności kultury amfor kulistych w Europie Wschodniej. W: Czebreszuk J, Kryvaltsevič M, Makarowicz P, redaktorzy. *Od neolityzacji do początków epoki brązu. Przemiany kulturowe w międzyrzeczu Odry i Dniepru między VI i II tys. przed Chr*. Poznań: Wydawnictwo Poznańskie; 2001. s. 167–193.

25. Kryvaltsevich MM. [Belarusian Palessye on the turn of Neolithic and Bronze Age: issues and prospects of archaeological research]. In: Kośko A, Kalečyc A, redaktorzy. *Wspólnota dziedzictwa kulturowegoziem Białorusii Polski*. Warszawa: Krajowy ośrodek badań i dokumentacji zabytków; 2004. s. 137–162. Belarusian.

26. Kryvaltsevich M. [New research results of the Late Neolithic – Early Bronze Age in West Palessye]. In: Stankiewicz U, Wawrusiewicz A, redaktorzy. *Na rubieży kultur. Badania nad okresem neolitu i wczesną epoką brązu*. Białystok: Instytucja kultury wojwodstwa Podlaskiego; 2011. s. 207–217. Belarusian.

27. Kryvaltsevich M, Isayenka U, Majsenia S. [The pottery of the «Corded» and «Trzciniec» horizons of the site Kamien-2 (Western Palessye)]. *Gistarychna-arhealagichny zbornik*. 2003;18:69–91. Belarusian.

28. Kryvaltsevich MM. [The «Corded Horizon» in Belarus: questions of identification and origins]. In: Czebreszuk J, Kryvaltsevič M, Makarowicz P, redaktorzy. *Od neolityzacji do początków epoki brązy. Przemiany kulturowe w międzyrzeczu Odry i Dniepru między VI i II tys. przed Chr*. Poznań: Wydawnictwo Poznańskie; 2001. s. 259–275. Belarusian.

29. Obuchowski W. *Zabytki krzemienne i kamienne od paleolitu do wczesnej epoki żelaza z terenów Białorusi w zbiorach Państwowego Museum Archeologicznego w Warszawie.* Warszawa: Wydawnictwo PMA; 2003. 208 s.

30. Abukhouski VS, Zuyeva AU, Sidarovich VM. [Quadrangular flint banded articles in the collection of the National Museum of History and Culture of Belarus]. *Acta Achaeologica Albaruthenica*. 2008;3:17–41. Belarusian.

31. Charniauski MM. [The Neolithic with Prick-Comband Prick Potteryin Western Belarus. Evolution characteristics]. W: Czebreszuk J, Kryvaltsevič M, Makarowicz P, redaktorzy. *Od neolityzacji do początków epoki brązy. Przemiany kulturowe w międzyrzeczu Odry i Dniepru między VI i II tys. przed Chr*. Poznań: Wydawnictwo Poznańskie; 2001. s. 231–240. Belarusian.

32. Wawrusewicz A. Taksonomiczne podstawy identyfikacji tradycji kultury pucharów lejkowatych w środowisku strefy leśnej Europy Wschodniej. Perspectywa subneolitu kontynentalnego. *Matjeryjaly pa arhealogii Belarusi*. 2010;18:131–146.

33. Kryvaltsevich M. Die Rolle der Kugelamphorenkultur bei der Entwicklung der Gesellschaften des oberen Dnjeprgebietes. In: Beran J, Einecke R, Schimpff V, Wagner K, Weber Th, editors. *Lehren – Sammeln – Publizieren*. Leipzig: Leipziger Universitetsverlag; 2016. S. 231–244.

34. Vaitovich AV. The role of the Globular Amphora Culture in the development of the Upper Neman communities. *Samarskii nauchnyi vestnik*. 2019;8(2):106–114. Russian.

35. Charniauski M, Vaitovich A. The Globular Amphora culture and its influences on the Belarusian Lakeland (according to the materials of the Kryvina peat bog). In: Szmyt M, editor. *Vir Bimaris. From Kujawy Cradle to Black Sea Steppes. Studies on the Prehistory of the Baltic-Pontic Between-the-Seas. In Recognition of Professor Aleksander Kośko*. Poznań: Adam Mickiewicz University; 2019. p. 609–620. Belarusian.

